Газета творчай інтэлігенцыі Беларусі

ЛіМ

ЛІТАРАТУРА І МАСТАЦТВА

ISSN 0024-4686

№ 19 (4514) 22 мая 2009 г.

У нумары:

Галасы сяброў

На І фестываль культур народаў ЕўрАзЭС у Беларусь завіталі госці з Расіі, Казахстана, Кыргызстана.

Стар. 2

Выдавецтва + «ЛіМ» = найлепшая рэклама!

Як данесці кнігу да зацікаўленага чытача? Дырэктар выдавецтва «Чатыры чвэрці» Ліліяна Анцух ведае гэта.

Стар. 4

Гумар — справа сур'ёзная...

Менавіта так сцвярджае галоўны рэдактар альманаха «Вожык» Юлія Зарэцкая і распавядае пра планы і перспектывы выдання.

Стар. 5

Дайце дваццаць пяты кадр!

Развагі крытыка пра прэм'еру мастацкага фільма «Кадэт» Нацыянальнай кінастудыі «Беларусьфільм».

Стар. 10

Крызіс. Горш за эканамічны

Як выратаваць нас ад дэградацыі і бездухоўнасці? Чаму вульгарнасць для некаторых стала нормай? Такія няпростыя пытанні ўздымае чытач «ЛіМа».

Стар. 13

ІДЗЕ ПАДПІСКА НА ІІ ПАЎГОДДЗЕ 2009 г.

Для індывідуальных падпісчыкаў: 1 месяц — 7760 руб. Падпісны індэкс — 63856

Ведамасная падпіска: 1 месяц — 10060 руб. Падпісны індэкс — 638562

Індывідуальная льготная падпіска для настаўнікаў: на 1 месяц — 5200 руб. Падпісны індэкс — 63815

Льготная падпіска для ўстаноў культуры і адукацыі: 1 месяц — 7870 руб. Падпісны індэкс — 63880

Каб год для вас быў неблагім — падпішыцеся на «ЛіМ»!

Паэт Міхась Башлакоў атрымаў Дзяржаўную прэмію Рэспублікі Беларусь у галіне літаратуры 2008 года за кнігі паэзіі "Нетры" і "Палын. Чарнобыль". Каб павіншаваць лаўрэата і пагутарыць з ім пра творчасць, да Міхася Захаравіча завітаў карэспандэнт "ЛіМа".



Карáлі з вершаў ладжу для Айчыны...

— *Спачатку дазвольце вас павіншаваць з гэтай сапраўды значнай падзеяй і пацікавіцца, як вы ўспрынялі навіну. Якія эмоцыі пераважаюць?*

— Вядома ж, вельмі рады. Хаця, шчыра кажучы, пакуль яшчэ не зусім асэнсаваў тое, што адбылося. Хацелася б выказаць падзяку ўсім, хто мяне падтрымаў і верыў у мяне. Я ўдзячны таксама мастаку Міхасю Барздыку, з якім мы разам рабілі гэтыя унікальныя ў пэўным сэнсе кнігі. Нагадаю, што "Нетры" ўвайшлі ў лік ста лепшых кніг свету. І не па якасці паліграфіі (гэтым Захад не здзівіш), а па ідэі, задуме, змесце. Кніга ж "Палын. Чарнобыль" была ўзнагароджана ў Бельгіі элітным залатым медалём. Яна зроблена ў форме праваслаўнага крыжа. Увогуле ў гэтай кнізе шмат сімвалаў. Пачынаючы ад вокладкі, усё прадумана літаральна да дробязяў. Хаця дробязяў у такіх выданнях не бывае. На першым форзацы карта Чарнобыля да выбуху, на другім — пасля. Мы падбіралі кожны радок, кожны графічны ліст. І тое, што кнігі нарэшце ўганараваны на дзяржаўным узроўні, вельмі цешыць. Гэта прэмія не асабіста мне, а — улічваючы, што некалькі гадоў па літаратуры Дзяржаўных прэмій не было ўвогуле, — гэта прэмія ўсёй беларускай паэзіі, літаратуры.

— *Вы расцэньваеце атрыманне Дзяржаўнай прэміі як годную ацэнку сваіх творчых набыткаў, як нейкі этап у творчым жыцці?*

— Відаць, так. Калі кнігі ацанілі за мяжой, то павінны былі адзначыць і ў сваёй краіне. Гэта пэўная прыступка. І ацэнка дзяржавы для мяне сапраўды вельмі важная. У мяне шмат планаў. Калі б толькі даў Бог іх ажыццявіць... Я не ўсім задаволены ў сваёй творчасці, і гэта не пазёрства. Мару стварыць вельмі вытанчаную, дзівосную кнігу лірыкі, на самай высокай ноце, і адчуваю, што магу яе зрабіць. Але ўсё не стае часу. Праўда, мне часта кажуць, што пара брацца за прозу. Асабліва пасля таго, як у кнізе "З росных сцяжын" з'явілася мая аўтабіяграфія. Як там у Пушкіна — "Года к презренной прозе клонят"? Магчыма, з цягам часу, але пакуль мне хочацца зрабіць кнігу лірыкі. Лепшая мая кніга — наперадзе. Кожны творца так лічыць. Хацелася, каб гэта было сапраўды так, каб Гасподзь пачуў мяне і даў мне здароўя, сілы і такую магчымасць.

— *Паэзія для вас — гэта прафесія ці нешта большае?*

— Не, гэта жыццё. Я пішу толькі тады, калі ў мяне ёсць вольны час. Я не пішу кожны дзень і лічу, што немагчыма так вось канвеерна ствараць вершы. Хаця можна іх пісаць, але ці будзе гэта паэзіяй? Адзін паэт сказаў неяк, што ўстае шчаніцы а пятай гадзіне і адразу сядае за стол. Я не пішу эпіграм, але калі пачуў гэта, нарадзіліся радкі:

Хай я ў паэзіі не першы,
З адказнасцю кладу радкі.
А многія складаюць вершы,
Нібы завязваюць шнуркі.

Я не хачу "завязваць шнуркі". Ці мала якія прыходзяць думкі, радкі?! Але калі адчуваю, што гэта будзе бледна, невыразна, не эмацыянальна, проста не пішу. Каму патрэбны такія вершы? Перш за ўсё, яны не патрэбны мне. Паэзія як жанчына — патрабуе поўнай самаадданасці. Для таго, каб напісаць сапраўдны верш, ты павінен усю энергію, якая ў цябе ёсць, выхліснуць на паперу. І ні на што іншае ўжо не застаецца сіл...

— *А здараецца так, што паэзія спусташае?*

— Здараецца. Такое было пасля маіх паездак па Чарнобыльскай зоне. Я зрабіў там каля дзвюх тысяч выступленняў, за што і расплаціўся сваім здароўем, але не шкадую аб тым, бо ў мяне не было б тады паэмы "Лілея на цёмнай вадзе". Многіх з тых вёсак, у якіх я выступаў, сёння ўжо, на жаль, не існуе. Ні дрэў, ні хат, толькі голае поле ды могілкі. Пасля таго, як напісалася гэтая паэма, гады два ўвогуле нічога не мог напісаць. Душа была як папялішча, выпаленая. Я настолькі быў спустошаны, што замест сэрца адчуваў кавалак скамянелага попелу.

Паэзія — гэта жыццё... А зрэшты, нават больш, чым жыццё. Гэта лёс. Я адразу бачу, калі ў паэта няма лёсу. Калі ёсць не паэзія, а імітацыя паэзіі. Гэта як фальшывыя брыльянты — на першы погляд, здаюцца сапраўднымі, а на самай справе — падробка. Так і ў паэзіі.

— *Вы шмат працуеце з маладымі паэтамі. Як вызначаеце, ці ёсць у чалавека сапраўдны паэтычны талент?*

— Дастаткова прачытаць адзін радок, і ўсё становіцца зразумелым. Цяпер у літаратуру часам ідуць маладыя людзі, якія літаратуры, і ў тым ліку, паэзіі, не ведаюць. Я не быў такі — у студэнцкія гады выдатна ведаў беларускую паэзію, рускую, польскую, украінскую, заходнееўрапейскую. І ўсім маладым кажу: калі вы не будзеце ведаць лепшае з сусветнай паэзіі, вы не будзеце пісаць добра, вы не станеце паэтамі. Паэзія — гэта вельмі адказная справа. Таму ў пытаннях літаратуры бываю бескампрамісным. Інтанацыя — багіня паэзіі. А без інтанацыі вершы сухія. Іх нецікава чытаць. Няма музыкі, няма душы. Зараз вось працую над кнігай "Маладая паэзія Беларусі". Чаму падтрымліваю менавіта маладых? Таму што мой шлях у літаратуру не вельмі лёгкі. Мне добра вядома, што такое недрукаванне і замоўчванне. Уявіце: калі Максім Лужанін прачытаў кнігу "Пяро зязюлі падніму", ён патэлефанаваў мне і сказаў: "Міхась Захаравіч, я чытаю вашу кніжку і здзіўляюся — чаму мне раней не сустракаліся вашы вершы? Я чытаю вашу паэму і захлынаюся ад энергетыкі, ад болю, які там закладзены". А болю там сапраўды многа, я не пішу, калі мне не баліць.

— *Вы можаце адной фразай сфармуляваць сваё паэтычнае крэда?*

— Я ўжо казаў, што паэзія — гэта жыццё... А зрэшты, нават больш, чым жыццё. Гэта лёс. Я адразу бачу, калі ў паэта за радком няма адчування лёсу. Калі ёсць не паэзія, а імітацыя паэзіі. Гэта як фальшывыя брыльянты — на першы погляд, здаюцца сапраўднымі, а на самай справе — падробка. Так і ў паэзіі. У чалавека могуць быць неблагія вершы, ён можа выдаваць кнігі, атрымліваць прэміі, але калі няма лёсу, няма сапраўднай паэзіі...

— *Вы казалі, што для таго, каб вызначыць таленавіты чалавек ці не, вам дастаткова прачытаць адзін радок. А ў вашай паэзіі ёсць галоўныя радкі?*

— Відаць, мае галоўныя радкі пра Айчыну і пра маці. І, калі вы не супраць, я прачытаю некалькі строф з новага верша:

Гарыць на сонцы залатое лісце...
А мне зіхіць маленства
успамінам:
Для маці ладзіў пацеркі калісьці,
Нізаў на нітку ягады рабіны.
...
Даўным-даўно дні тыя прамінулі...
Ах, мілыя маленства успаміны...
Як некалі для любае матулі
Нізаў на нітку ягады рабіны,
Каралі з вершаў ладжу
для Айчыны.

Гутарыла
Жанна КАПУСТА

Фота Кастуся Дробава

Пункцірам

● З 11 мая па 21 чэрвеня ў відэакомплексе "Цэнтр-відэа" пройдзе рэтраспектыва фільмаў японскага рэжысёра Такешы Кітана. Мінскі глядач зможа ўбачыць меладраму "Сцэны каля мора" (1991), камедыю "Зняў каго-небудзь" (1995), крымінальную драму "Феерверк" (1997), "Кікуджыра" (1999), баявік "Затоічы" (2003), "Такешыз" (2006). Рэтраспектыва Кітана павінна пакласці пачатак праекта "Адкрыты фармат", мэта якога заключаецца ў знаёмстве гледача з аўтарскім і якасным кіно.

● Выстава слуцкіх паясоў застанецца ў нашай краіне яшчэ на адзін год. Пра гэта паведаміў дырэктар Нацыянальнага мастацкага музея Беларусі Уладзімір Пракапцоў. Адпаведнае пагадненне падпісана гэтай установай з Міністэрствам культуры Расіі і маскоўскім Дзяржаўным гістарычным музеем. У мінулым годзе ў Мінск былі прывезены восем слуцкіх паясоў і два іх фрагменты. Усяго ў Дзяржаўным гістарычным музеі ў Маскве знаходзіцца больш як 60 слуцкіх паясоў.

● На 24 мая прызначаны прыезд у Беларусь нашчадкаў роду Радзівілаў. Нашу краіну наведаюць княгіня Эльжбета Радзівіл-Тамашэўская, дачка апошняга нясвіжскага ардынатара Антонія Альбрэхта. Прыедуць таксама Мікалай і Мацвей Радзівілы з сем'ямі. Тытулаваная сям'я плануе правесці ў Беларусі чатыры дні, за якія збіраецца наведаць Нясвіж, Мір і адзін дзень прысвяціць знаёмству з беларускай сталіцай.

● 9 мая ў былым фашысцкім канцэнтрацыйным лагеры Штутгоф (Германія) адкрыта мемарыяльная дошка ў памяць аб 1002 ураджэнцах Беларусі, вязнях лагера. Дошка зроблена ў межах праграмы па ўвекавечванні памяці абаронцаў Радзімы і ахвяр вайны пры ўдзеле Міністэрства абароны і Міністэрства замежных спраў Беларусі. Падчас другой сусветнай вайны ў Штутгоф высылалі былых членаў Камуністычнай партыі Заходняй Беларусі, Сялянска-Работніцкай Грамады, Таварыства беларускай школы. Пазбегнуць смерці ў лагеры змаглі нямногія, сярод іх быў і пісьменнік Аляксей Карпюк.

● Свет пабачыла кніга Юрыя Гарбінскага "Беларускі рэлігійны друк на Захадзе". Гэта сумеснае выданне нью-йоркскага Беларускага інстытута навукі і мастацтва, кафедры Беларускай філалогіі факультэта прыкладной лінгвістыкі і ўсходнеславянскіх філалогій Варшаўскага універсітэта ды Інстытута славістыкі Польскай. Аўтар у сваёй кнізе разглядае асаблівасці развіцця перыядычнага друку беларусаў на Захадзе, тэматыку і перыядычнасць выданняў, іх тэхнічныя асаблівасці, наклады, кошты, спосабы распаўсюджвання.

● Да 31 мая ў мінскім Палацы мастацтва працуе выстава чэшскіх фатографаў "Адзін дзень у Чэшскай Рэспубліцы". У экспазіцыі прадстаўлены гарады, сёлы, помнікі гэтай славянскай краіны, фотапартрэты яе жыхароў. Выстава пабывала ўжо ў ЗША, Японіі, Украіне, Аўстраліі, Германіі, Ізраілі, у шэрагу афрыканскіх краін. Да нас яе прывезлі дзякуючы супрацоўніцтву Пасольства Чэхіі ў Беларусі з Беларускім саюзам мастакоў.

● Пасол Ізраіля ў Беларусі Эдуард Шапіра паведаміў, што ў кастрычніку 2009 года Мінск наведаюць яўрэйскія піяністы з сусветным імем Гіль Гамбург і Сіван Сільвер. Яны выступяць у Белдзяржфілармоніі. А ў рамках сёлетняга "Славянскага базару" ў Віцебску пройдзе Дзень дзяржавы Ізраіль, у якім прыме ўдзел каля 100 музыкантаў. Таксама пасол адзначыў, што з 26 па 29 мая ў мінскім кінатэатры "Цэнтральны" адбудуцца Дні ізраільскага дакументальнага і мастацкага кіно.

Падрыхтаваў Павел РАДЫНА

Галасы сяброў

Компас

Яшчэ адно майскае свята, якое, напэўна, стане традыцыйным — фестываль культур народаў ЕўрАзЭС. Сёлета ён ладкаваўся ўпершыню і меў статус Першага.

Нягледзячы на тое, што сцэнай для цырымоніі адкрыцця і закрыцця гэтага казачна-маляўнічага дзейства стаў Палац Рэспублікі, галоўная і характэрная рыса форуму творцаў — яго ўсеабдымнасць. Прадстаўнікі дзяржаў-удзельніц Еўразійскай эканамічнай супольнасці — Рэспублікі Беларусь, Расійскай Федэрацыі, Рэспублікі Казахстан і Кыргызскай Рэспублікі наведалі не толькі нашу сталіцу, а і парадавалі сваім майстэрствам Магілёўскую, Віцебскую і Гродзенскую вобласці.

Захапляльныя, эмацыянальна насычаныя, узбагачаныя нацыянальным каларытам краін — нашых суседак, шчырыя ў сваіх пачуццях канцэрты ладкаваліся на розных сцэнах: у канцэртнай зале Гродзенскага дзяржаўнага музычнага каледжа, у Асіповіцкім раённым Доме культуры і Полацкім гарадскім Палацы культуры. Гасцям апладзіравалі, сустракаючы добрую вестку, з якою ехалі да нас творцы розных краін. На самай зразумелай мове міждзяржаўных зносін — мове мастацтва ў майскія дні гаварылі найлепшыя парламентарыі: вядомыя калектывы Расіі, Казахстана, Кыргызстана, індывідуальныя выканаўцы, заслужаныя дзеячы культуры і мастацтва чатырох краін, а таксама маладыя і адораныя артысты, лаўрэаты прэстыжных конкурсаў і фестываляў.

Багата было унікальных народных музычных інструментаў, непаўторных спеваў, зычлівых усмешак. Карагоды народных танцаў змяняліся тэатралізаванымі пастаноўкамі, што ўвасаблялі старажытныя легенды і паданні.

Беларусь, са свайго боку, азнаёміла гасцей з дасягненнямі нашай краіны, яе гісторыяй і культурай. Для іх гасцінна расчынілі дзверы Нацыянальная бібліятэка Беларусі, музей Вялікай Айчыннай вайны, Нацыянальны мастацкі музей, Беларускі дзяржаўны музей народнай архітэктуры і быту, Нацыянальны Полацкі гісторыка-культурны музей-запаведнік ды інш.

Статус фестываль займеў досыць высокі. У якасці ганаровых гасцей на форуме прысутнічалі прадстаўнікі Сакратарыята інтэграцыйнага камітэта ЕўрАзЭС: намеснік Генеральнага сакратара ЕўрАзЭС Яўген Ворсін, кіраўнік Дэпартамента развіцця сацыяльна-гуманітарнай сферы Ібод Хабібулаевіч Рахімаў, намеснік кіраўніка Дэпартамента развіцця сацыяльна-гуманітарнай сферы Аляксандр Рудзік, кансультант Зарэма Джыенбаева.

Ганаровымі гасцямі Расійскай Федэрацыі сталі намеснік губернатара Смаленскай вобласці Вольга Окунева; начальнік дэпартамента Смаленскай вобласці па культуры Вольга Чарнова. Кіраўнік расійскай дэлегацыі — дырэктар Смаленскага абласнога цэнтра народнай творчасці Ада Бабурава.

Ганаровыя госці з Казахстана — народная артыстка Рэспублікі Казахстан Гаухар Мурзабекава і кіраўнік дэлегацыі — віцэ-міністр культуры і інфармацыі Аскар Бурыбаеў.

Кіраўніком дэлегацыі Кыргызстана абралі выдатніка культуры Казахскай Рэспублікі, кіраўніка народнага ўзорнага харэаграфічнага ансамбля «Шаттык» Нацыянальнага цэнтра дзяцей і юнацтва Эрыка Латыпава.

Цяпер над стварэннем фільма пра фестываль культур народаў ЕўрАзЭС працуе Рэспубліканскае вытворча-творчае прадпрыемства «Беларускі відэацэнтр».

Ярына РЫТАМІНСКАЯ

На здымку: удзельнікаў фестывалю культур народаў ЕўрАзЭС вітае міністр культуры Рэспублікі Беларусь Уладзімір Матвейчук.

Фота Кастуся Дробава

Армія і творцы

Супрацоўніцтва

На гэты раз у Доме афіцэраў было людна. Падводзіліся вынікі гадавой працы і далейшай карэкціроўкі перспектыўных планаў Ваенна-шэфскай камісіі работнікаў культуры і мастацтва над асабовым складам Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь. Быў прадэманстраваны дакументальны фільм пра сучасную беларускую армію, зроблены журналістамі ВаенТБ. Ад узброеных сіл з дакладамі выступілі міністр абароны Рэспублікі Беларусь генерал-палкоўнік Леанід Мальцаў, начальнік галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы Міністэрства абароны Беларусі генерал-маёр Аляксандр Гура і начальнік упраўлення інфармацыі галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы Міністэрства абароны палкоўнік Уладзімір Макараў.

Беларускія пісьменнікі праз літаратурна-мастацкую студыю ваенных пісьменнікаў (існуе пры Доме афіцэраў пад кіраўніцтвам Яўгена Каршукова) таксама прымаюць актыўны ўдзел у многіх мерапрыемствах, пра што распавялі ў сваіх выступленнях Аляксей Дудараў, Алесь Савіцкі і Міхась Пазнякоў.

Выйшла два нумары літаратурна-мастацкага дадатку да часопіса "Армия" Міністэрства абароны Беларусі "Армия и культура", у якой друкуюцца лепшыя творы патрыятычнай тэматыкі. Пяць гадоў плённа працуе Драматычны тэатр беларускай арміі, дзесяткі тысяч гледачоў, у тым ліку ва ўсіх абласных цэнтрах і ўсіх гарнізонах змаглі паглядзець спекталі тэатра.

Усю працу ваенна-шэфскай камісіі можна ўмоўна падзяліць на некалькі вялікіх блокаў: 1) сацыякультурная дзейнасць, якая складаецца з грамадзянскіх і культурных акцый, мастацкіх выставак, паказу спектакляў, тэлевізійных і міжнародных фестываляў салдацкай і патрыятычнай песні, творчых конкурсаў і паказаў мастацкіх фільмаў; 2) творчыя выезды і сустрэчы майстроў мастацтва з асабовым складам Узброеных Сіл непасрэдна ў ваенных гарнізонах; 3) інфармацыйна-прапагандысцкая работа — гэта конкурсы летапісаў воінскіх часцей і злучэнняў, ваенна-спартыўныя гульні "Зарніца" і "Арлёнак", урокі мужнасці ва ўстановах адукацыі, агляды-конкурсы музеяў баявой славы ды іншыя мерапрыемствы; 4) ваенна-гістарычныя і навукова-практычныя канферэнцыі; 5) стварэнне мастацкіх твораў літаратуры і мастацтва, кінафільмаў ваенна-патрыятычнай тэматыкі.

Пералічаныя напрамкі відавочна сведчаць, што творчымі і прафесійнымі саюзамі, грамадскімі арганізацыямі і аб'яднаннямі, саюзамі ветэранаў і самімі ўзброенымі сіламі праводзіцца вялікая работа па збліжэнні грамадзянскага насельніцтва і армейскіх падраздзяленняў.

Анатоль КУДЛАСЕВІЧ

На здымку: выступае міністр абароны Беларусі Леанід Мальцаў.

Так трымаць!

Шматгадовая творчая дружба звязвае Саюз пісьменнікаў Беларусі з пагранічнікамі нашай краіны. Нарадзілася яна ў даваенны савецкі час: выдадзена нямала твораў прозы і паэзіі, у якіх ярка і таленавіта распавядаецца пра адказную службу і мужнасць тых, хто пільна ахоўвае дзяржаўную граніцу. Патрыятычнае слова літаратараў гучала амаль на кожнай пагранзаставе.

Шмат зроблена беларускімі пісьменнікамі па асвятленні жыцця пагранічнікаў і ў нашы дні. На старонках часопіса "Нёман", штотыднёвіка "Літаратура і мастацтва" ды іншых выданняў пастаянна з'яўляюцца матэрыялы на тэму гэтай плённай ваенна-шэфскай работы. І невыпадкова нядаўна група пісьменнікаў — Яўген Каршукоў, Міхась Пазнякоў і Рыгор Сакалоўскі загадам старшыні Дзяржаўнага пагранічнага Камітэта Рэспублікі Беларусь былі ўзнагароджаны медалямі "90 год на варце граніцы".

У той жа ўрачысты дзень у вялікай зале культурнай установы Пагранкамітэта Яўген Каршукоў і Міхась Пазнякоў сустрэліся з курсантамі Ваеннай акадэміі — будучымі афіцэрамі пагранвойск. Сустрэча прайшла цікава і змястоўна.

Яўген ІВАНОЎ

Сувязі

Косава ў сэрцы



На філалагічным факультэце БДУ адбылася неардынарная сустрэча — з епіскапам Рашска-Прызранскім і Косаўска-Метохійскім Арцеміем (Радасаўлевічам). Гэта высокаадукаваны царкоўны іерарх Сербскай Праваслаўнай Царквы і грамадскі дзеяч, доктар тэалогіі, аўтар значнага шэрага багаслоўскіх прац і кніг, адрасаваных шырокаму колу чытачоў — «З Хрыстом па жыцці» (2005), «З Косавам у сэрцы» (2007, 2008), «Практычны Закон Божы» (2007, 2009).

Перад студэнтамі і выкладчыкамі епіскап Арцемій выступіў з дакладам пра цяперашняе становішча ў сербскім краі Косава і Метохія. У той неймаверна складанай сітуацыі, што склалася за апошняе дзесяцігоддзе, для сербскага насельніцтва краю фактычна няма аніякага апірышча, акрамя Праваслаўнай Царквы. А пры ўсім гэтым катастрафічны стан сербаў, карэннага насельніцтва Косава і Метохіі, для СМІ большасці краін свету з'яўляецца "зонай замоўчвання". Епіскап Арцемій, які ў часы такой трагедыі акармляе Косаўскую епархію, прапанаваў слухачам-беларусам паглядзець на існуючае без шораў, асэнсаваць праблему Косава і Метохіі комплексна, у розных аспектах — геапалітычным, этнічным, культурна-гістарычным, духоўным, эканамічным, сацыяльным... Косава для сербаў — святая зямля, сербскі Іерусалім. Там на прасторы, дыяметрам у 100 кіламетраў, знаходзіцца больш як тысяча дзвесце найважнейшых святынь (дзейных манастыроў і храмаў, іх руін і царковішчаў, старажытных пагостаў). Дакладчык грунтоўна прааналізаваў агульнапрынятыя міжнародныя прававыя нормы і пагадненні, канкрэтна звязаныя са статусам Косава і Метохіяй, а таксама факты рэальнасці, якія не адпавядаюць дэкларацыям. Самі за сябе гавораць лічбы: за дзесяць гадоў разбурана і пашкоджана больш як 50 праваслаўных храмаў (у прыватнасці, за адны суткі пагрому 17—18 сакавіка 2004 года знішчана 34 праваслаўныя святыні), а збудавана не менш за 400 мячэцяў...

Дарэчы, епіскап Арцемій наведаў Беларусь ужо другі раз. У лютым 2003 года на багаслоўскім факультэце была наладжана выстаўка фатаграфій і дакументальных матэрыялаў "Распятае Косава", якую наведалі тысячы нашых суграмадзян. Таму зусім не як дзяжурна-пратакольныя гучалі з вуснаў сербскага госця словы ўдзячнасці беларусам. Справа ў тым, што грамадскасць нашай краіны ў 2008 годзе выступіла з ініцыятывай праекта «Белая Русь — Сястра Сербіі», мэта якога — дапамагчы ў аднаўленні хоць аднаго разбуранага храма. Цяпер на аднаўленне царквы святой Параскевы Пятніцы ў сяле Дрснік (Метохія) праводзіцца збор сродкаў.

Іван ЧАРОТА

На здымку: епіскап Рашска-Прызранскі і Косаўска-Метохійскі Арцемій.

Выстаўкі

Беларусь. Трыумф пераможцаў

З нагоды 65-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў і 65-гадовага юбілею заснавання Беларускага дзяржаўнага музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны, музей распачаў новы праект «Беларусь. Трыумф пераможцаў», які прадугледжвае тры тэматычныя выстаўкі: «Трафеі вайны», «Бітва за Беларусь» і «Шлях да перамогі».

Першая выстаўка цыкла «Трафеі вайны» адкрылася Папярэдадні Дня Перамогі. У фае музея сабраліся госці: школьнікі і суворацы, студэнты і журналісты. Перад гасцямі выступіў дырэктар музея Сяргей Азаронак, які перадаў слова ветэранам Вялікай Айчыннай вайны: удзельніку парада Перамогі Анатолю Галаўко, Герою Савецкага Саюза Віктару Лівенцаву і камандзіру спецыяльнага партызанскага атрада Анатолю Алейніку.

Тэматыка выстаўкі напрамую звязана з нараджэннем музея — адной з цікавейшых старонак нацыянальнай гісторыі 40-х гадоў XX стагоддзя. На той час гэта быў адзіны ў свеце музей падобнай тэматыкі, які адкрыўся яшчэ да заканчэння вайны. Адной з асаблівасцей музея з'яўляецца рарытэтны характар значнай часткі яго фондаў, якія склаліся ў ваенны перыяд і ў першае пасляваеннае дзесяцігоддзе.

У цэнтры экспазіцыі — выява гістарычнага партызанскага парада ў Мінску 16 ліпеня 1944 года (паводле карціны Яўгена Зайцава). Цікавы факт: усяго праз колькі дзён пасля парада, партызаны прыйшлі да будынка Дома Саюзаў, дзе планавалася першая музейная экспазіцыя і, адклаўшы аўтаматы, узяліся за будаўніцтва. Зброя партызанаў, іх асабістыя рэчы і багатыя партызанскія трафеі сталі першымі экспанатамі будучага музея.

Многія з прадстаўленых на выстаўцы экспанатаў аўтэнтычныя і належалі канкрэтным асобам.

На выстаўцы прадстаўлены звыш ста пяцідзесяці музейных прадметаў з розных калекцый. У «збройнай» частцы экспазіцыі можна ўбачыць трафейную зброю нямецкай, французскай, бельгійскай вытворчасці, якая выкарыстоўвалася партызанамі супраць акупантаў. Процівагазы, сапёрныя рэчы, узоры формы і абмундзіравання, прадметы быту і ўзнагароды, нагрудныя знакі і нашыўкі, якія выдаваліся нямецкім салдатам за ўдзел у тых ці іншых баях.

Антон КУДЛАТЫ

На здымках: падчас экскурсіі; экспанаты выставы.

З-пад пяра

Прайшло пасяджэнне секцыі перакладу і літаратурных сувязей Саюза пісьменнікаў Беларусі (старшыня — І. Чарота, сакратар — І. Качаткова).

Разгледжана досыць шырокае кола пытанняў: наяўнасць патрэбных перакладаў і магчымасцей іх друкаваць, узровень перакладазнаўства, актыўнасць міжлітаратурных кантактаў і іх перспектывы.

Даволі грунтоўна абмяркоўваліся праблемы пашырэння кантактаў з замежнымі пісьменніцкімі арганізацыямі, умацавання аўтарытэту беларускай літаратуры ў свеце.

Ні ў кога не выклікала пярэчанняў тое, што перакладам варта надаваць больш увагі ў перыядычным друку, што трэба імкнуцца аднавіць серыю "Скарбы сусветнай літаратуры", а таксама запачаткаваныя ў 1980 гады серыйныя выданні "Бібліятэка замежнай прозы", "Бібліятэка замежнай паэзіі", "Кніга перакладчыка". Натуральна, улічваліся складанасці крызіснай сітуацыі апошняга часу. Пры гэтых умовах, відавочна, прыярытэтнымі становяцца выданні анталогій і панарамных зборнікаў, мэта якіх — стварыць як мага больш дакладнае ўяўленне пра літаратурныя працэсы і ў замежных краінах, і ў нашай Беларусі.

А. І.

Больш як дзесяць гадоў пры Старадарожскай раённай бібліятэцы існуе клуб самадзейных паэтаў "Арэскія вытокі". Клуб узначальвае маладая журналістка мясцовай раённай газеты "Навіны Старадарожчыны" Нэлі Астрэйка.

Нядаўна адбылося чарговае пасяджэнне літклуба па тэме "Мая зямля — мая старонка". Мясцовыя аўтары, сярод якіх былі пенсіянеры, былы воін-інтэрнацыяналіст Аркадзь Пенязь (піша ў асноўным на афганскую тэматыку, выдаў тры зборнікі ўспамінаў у вершах і прозе), Валянціна Грабінава і іншыя, чыталі свае вершы. Адметна, што на пасяджэнні клуба знаёмілі прысутных са сваімі творамі члены аматарскага літаратурнага аб'яднання школьнікаў "Першацвет", якое існуе ўжо 11 гадоў пры раённай дзіцячай бібліятэцы. Туды наведваюцца каля 20 вучняў I — II класаў.

Гэта мерапрыемства было арганізавана ў рамках духоўна-асветніцкай праграмы "Сям'я — яднанне і любоў", якая праводзілася Мінскім абласным і Старадарожскім раённым выканаўчымі камітэтамі, Беларускай праваслаўнай царквой і Беларускім экзархатам.

Анатоль БАРЫС

У сувязі з некаторай рэарганізацыяй у рэдакцыйна-выдавецкай установе "Літаратура і Мастацтва", функцыі часопіса "Всемирная литература" будзе выконваць часопіс "Нёман".

Адпаведна, змяніліся і тэлефонныя нумары. Да ведама чытачоў і аўтараў:

Тэлефоны рэдакцыі часопіса "Нёман":
галоўнага рэдактара — 284-85-25;
намесніка галоўнага рэдактара — 284-80-91;
аддзелаў прозы, паэзіі, крытыкі і публіцыстыкі — 284-80-91.

Тэлефоны рэдакцыі часопіса "Маладосць:
галоўнага рэдактара — 284-85-24;
намесніка галоўнага рэдактара — 284-41-88;
аддзелаў прозы, паэзіі, крытыкі і публіцыстыкі — 288-20-72.

Тэлефоны рэдакцыі часопіса "Полымя":
галоўнага рэдактара — 284-80-12;
намесніка галоўнага рэдактара — 284-80-12;
аддзелаў прозы, паэзіі, навукі, крытыкі і літаратуразнаўства — 288-22-37.

Імпрэзы

Класік літоўскай літаратуры

У "Доме дружбы" адбылася літаратурна-мастацкая імпрэза, прысвечаная 100-годдзю з дня нараджэння Пятраса Цвіркі, класіка літоўскай літаратуры.

Пятрас Цвірка кароткае, але надзвычай плённае жыццё. За свае 38 гадоў ён паспеў апублікаваць шэраг зборнікаў прозы і паэзіі, дзе выявіў сябе як вытанчаны стыліст і майстра сюжэта.

Вядучыя вечарыны падрабязна распавялі пра жыццёвы і творчы шлях пісьменніка. Студэнты БДПУ імя М. Танка, якія вывучаюць літоўскую мову, прачыталі некалькі вершаў Пятраса Цвіркі на мове арыгінала. Кіраўнік літоўскага цэнтра культуры і інфармацыі Віргінія Тарнаўскайтэ акрэсліла месца творчасці пісьменніка ў сучаснай літоўскай культуры. Пісьменнік і выдавец Кастусь Цвірка распавёў пра сваё бачанне постаці юбіляра як апявальніка вясковага жыцця Літвы, пачынальніка вясковай прозы. Паэт Васіль Жуковіч прачытаў вершы, прысвечаныя літоўскай зямлі, а таксама прыгадаў моманты працы над перакладам твораў Пятраса Цвіркі на беларускую мову. Літаратурную імпрэзу аздобілі музычныя нумары ў выкананні навучэнцаў гімназіі № 15.

Ціхан ЧАРНЯКЕВІЧ

У рэдкім жанры

Абрысы

І смех, і слёзы — побач... Так можна ахарактарызаваць сольную праграму майстра мастацкага слова Зінаіды Феакціставай, што прайшла ў Малой зале Беларускай дзяржаўнай філармоніі пад назваю "З любоўю да роднай зямлі".

Цяжка ўявіць, як у амаль паўтарагадзіннай праграме артыстка здолела ахапіць той спектр тэм, што ўрэшце і вызначаюць нашую рэчаіснасць дый жыццё наогул: вайна, Чарнобыль, вечныя маты вы кахання, дабра і зла... Такі ж шырокі акцёрскі дыяпазон выканаўцы: Зінаіда Феакціставa і спявала, і танчыла, выклікаючы ў гледачоў то смех, то слёзы... Трыццацігадовы прафесійны досвед знанай артысткі спрыяў яе кантакту з публікай. А эмацыянальны фон выступлення ўзмацняла музычная аздоба кожнага нумара — у праграме ўдзельнічала піяністка Алена Лузан, дыпламант розных міжнародных конкурсаў.

Зінаіда Феакціставa — адна з нямногіх айчынных артыстаў, хто сёння працуе ў жанры паэтычнага слова, сатыры і гумару. Яна шмат гадоў супрацоўнічала з вялікімі калектывамі краіны і замежнымі выканаўцамі. Добра вядомая дзіцячай і юнацкай аўдыторыі. Аснову яе рэпертуару складаюць творы класікаў літаратуры Янкі Купалы, Якуба Коласа, М. Багдановіча, А. Міцкевіча, сучасных беларускіх паэтаў А. Грачанікава, Е. Лось, Я. Янішчыц, Н. Гілевіча, А. Вярцінскага, П. Панчанкі і іншых. Таксама ў творчай скарбонцы артысткі мініяцюры вядомых на ўсёй постсавецкай прасторы эстрадных аўтараў М. Задорнава, А. Трушкіна, М. Мішына... Артыстка пастаянна абнаўляе свой рэпертуар, супрацоўнічае з аўтарамі-пачаткоўцамі, з маладымі акцёрамі і рэжысёрамі. Відаць, таму яе выступленні заўсёды праходзяць на адным подыху.

Настасся БАРДЗІЯН

З прэзентацыяй — у Мар'іну Горку

Рэестр

Сярод мерапрыемстваў, якія праводзіць аддзел маркетынгу і рэкламнай дзейнасці РВУ "Літаратура і Мастацтва" па прапагандзе кніг, выпускаемых выдавецкай установай, з'яўляецца і арганізацыя іх прэзентацыйных выстаў. Нядаўна падобнае мерапрыемства па ініцыятыве яе дырэктара Алы Ралькевіч адбылося ў Мар'інагорскай гімназіі.

На сустрэчу з вучнямі малодшых класаў прыехалі Валерый Кастручын і Анатоль Зэкаў. Першы прэзентаваў сваю кнігу аповедаў пра жывёл "Чудесные острова", другі — азбуку-маляванку ў рыбацкіх скорагаворках "Мянтуз сярод мядуз". Падчас размовы з юнымі чытачамі аўтары распавядалі пра свой творчы шлях, пра тое, як нараджаліся іх творы, заклікалі хлапчукоў і дзяўчынак любіць прыроду. І, безумоўна, адказвалі на шматлікія пытанні.

Бібліятэка гімназіі набыла многія кнігі выдавецтва, а юныя чытачы атрымалі іх з аўтографамі аўтараў.

Анатоль ПАТАПАЎ

Пачалася падпіска на II паўгоддзе

«Літаратура і мастацтва»
Індывідуальная (індэкс — 63856)
на 1 месяц — 7760
на 3 месяцы — 23280
Індывідуальная льготная падпіска для настаўнікаў (індэкс — 63815)
на 1 месяц — 5200
на 6 месяцаў — 31200
Ведамасная (індэкс — 638562)
на 1 месяц — 10060
на 3 месяцы — 30180
Льготная ведамасная (індэкс — 63880)
на 1 месяц — 7870
на 6 месяцаў — 47220

«Маладосць»
Індывідуальная (індэкс — 74957)
на 1 месяц — 7760
на 3 месяцы — 23280
Індывідуальная льготная падпіска для настаўнікаў (індэкс — 00592)
на 1 месяц — 5540
на 6 месяцаў — 33240
Ведамасная (індэкс — 749572)
на 1 месяц — 10430
на 3 месяцы — 31290
Льготная ведамасная (індэкс — 00731)
на 1 месяц — 8290
на 6 месяцаў — 49740

«Полымя»
Індывідуальная (індэкс — 74985)
на 1 месяц — 8000
на 3 месяцы — 24000
Індывідуальная льготная падпіска для настаўнікаў (індэкс — 00471)
на 1 месяц — 5540
на 6 месяцаў — 33240
Ведамасная (індэкс — 749852)
на 1 месяц — 10670
на 3 месяцы — 32010
Льготная ведамасная (індэкс — 00727)
на 1 месяц — 8710
на 6 месяцаў — 52260

Альманах «Вожык»
Індывідуальная (індэкс — 74844)
на 6 месяцаў — 8400
Ведамасная (індэкс — 748442)
на 6 месяцаў — 10000

«Нёман»
Індывідуальная (індэкс — 74968)
на 1 месяц — 8480
на 3 месяцы — 25440
Індывідуальная льготная падпіска для настаўнікаў (індэкс — 00235)
на 1 месяц — 6010
на 6 месяцаў — 36060
Ведамасная (індэкс — 749682)
на 1 месяц — 11820
на 3 месяцы — 35460
Льготная ведамасная (індэкс — 00728)
на 1 месяц — 8710
на 6 месяцаў — 52260

Сёння вельмі прэстыжна ведаць не толькі творчасць класікаў, але і сучасных беларускіх пісьменнікаў, адкрываць для сябе новыя імёны з плеяды маладых аўтараў.

Выдавецтва "Чатыры чвэрці" было створана ў 1992 годзе з цвёрдым намерам яго стваральнікаў выпускаць нотна-музычную літаратуру, якой тады, як дарэчы і цяпер, не хапала. Таму і назва ўстановы мае дачыненне да музыкі. Але практычна з першых гадоў існавання сфера выдавецкіх інтарэсаў значна пашырылася — распрацоўваліся праекты па нацыянальнай і духоўнай культуры, навуцы, адукацыі. Аднак і сёння "Чатыры чвэрці" — адзіная ў Рэспубліцы Беларусь выдавецкая структура, якая мэтанакіравана падтрымлівае развіццё нацыянальнай музычнай культуры.

Дырэктар выдавецтва "Чатыры чвэрці" Ліліяна Анцух — сённяшні госць «ЛіМа».

Выдавецтва + «ЛіМ» = найлепшая рэклама!

— Ліліяна Фёдараўна, якія прыярытэты ў выдавецтва "Чатыры чвэрці"?

— Першапачаткова прыярытэты аддаваліся вызначаным тэмам: нацыянальная і духоўная культура, навука, адукацыя. Цяпер мы бачым, што ўсе нашы здабыткі вельмі запатрабаваны. Яны добра ўпісваюцца ў сферу турызму, які, як вядома, базуецца на гісторыка-нацыянальных каштоўнасцях. І ўнутраны, і ўязны турызм — усё гэта нам стала цікава.

— Якія з вашых кніг маюць найбольшую папулярнасць?

— Кнігі, прысвечаныя згаданым тэмам. А з улікам таго, што аўтары кніг — удзельнікі нашага рэдакцыйна-выдавецкага працэсу, людзі вядомыя, то вакол выдавецтва за гэты час сфарміраваўся выдатны аўтарскі склад, склад мастакоў, фатографаў. Людзей, неабыякавых да таго, што адбываецца ў культурнай прасторы краіны, да зберажэння нацыянальнай спадчыны.

— Вы выпускаеце кнігі на роднай мове?

— Так. У нас і прыярытэты скіраваны ў бок роднай мовы. Але, калі мы разумеем, што трэба пашыраць геаграфічныя межы таго або іншага выдання, то абавязкова выкарыстоўваем і другую нашу дзяржаўную мову — рускую. Таксама дабаўляем у знакавыя выданні англійскую, французскую, нямецкую, бо сёння нельга быць зачыненымі ад навакольнай прасторы.

— Ліліяна Фёдараўна, з якімі цяжкасцямі сутыкаецца на сённяшні дзень выдавец?

— Казаць, што выдавец сёння або ўчора сутыкнуўся з праблемамі або сутыкнецца з імі заўтра, мусіць, не мае сэнсу, калі гаворка ідзе аб стварэнні кнігі, заклікаанай асвятляць пытанні культуры, навукі, адукацыі. Цяжкасці былі, ёсць і будуць. І калі хтосьці цяпер кажа, што з-за сусветнага эканамічнага крызісу адбыліся незваротныя змены, то мы так казаць не можам, таму што цяжка было заўсёды. Раней праблемы былі адны, сёння яны іншыя. З эканамічным крызісам трэба проста навучыцца жыць. Мы робім кнігу, яна ідзе да нашага спажыўца — у бібліятэчную сістэму. І на сённяшні дзень ім практычна не паступіла ні адной капейкі фінансавання. Як гэта на нас адбіваецца? Зразумела, мы працуем не на таго спажыўца, які выпадкова забягае ў краму, мы працуем, як нам здаецца, на вечнасць. Наша кніга вартая таго, каб быць у бібліятэках. Бібліятэка не можа яе аплаціць, значыць, у нейкай ступені і мы прастойваем. У нас не так хутка рэалізуюцца нашы наступныя выдавецкія праекты, але, тым не менш, працэс гэта не спыняе.

Мяне вельмі цешыць, што сёння з усіх канцоў нашай краіны, з глыбінкі, да нас пацягнуліся духоўныя і культурныя нітачкі ад людзей, якія не з'яўляюцца прафесійнымі паэтамі і празаікамі, але якія мараць, каб іх творчасць легла на паперу, убачыла больш прасторы, чым плошча іх уласнага пісьмовага стала. І мы выдаём шмат кніг аўтараў, якія спрабуюць нават за кошт сваіх уласных сродкаў публікавацца, таму што душа рвецца і жадае выказацца. Мы робім рэдакцыйна-выдавецкую апрацоўку. І сярод наведвальнікаў, нашых аўтараў часам знаходзім выдатных творцаў.

Класічны прыклад, які адбыўся з аўтарам з Полацка. Гэта сёння ўсім вядомая Надзея Салодкая, з якой некалькі гадоў таму мы ўпершыню пачалі працаваць — выдалі зборнік, потым яшчэ адзін і яшчэ. Яна расла з кожным зборнікам, і разам з ёй і мы разумелі, што з нашым сціплым удзелам адбываецца яе прафесійны рост.

Глядзіце: сёння яна — сябра Саюза пісьменнікаў Беларусі, на вершы Надзеі Салодкай напісана вядомымі кампазітарамі шмат добрых песень, што выконваюцца на ўрачыстых канцэртах вядомымі беларускімі спевакамі. Надзея Салодкая атрымала высокае званне ганаровага грамадзяніна горада Полацка, узнагарожана прэміяй У. Караткевіча. Яна — вядомы чалавек у краіне.

Вось такія лёсы, якія пераплятаюцца з лёсам выдавецтва, мы ў іх урастаем і гэта ўзмацняе нашы сілы. І няўжо можна гэты творчы палёт параўнаць з такой празаічнай з'явай, як эканамічны крызіс. Гэта непараўнальна. Бо ўсё пераадольваецца, і я ўпэўнена, што добрая будучыня ў нашай культуры, літаратуры, а значыць, і ў нашага выдавецтва.

— А наогул, як адчуваеце сябе на беларускім рынку?

— Што такое беларускі рынак? Я для сябе называю гэта — культурная прастора. А рынак кшталту "купіў-прадаў" я не прызнаю ў выдавецкай справе. Ну, не бізнесмен выдавецтва "Чатыры чвэрці". Іншая справа, вядома, каб жыць, мы павінны быць запатрабаваныя і ў той жа краме, і нас, канечне, павінны ведаць. Я сказала б, што за гэтыя гады сфарміравалася добрая сетка, добрыя каналы. Нас ведаюць кнігагандлёвыя прадпрыемствы і буйнейшыя крамы. Напрыклад, мы вельмі камфортна адчуваем сябе ў краме «Акадэмкніга», дзе выдатны дырэктар. Мы робім там прэзентацыі сваіх кніг. Прэзентацыі — гэта вельмі вялікая дапамога ў папулярызацыі, дзе мы набываем і новых сяброў выдавецтва, і новых спажыўцоў нашых кніг.

З іншага боку, выдавецтва "Чатыры чвэрці" адзінае ў Беларусі, якое спрабуе нешта рабіць у музычнай культуры, і кнігі гэтыя не прыбытковыя. Але дадзеныя кнігі шукае чытач.

Усё гэта не дае нам знікнуць, растварыцца праз усе гады. Не адна з нашых кніг не можа несці на сабе пячатку камерцыйнай. Як бы нам не казалі, што сёння любая кніга павінна задумвацца як камерцыйны праект, я ў гэта не веру і не згаджаюся. І любому магу давесці: нельга думаць пра камерцыю, калі ты хочаш быць удзельнікам соцыуму ў культурна-духоўнай прасторы. Можа, камусьці гэта падасца дзіўным, але менавіта такія некамерцыйныя праекты і дапамагаюць трымацца нам на плыву.

— Што можаце сказаць пра канкурэнцыю з расійскімі выдавецтвамі?

— Мы з імі не канкуруем. Мы першапачаткова трымалі сябе тут, у нашай нацыянальнай прасторы, і проста з часам пашыралі межы. Доўга варыцца ва ўласным соку нельга. І ў нас з'явілася цікавасць да знешняга свету, а там з'явілася цікавасць да нас.

Раней як было: выходзіла кніга, годная таго, каб пра яе даведалася Міністэрства замежных спраў, і, выязджаючы за мяжу, яго супрацоўнікі бралі адну з нашых кніг. Я наведала шмат краін, і мне было вельмі прыемна, калі ў Швецыі ўбачыла ў адной з арганізацый, з якой я не мела ніякіх сувязяў, сваю кнігу. А першая кніга выдавалася яшчэ калі выдавецтва працавала сумесна з Беларускім фондам дапамогі развіццю культуры. Кніга называлася "Мінск" і выйшла ў выглядзе буклета на беларускай мове, але да яго быў дадатак на 5 мовах.

На адной з апошніх выстаў наш менеджэр мела вялікую гутарку з прадстаўнікамі выдавецтва "Савецкі пісьменнік", мы цяпер думаем, як бы мы маглі быць савыдаўцамі. Бо не ўпускаем ніводнага шансу, каб знайсці кантакт з расійскімі прадстаўнікамі.

— Ліліяна Фёдараўна, ці патрэбна рэклама вашым кнігам?

— Адмысловай рэкламай мы не займаемся. Вось такога роду інтэрв'ю — гэта выдатная ініцыятыва газеты. І самае галоўнае, што ў грамадстве ёсць рэакцыя на яе публікацыі. Так у "ЛіМе" друкавалася рэцэнзія на кнігу Стасі Наркевіч "Настальгія", што выпусціла наша выдавецтва. Вынік даволі нечаканы — кніга ўключана ў праграму вышэйшай школы ў Віцебску. Вось гэта — рэклама вышэйшага пілатажу — і з боку аўтара, і з боку газеты.

— Раскажыце, калі ласка, пра новыя выдавецкія праекты...

— Выдавецкіх праектаў вялікае мноства. Але адзін, я не назаву яго новым, бо ён працягваецца ўжо другі дзесятак гадоў, — серыя пад назвай "Нашы духоўныя каштоўнасці" — нам вельмі дарагі. У серыі, блаславёнай Мітрапалітам Філарэтам, ужо выйшла пяць кніг-альбомаў. Сёлета, спадзяюся, нам дапамогуць Бог і людзі, і мы завершым працу над шостым выпускам — "Праваслаўныя святыя зямлі Беларускай". Я веру ў гэта, малюся аб гэтым, напрацоўкі ж вяліся амаль 3 гады. А 2009 год вызначаецца тым, што 25 год таму пачалася кананізацыя новамучанікаў — людзей, пацярпелых за веру. Яны амаль нашы сучаснікі, і мы павінны распавесці пра іх як мага болей сённяшняму пакаленню. Праца вялікая і адказная. Над ёй працавалі гісторыкі, святары, іканапісцы, мастацтвазнаўцы. Гэта арыгінальны аўтарскі праект выдавецтва. Я спадзяюся, што ён выйдзе да 75-годдзя Уладыкі Мітрапаліта Філарэта. І вось гэта ўсё разам дае нам добрае натхненне.

Яшчэ адзін цікавы выдавецкі праект нарадзіўся нядаўна. Нінэль Шчасная, Надзея Салодкая і Навум Гальпяровіч — дзеючыя асобы праекта. Надзея Салодкая пераклала на рускую мову кнігу Навума Гальпяровіча "Голас і рэха", і назвала яе "Эхо слушает голос", творы Нінэль Шчаснай аздобілі выданне. І вось гэтыя тры ганаровыя грамадзяне Полацка, а таксама мэр горада Полацка будуць прэзентаваць кнігу.

Думаю, што сёння для нас няма ніводнай белай плямы сярод значных з'яў і падзей у культуры, і, прымаючы актыўны ўдзел у многіх з іх, мы імкнёмся аб'яднаць іх у сацыякультурнай прасторы і ствараць сваё арыгінальнае выдавецтва.

Гутарыла
Ілона КУПРЭЙЧЫК

У "ЛіМе" друкавалася рэцэнзія на кнігу Стасі Наркевіч "Настальгія", што выпусціла наша выдавецтва. Вынік даволі нечаканы — кніга ўключана ў праграму вышэйшай школы ў Віцебску. Вось гэта — рэклама вышэйшага пілатажу — і з боку аўтара, і з боку газеты.

Мастацкая культура Віцебшчыны

Нашы выдавецтвы з кожным годам выпускаюць усё больш кніг па культурна-мастацкай спадчыне. Але асабліва радуе, калі новае выданне прысвечана рэгіёну, дзе ты нарадзіўся, вырас, жывеш.

"Мастацкая культура Віцебшчыны: Паазер'е, Падзвінне, Верхняе Падняпроўе (у кантэксце ўсходне-славянскіх і заходне-еўрапейскіх культурных працэсаў)" — манаграфія пад такой назвай выйшла нядаўна ў выдавецтве Віцебскага дзяржаўнага універсітэта імя П. М. Машэрава. Яе аўтары — рэктар універсітэта, член Саюза пісьменнікаў Беларусі А. Русецкі і дырэктар ІПКіПК ВДУ Ю. Русецкі.

Кніга, як пазначана ў анатацыі, прысвечана практычна не даследаванай у Беларусі навуковай праблеме — комплекснаму вывучэнню нацыянальнай мастацкай культуры на рэгіянальным узроўні. Гэтае, без перабольшання, унікальнае выданне ўражвае і аб'ёмам — шырокафарматны фаліянт у 540 старонак з больш як 400-мі ілюстрацыямі.

У гэты аб'ём аўтары ўмясцілі гісторыю запачаткавання і развіцця мастацкай культуры паўночнага ўсходу Беларусі на працягу адзінаццаці тысячагоддзяў, пачынаючы з дахрысціянскіх часоў і да нашай эры. У даследаванні пераплятаюцца археалогія, этнаграфія, фальклор, гісторыя, архівістыка, літаратуразнаўства, бібліятэказнаўства і бібліяграфія, дазваляючы стварыць завершаную карціну мастацкага развіцця ў той ці іншы перыяд.

Манаграфія мае складаную структуру, у яе ўваходзяць 11 частак. Кніга дапоўнена слоўнікам асноўных тэрмінаў і спісам літаратуры, які ўключае амаль тысячу крыніц.

Першая частка — "Ля вытокаў мастацкай культуры" — экскурс у амаль дзесяцітысячны перыяд (ад мезаліта па жалезны век) зараджэння і фарміравання мастацкай культуры.

Другая частка прысвечана архітэктуры і горадабудаўніцтву. Віцебск, Орша, Полацк, Друя, Браслаў, Копысь, Лукомль — вось далёка не поўны спіс прадстаўленых гарадоў і пасяленняў.

Развіццю пісьменства, летапіснай справы, абрадаў, вуснапаэтычнай творчасці прысвечана 3-я частка манаграфіі.

Літаратурная творчасць і выдавецкая справа ў XVI—XVIII стст. — тэма 4-й часткі, у якой больш як 30 персаналій — ад Ф. Кміты-Чарнабыльскага і Ф. Скарыны да В. Ластоўскага, В. Стукаліча і А. Пшчолкі.

Пятая частка прысвечана развіццю рамёстваў і дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва ў X—XVI стст.

Творчасць больш як 20-ці мастакоў, такіх, як сусветна вядомыя М. Шагал, Ю. Пэн, так і забытыя М. Падалінскі і А. Лукашэвіч, разглядаецца ў 6-й частцы.

У 7-й — прадстаўлены даследаванні творчасці "выхадцаў з Прыдзвінскага краю — творцаў расійскай мастацкай культуры" — С. Заранкі, Л. Шапялевіча, С. Дудышкіна, М. Зарэмбы, В. Качалава і іншых, аўтары таксама ўспамінаюць расіян, якія пакінулі прыкметны след у развіцці мастацкай культуры Віцебшчыны: Д. Фанвізіна, А. Пушкіна, М. Лермантава, І. Буніна, І. Рэпіна...

У дзевятай частцы аналізуецца дзейнасць этнографаў і фалькларыстаў Л. Юцэвіча, П. Шпілеўскага, М. Нікіфароўскага, А. Сапунова, Д. Даўгялы і іншых.

Наступны раздзел прысвечаны развіццю на Віцебшчыне бібліятэчнай і выдавецкай справы, вядомым віцебскім бібліёграфам і бібліяфілам А. Багаткевічу, В. Сабалышчыкову, В. Федаровічу, а апошняя, адзінаццатая частка — мастацкай культуры ў дзейнасці езуіцкіх навучальных устаноў XVII — першай чвэрці XIX стст.

Манаграфія не з'яўляецца складнікам раней выдадзеных кніг гэтых аўтараў па гісторыі развіцця мастацкай культуры Віцебска, Аршанскай зямлі і Віцебскага Паазер'я (якія, дарэчы, карыстаюцца вялікай папулярнасцю ў чытачоў). Гэта, паводле аўтараў, працяг і далейшае развіццё ранейшай "спробы выкласці гісторыю (у спалучэнні з некаторымі пытаннямі тэорыі) мастацкага развіцця Віцебскай вобласці... ад старажытнасці да пачатку XX стагоддзя" з дабаўленнем новых, значных у мастацкіх адносінах рэгіёнаў.

Выданне адрасавана не толькі вучоным і выкладчыкам, кніга будзе цікавая студэнтам, настаўнікам, школьнікам, работнікам культуры — усім, хто цікавіцца гісторыяй развіцця мастацкай культуры Віцебшчыны і ўсёй Беларусі.

Ала МІЦКЕВІЧ

Гумар – справа сур'ёзная!..

Часопіс «Вожык». Хто яго не ведае? Пачынаўся ён са знакамітай газеты-плаката «Раздавім фашысцкую гадзіну» ў 1941 годзе. А пазней, пасля заканчэння Вялікай Айчыннай вайны, выданне стала знаёмым нам "Вожыкам". У 2009 годзе часопіс сатыры і гумару «Вожык» трансфармаваўся ў альманах. Наша сённяшняя гутарка з галоўным рэдактарам альманаха «Вожык» Юліяй Зарэцкай.

— Юлія Францаўна, як вы трапілі ў «Вожык»?

— Адказаць на гэтае пытанне можна дваяка. Выпадкова, бо менавіта ў часопіс «Вожык» я ніколі спецыяльна не імкнулася. Вядома, ведала гэтае «калючае» выданне, з задавальненнем чытала... Але першую сваю гумарэску даслала ў «Вожык» па пошце (хаця ўжо вучылася на 1-ым курсе філфака БДПУ імя М. Танка): аднесці асабіста ў рэдакцыю пасаромелася. І зноў жа выпадкова: яе прачытаў нехта з дзяўчат, з якімі вучылася ў адной групе, і настойліва параіў аддаць у «Вожык». Ці — заканамерна. Бо кажуць, што нічога выпадковага ў нашым жыцці няма.

— І як вас прыняў «Вожык»?

— Яго калючыя абдымкі насамрэч сталіся вельмі цёплымі. Мяне, маладую і нявопытную студэнтку, прыязна сустрэлі і галоўны рэдактар тагачаснага «Вожыка» Валянцін Болтач, і яго намеснік Генадзь Бураўкін, і супрацоўнікі аддзела фельетонаў Рыгор Яўсееў і Уладзімір Правасуд, і... І ўсе работнікі часопіса. У гэтым не мая — іх заслуга. Іх добры ўдзел, дапамога, іх навука, спагада дапамаглі мне «вырасці». Па запыце рэдакцыі была накіравана на працу ў часопіс «Вожык» і пачала яе з самага сур'ёзнага аддзела — аддзела фельетонаў і пісьмаў...

— Што вы як галоўны рэдактар плануеце памяняць, альбо дадаць, дапоўніць у «Вожыку»?

— Я з вялікай павагай адношуся да ўсіх галоўных рэдактараў часопіса, якія ўзначальвалі гэтае асаблівае выданне. М. Чавускі, К. Крапіва, У. Корбан, А. Раманаў, В. Болтач, М. Пазнякоў, А. Пісьмянкоў, У. Саламаха — усе яны ў свой час працавалі над стварэннем унікальнага выдання, над прафесійным узроўнем твораў, над актуальнасцю і адметнасцю «Вожыка». Адны з іх закладвалі традыцыі, другія — развівалі і працягвалі. І гэта заслугоўвае павагі. Закрэсліць старое лягчэй, чым напісаць новае. Такое новае, каб яно стала лепшае за старое. А суддзя ў гэтай справе адзін — час.

Іншая акалічнасць, што мяняецца жыццё. І на яго праявы трэба рэагаваць не так, як 20 ці 50 гадоў таму, а так, як у 2009 годзе, выходзячы з сягоннішніх рэалій. Так, усё зменліва. Але яшчэ кароль Францыі Людовік XIV заўважаў: «Пастаянства заключаецца не ў тым, каб рабіць заўсёды адно і тое ж, а ў тым, каб усе справы нашы садзейнічалі дасягненню адной мэты». Мэта ў «Вожыка» застаецца адна і нязменная — спецыфічнымі сродкамі сатыры і гумару змагацца з усімі негатыўнымі праявамі ў грамадска-палітычным жыцці краіны, усебакова садзейнічаць развіццю сатырыка-гумарыстычных жанраў беларускай літаратуры і выяўленчага мастацтва.

— Дык урэшце, як зменіцца «Вожык»?

— З II-га паўгоддзя 2009 года часопіс пачне выходзіць як альманах: два разы на год. Будзе захавана і назва, і фармат, і аб'ём (калі рэклама прапануе «два ў адным», дык у нас будзе «шэсць у адным» — усяго 96 старонак), і падпісныя індэксы.

На яго старонках можна будзе прачытаць гумарыстычныя і сатырычныя творы не толькі кароткіх жанраў (гумарэскі, пародыі, эпіграмы і інш.), але і больш буйныя публікацыі — апавяданні і аповесці. Больш увагі будзе надавацца беларускім святам гумару, тэатральным пастаноўкам і тэлевізійным праектам, якія маюць непасрэднае дачыненне да жанру сатыры і гумару. Мяркуецца друкаваць мастацкія карты рэгіёнаў з пазнакай адрасоў, звязаных з сатырычным фальклорам, бытаваннем сатырычных, гумарыстычных, жартоўных традыцый у пэўных паселішчах і г. д. Прадстаўляць гумар нашых блізкіх і далёкіх суседзяў; размяшчаць і карыкатуры, і панарамныя малюнкі, і займальныя коміксы...

У першым выпуску альманаха «Вожык» чытач пазнаёміцца з жартоўнай пародыяй на п'есу абсурду «Цягнік да Бразіліі» Генадзя Аўласенкі, гумарыстычнымі апавяданнямі Валянціна Крыжэвіча, вершаванымі пародыямі Васіля Жуковіча, прачытае інтэрв'ю з вядомым мастаком-карыкатурыстам Алегам Паповым, а таксама са знакамітым удзельнікам гумарыстычнага тэатра «Хрыстафор» Яўгенам Крыжаноўскім, даведаецца пра святы гумару ў Мінску, Аўцюках і Клецку, прачытае-прагледзіць дэтэктыўную аповесць-комікс Генадзя Ануфрыева і Аляксандра Каршакевіча пра прыгоды Шэрлака Холмса і Доктара Ватсана ў Мінску, пабывае ў сусветнай сталіцы гумару — Габрава і яшчэ шмат чаго вясёлага, смешнага і цікавага знойдзе ў гэтым нумары!..

— Як плануеце заахвочваць ды пашыраць кола аўтараў альманаха?

— Я спадзяюся, ды ў рэшце рэшт, перакананая ў тым, што нашы пастаянныя аўтары — і вядомыя пісьменнікі, паэты, і непрафесійныя гумарысты ды мастакі-карыкатурысты застануцца з «Вожыкам». У нас жа шмат аўтараў друкуюцца, як кажуць, спрадвеку. «Вожык» — гэта іх роднае. Як, напрыклад, можа расстацца з «Вожыкам» знакаміты мастак Сяргей Волкаў, бацька якога ўсё жыццё аддаў «Вожыку» і стварыў там сваю вожыкаўскую школу карыкатуры, і які сам пачаў друкавацца ў часопісе яшчэ са школьных гадоў і падтрымлівае творчыя сувязі дагэтуль? Ці вядомыя мастакі-карыкатурысты М. Гіргель, А. Папоў, П. Козіч, А. Гурскі, В. Дударэнка, А. Гуцол, В. Пузанкевіч?.. А каб пералічыць усю «пішучую брацію», і газетнай паласы не хопіць! Як жа яны без «Вожыка», а ён — без іх? Толькі разам!

А колькі ж маладых аўтараў — як у галіне літаратуры, так і ў вобласці карыкатуры! Мы падтрымлівалі і падтрымліваем іх бо гэта — наша будучыня.

— На вашу думку, чаму сярод нашых творцаў няма, так бы мовіць, «чыстых» гумарыстаў?

— Гэтае пытанне я чую ўвесь час. А чаму ў нас паэты так шмат пішуць пра каханне? Бо гэта блізкае, перажытае... (Але ж і смяёмся мы штодзень і, відаць, куды часцей, чым пачуваемся ўлюбёнымі.) Проста? Зразумела?..

Рызыкну дапусціць меркаванне, што гумар больш складаная катэгорыя, чым пачуццёвае каханне. Тым больш цяпер, калі з тэлеэкранаў, некаторых газет ды часопісаў на нас шквалам навальваецца нізкапробны гумар, бульваршчына.

Як вядома, паспрыяць чалавеку засмяяцца — значна цяжэй, чым заплакаць. Да таго ж існуе прадузятасць, што гумар — гэта несур'ёзна. Глупства! Маўляў, навошта сур'ёзнаму паэту разменьвацца на «ха-ха» — яму пра высокія пачуцці, пра вечнае пісаць трэба. Ці — хіба сур'ёзны мастак будзе займацца карыкатурай? Карыкатура — гэта так, калякі-маляк.

Дарэчы, летась наш былы галоўны мастак-карыкатурыст Алег Гуцол наведаў міжнароднае біенале карыкатуры ў Тэгеране. Мерапрыемства праводзілася пад эгідай Іранскага дома карыкатуры, Міністэрства культуры, музея сучаснага выяўленчага мастацтва, а спансіравалі яго буйнейшыя банкі Ірана. Адзін гэты факт сведчыць пра тое, *якое* значэнне адводзіцца карыкатуры. Для іранцаў гэта такі ж сур'ёзны від мастацтва, як скульптура, жывапіс ці кніжная графіка. І гэта — мусульманскі свет...

А на самай справе мне здаецца, што аніякім «высокім» мастацкім творам ніколі так не паспрыяеш выхаванню, не звернеш увагу, не навучыш, як байкай, фельетонам ці карыкатурай!

Між тым, усе нашы класікі любілі гумар: і Якуб Колас (пачытайце хаця б успаміны яго сына Міхася Канстанцінавіча, што друкаваліся ў часопісе «Вожык»), і А. Куляшоў, і М. Танк, і М. Лынькоў... Нездарма ў вожыкаўскай пастаяннай рубрыцы «Класікі смяюцца» так багата ўзгадана імён і — гумару!..

Гутарыў Віктар КАВАЛЁЎ

P. S. Нагадаем, што адкрыта падпіска на другую палову 2009 года на альманах «Вожык». (Чытачы таксама змогуць набыць нумар і ў розніцу, але падпісацца — больш надзейна і зручна.) Індэкс індывідуальнай падпіскі — 74844, цана — 8400 рублёў, індэкс ведамаснай падпіскі — 748442, цана — 10000 рублёў.

Едуць і паломнікі, і рыцары

Для таго, каб даведацца, што адбываецца ў культурным жыцці горада і раёна, мы завіталі ў раённы аддзел культуры. Выконваючая абавязкі начальніка аддзела культуры Мсціслаўскага райвыканкама Алена Асіпенка ў гутарцы зазначыла: у раёне існуе дваццаць сельскіх бібліятэк. "А як з падпіскай? — адразу зацікавіўся карэспандэнт "ЛіМа", — Якія перыядычныя выданні атрымліваюць бібліятэкі?".

— У нас вельмі шмат падпісных выданняў. Калі браць аграгарадок, то тут бібліятэка выпісвае ў сярэднім трыццаць шэсць найменняў газет і часопісаў — раённыя, абласныя і рэспубліканскія выданні. Значна менш расійскіх выданняў, а тыя што ёсць, у асноўным ідуць на цэнтральную бібліятэку, таму што выпісваюцца яны не з бюджэтных сродкаў, а з тых, якія зарабляем самі, або знаходзім спонсараў на аплату падпіскі. Усяго ў Мсціслаўскім раёне дваццаць сем тысяч жыхароў, адзінаццаць жыве ў горадзе, а шаснаццаць у сельскай мясцовасці.

— Ці існуюць у раёне своеасаблівыя аазісы культуры — як гэта звычайна адбываецца, людзі гуртуюцца вакол раённай газеты, або ў Доме культуры, ці каля нейкай выбітной асобы?

— Ёсць такія аазісы. Напрыклад, пры раённым цэнтры культуры народнай творчасці існуе літаратурнае аб'яднанне "Крынічка". Там збіраюцца і дарослыя, і дзеці. Не так даўно сваімі сіламі яны нават выдалі калектыўны зборнік. Гэта прыкметная падзея для нас.

— Сельская мясцовасць заўсёды вылучаецца мастацкай самадзейнасцю. Цікава, колькі калектываў мастацкай самадзейнасці існуе ў горадзе і ў раёне?

— Ведаеце, даволі шмат. У адным раённым цэнтры культуры, які я ўзгадвала — трыццаць. А ўсяго па раёне — гэта больш за дзвесце розных калектываў мастацкай самадзейнасці. Сюды ўваходзяць розныя аб'яднанні, гурткі па інтарэсах, клубы аматараў жывапісу, літаратуры, фальклорныя калектывы.

— Скажыце, з якімі праблемамі сутыкаецца раённы аддзел культуры? Што больш за ўсё замінае ў рабоце?

— У мінулым годзе былі выдзелены вялікія сродкі для рамонту нашых устаноў культуры, болей як мільярд рублёў для раённага цэнтра культуры. Гэтыя сродкі трэба было асвоіць, а гэта вялікія аб'ёмы работ. Напрыклад, паўгода таму, а менавіта 27 верасня ў нас адкрыўся будынак Раённага цэнтра рамёстваў. Цяпер у нас ёсць свой будынак, у якім маюцца дзве выставачныя залы. Арганізоўваем і праводзім выстаўкі.

— Якімі людзьмі знакаміта Мсціслаўская зямля?

— Калі пачынаць са старажытнасці, то гэта нашы князі. Два чалавекі з роду князёў Мсціслаўскіх далучаны Праваслаўнай царквой да ліку святых — заснавальнік Мсціслава князь Расціслаў Мсціслававіч і Анастасія Слуцкая, якая нарадзілася тут, яна была дачкой нашага князя. Па-другое, гэта — Пятро Мсціславец, адзін з першадрукароў і асветнікаў, яму ў нашым горадзе ёсць ажно два помнікі. У свой час у нашай гімназіі вучыўся будучы паэт Аркадзь Куляшоў. Тут бацькаўшчына Максіма Гарэцкага, вёска Малая Багацькаўка. У нас цудоўны гісторыка-археалагічны музей, абавязкова наведайце, не пашкадуеце. А яшчэ Мсціслаўская зямля дала вельмі шмат Герояў Савецкага Саюза і Герояў Сацыялістычнай Працы.

— Вы так і не адказалі на пытанне: з якімі праблемамі прыходзіцца сутыкацца?

— Асноўная праблема — гэта выкананне плана платных паслуг. Гэта наш асноўны клопат. Але ў гэтым ёсць і станоўчы бок. Калі мы робім платную паслугу, то можам самастойна папаўняць сваю матэрыяльна-тэхнічную базу. Гэта яшчэ і дадатковая крыніца фінансавання. Для наладжвання дабрабыту ў аграгарадках таксама выдзяляюцца сродкі.

— Аграгарадкоў у вашым раёне шмат?

— Усіх восем: Мішні, Разанцы, Мазурава, Андраны, Капачы, Засценавічы, Мушына і Забалацце.

— Хацелася б пачуць пра каляндарныя святы, звязаныя з рэлігійнымі датамі ці з цыклам сельскагаспадарчых. Праводзяцца, скажам, дажынкі, дакоскі, свята першай баразны, Каляды?

— Так, безумоўна. Штогод у верасні праводзіцца "Свята горада", у рамках якога праходзіць фестываль мастацтваў. Трэці год праводзяцца раённыя агляды калектываў мастацкай самадзейнасці. У мінулым годзе была акцыя "Мы — беларусы", а ў гэтым годзе раённы агляд быў прысвечаны 65-годдзю Перамогі. У гэтым годзе святкавалі юбілей Аркадзя Куляшова, у раённай бібліятэцы прайшла вечарына, прысвечаная творчасці Куляшова. Два гады запар праводзім рыцарскі фэст сярэднявечнай культуры. З усёй рэспублікі з'ехаліся рыцары, а гэта каля сарака розных клубаў. Было вельмі прыгожае мерапрыемства.

— Чым Мсціслаўская зямля можа пахваліцца перад усёй Беларуссю?

— Не памылюся, калі скажу, што, напэўна, гэта будзе наш Пустынскі манастыр. Мы яго аднаўляем. Вельмі шмат паломнікаў едзе і з Беларусі, і з Расіі, і з Украіны. Гэта наш асаблівы гонар.

Гутарыў Анатоль КУДЛАСЕВІЧ

Акцэнты

Апошнім часам нярэдкасць з'яўленне твораў, у якіх пісьменнікі звяртаюцца да сваіх дзіцячых гадоў, — асэнсоўваюць, апісваюць, параўноўваюць, з настальгіяй і без, але галоўнае — заўсёды сур'ёзна і ўдумліва. Што яны там хочуць знайсці? Адказы на пытанне пра сваё творчае пакліканне, як Андрэй Федарэнка? Крыніцу жыццёвых каштоўнасцяў, як Навум Цыпіс? А можа, адчуванне сэнсоўнасці, нямарнасці жыцця, як Уладзімір Васіленка ў аповесці "Улица До свидания", што друкавалася ў лютаўскім нумары "Нёмана"?

Нямарнасць жыцця

Аповесць уяўляе сабой два паралельныя, няроўназначныя пласты: хаатычныя згадкі дзяцінства і паслядоўна разгорнутая гісторыя вяртання старой хворай маці да нармальнага ладу жыцця. Нягледзячы на тое, што знешне чаргаванне гэтых плыняў ніяк не матывуецца і выглядае выпадковым, усё ж нейкая няўлоўная сувязь паміж імі адчуваецца.

Прываблівае ў аповесці найперш сапраўднасць, роўная жыццёвай праўдзе. Герою цяжка і непрыемна выцягваць з напаўадэкватнага стану маці, яго раздражняюць яе нежаданне лячыцца, яе старэчая капрызлівасць, яе, нарэшце, бездапаможнасць і рэгулярныя правалы ў памяці. Як супрацьлегласць гэтаму, цяжкаму і цёмнаму, — светлыя ўспаміны дзяцінства, у якіх пануюць іронія і гумар, што выяўляецца ў самым пачатку, у першых радках: *"Я — детище советского автомобилестроения (индустриальная Украина и ГАЗ отжалели нашему автозаводу молодых специалистов Георгия и Липу, и через год появился я). Бабушка зовет меня проще: "убоище"*. Усе знаёмыя і асабліва сваякі падаюцца маленькаму Радзівону нейкімі камічнымі персанажамі, якія сапраўды нібыта існуюць толькі для таго, каб яго пацяшаць сваімі недарэчнымі ўчынкамі. А вось калі камічным персанажам становіцца ён сам, тады пацяшаецца ўжо аўтар, хаця ўвогуле ягонага голасу амаль няма ў аповесці. Магчыма, вяртаючыся ўспамінамі ў дзяцінства, галоўны герой пазбаўляецца такім чынам ад негатыўнай энергіі, каб захоўваць духоўную раўнавагу, — вось гэта і ёсць тая самая няўлоўная сувязь, якой змацоўваюцца розныя сюжэтныя пласты. Ва ўспамінах — маці, хаця і не вельмі маладая, аднак здаровая і поўная энергіі. Маленькі хлопчык жыве ў сваім уласным свеце, не звяртае ўвагу ні на што, акрамя сваіх уласных перажыванняў і эмоцый: першае жаданне спадабацца дзяўчыне, першыя адзнакі ўнутранага сталення — і тут жа, побач, бессэнсоўнае дзіцячае глузаванне. Вачыма дзіцяці, які канцэнтруецца толькі на самім сабе, цяжка перадаць атмасферу часу. Дзеля гэтага часцей выкарыстоўваюцца адасобленыя аўтарскія каментарыі. Аднак Уладзімір Васіленка выбраў іншую мадэль: ролю аўтарскіх каментарыяў выконвае адчуванне, перажыванне героем свайго наваколля. Радзівон не ўдзельнічае ў жыцці дарослых, яно ўвогуле нібыта не датычыць яго і не абцяжарвае, герой проста нешта заўважае, прабягаючы міма па сваіх вельмі "важных" справах, аднак менавіта гэтага і дастаткова для таго, каб чытач адчуў, што герой жыве ў канкрэтным часе з яго канкрэтнымі адзнакамі. Зрэшты, наўрад ці аўтар ставіў сабе такую задачу. Галоўнае ў яго ўсё ж у псіхалагічным двубоі паміж згадкамі дзяцінства і не вельмі прыемным заняткам.

Аднак, пастаянна знаходзячыся побач са старым хворым чалавекам, герой сам пачынае — раптоўна, нечакана — адчуваць сябе старым, і тут раскрываецца нарэшце глыбокі сэнс згадак дзяцінства — у той далёкі час герою здавалася, што яго жыццё непадуладна часу, што ён існуе незалежна, свабодна і што ён — уладар свайго жыцця, менавіта таму лёгка перажываліся крыўды і не лічыліся сур'ёзнымі нараканні сваякоў. І вось у дарослым свеце герой вымушаны жыць у іншай сістэме каардынат, па іншых правілах, зазвычаеных настолькі, што яны ўспрымаюцца як натуральныя і адзіна магчымыя: *"Жизнь сводится к простым вещам: за чем-то встать, что-то достать, принести. Так же и самые большие желания, самые заветные мечты — при ближайшем рассмотрении словно тают на глазах: в конце концов, оказывается, мы хотим не власти, богатства, бессмертия, а — удобно лечь, ощутить во рту некий тонкий вкус, головой дотянуться до чьей-то руки"*. Уладзімір Васіленка сцвярджае, што дзіцячыя гады пры ўсёй сваёй наіўнасці трэба шанаваць у памяці не толькі як згадку, але як рэальнасць, якая перажываецца, нават працягвае развівацца самастойна і незалежна. Захаваць дзяцінства як *рэальнасць* — значыць, мець магчымасць зрэдчасу туды вяртацца і разумець, што ў жыцці кожнага чалавека быў час свабоды і вечнасці. У. Васіленка стварае свет дзяцінства не павучальна, не *дзеля* нечага, а як самакаштоўную прастору свабоды, прастору, у якой няма абмежавання і забарон, — можа быць, менавіта таму няма і аўтарскага ўмяшання (каментарыяў, адступленняў) у дзейнасць хлопчыка-падлетка Радзівона.

Аднак адрас гэтага свету, адрас сюжэтаў для ўспамінаў — вуліца "До свидания". Герой нібыта праходзіць па ёй, зазіраючы ва ўсе дамы і кватэры перад развітаннем. Ён мусіць развітацца з рэальнасцю дзяцінства і нагадвае яму пра гэта найперш хворая маці, якая знаходзіцца на парозе свайго жыццёвага развітання.

Аповесць чытаецца лёгка, праўда, раз-пораз затрымліваючы ўдумлівага чытача на некаторых старонках. Аўтар увасабляе два жыццёвыя полюсы "дзяцінства — старасць" і на гэтай адлегласці, даўжыня якой для кожнага з нас вызначаецца Некім "індывідуальна", расстаўляе акцэнты. Гэта не скрушлівае адчуванне незваротнасці — гэта мастацкае перажыванне сэнсоўнасці, нямарнасці жыцця.

Жанна КАПУСТА

З адзнакай шчырасці

Чытачу, які цікавіцца навінкамі літаратуры, прадстаўляем новую — дзевятую — кнігу пісьменніка Барыса Бележэнкі "Сны и дороги", якая выйшла ў Віцебску.

Барыс Бележэнка прыйшоў да апавяданняў "Сны и дороги" з вялікім жаданнем расказаць пра сябе, пра свой час — адкрыта, шчыра, эмацыянальна і палка, пазбаўляючыся ад усяго, што асколкам болю і пытаннем "Чаму?" засела ў яго душы і памяці. Нездарма ў прадмове да кнігі ён кажа, што "одно желание навсегда поселилось в сердце моем: люди должны жить счастливо. А пока многоликое Несчастье слепо бродит по Земле, приходится писать о горе".

У аснову апавяданняў пакладзены рэальныя падзеі. Шасцігадовым хлапчуком ён перажыў вайну, выгнанне ў Германію маці, якая стала вязнем канцлагеру Штутгоф і Равенсбрук. Пасля вайны жыў у глыбінцы, дзе аднаўленне разбуранай вайной гаспадаркі было асабліва цяжкім. Шчыры аповед пісьменніка пра той час — гэта каштоўны падарунак чытачу, бо толькі так можна пазнаць праўду жыцця.

Тэматычна творы дзеляцца на некалькі напрамкаў: вайна, пасляваенныя гады, сучасныя маральныя праблемы, а таксама імкненне зазірнуць у невядомы свет, расказваючы пра сны і звязваючы іх з рэальнымі падзеямі ў жыцці герояў.

Напярэдадні 65-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў кожны твор пра вайну ўспрымаецца як папярэджанне людзям добрай волі берагчы мір, родную зямлю, жыццё, таму апавяданне "Осколок" — не толькі аб мінулым.

Паказваючы шматаблічнае гора, аўтар звяртаецца і да светлых вобразаў, якія ён беражэ ў сваёй душы. Гэта жанчыны-працаўніцы: пасля работы, з рукадзеллем у руках, яны спяваюць песні, нягледзячы на ўсе турботы жыцця. Такой запамінаецца настаўніца Ганна, жонка Піліпа Дунаева, якая не кідае свайго мужа-бедака.

Наогул шчырасць аўтара, герояў яго твораў пра жыццё глыбінкі ў першыя пасляваенныя гады, пры ўсім сваім драматызме здольна выклікаць у сучаснага чытача пачуццё ўдзячнасці людзям, якія здолелі перажыць гора, падняць вёску, выгадаваць дзяцей і ўнукаў, стварыць маральны і матэрыяльны падмурак для наступных пакаленняў.

Асаблівасць творчасці Б. Бележэнкі — у заўсёдным звароце да прыроды. Любоў аўтара да кожнай жывой часцінкі прыроды, здольнасць пачуць голас кожнай кветачкі і сцяблінкі, уменне размаўляць з усім наваколлем, як з даўнім і добрым сябрам, робяць кнігі аўтара, яго творчы почырк пазнавальнымі.

Валянціна АЛЕЙНІКАВА,
рэферэнт Віцебскага абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі

Кніга пра землякоў

Аўтарам гэтай цікавай кнігі з'яўляецца былая настаўніца адной з Крычаўскіх агульнаадукацыйных школ. Адсюль яна родам, тут прайшла большая частка яе свядомага жыцця. Ларыса Ашуркова трапна назвала свой зборнік "Среди знакомых". Блізкім і дарагім людзям, сваім землякам, простым вяскоўцам і гараджанам, прысвяціла яна аповесць, апавяданні, гумарэскі, казкі і вершы, якія ўвайшлі ў зборнік.

Вядома, яна не прэтэндуе на маштабныя, дэталёва выпісаныя вобразы. Бо імкнецца асобнымі яркімі дэталямі вызначыць галоўныя рысы характараў сваіх бацькоў, братоў і сясцёр, аднакласнікаў, саслужыўцаў, вучняў і суседзяў. Усё гэта пададзена ў пераканаўчым гістарычным кантэксце. А пабачыла за сваё жыццё Ларыса Ашуркова багата розных падзей, многа зведала перажыванняў. Дастаткова сказаць, што яна дачка святара, толькі гэта акалічнасць зрабіла яе лёс незвычайным.

Шмат старонак кнігі прысвечана Вялікай Айчыннай вайне, на якую прыйшлося дзяцінства Ларысы Ашурковай. Страта блізкіх людзей, голад і нястачы, перажытыя падчас акупацыі, назаўсёды засталіся ў памяці пакаленняў, апаленых вайной, і вельмі важна, каб гэтая памяць не згубілася, захавалася назаўсёды. Асноўнай тэмай твораў пісьменніцы можна назваць высокую духоўнасць нашага народа, пошукі простым чалавекам шляхоў да ўнутранай чысціні і самаўдасканалення.

У зборніку — празаічныя творы як на рускай так і на беларускай мовах. І гэта ўспрымаецца чытачом як цалкам натуральная з'ява, таму што ўсходняя Магілёўшчына мяжуе з Расіяй і дзвюхмоўе здаўна існуе ў паўсядзённым жыцці людзей.

Уладзімір ДУКТАЎ

Кніжная паліца

У выдавецтве "Мастацкая літаратура" пры фінансавай падтрымцы Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь выйшла кніга **Міхася ПАЗНЯКОВА** *"Святое правіла..."* (вершы, пародыі, байкі, эпіграмы). Новую кніжку лаўрэата Літаратурнай прэміі імя Петруся Броўкі склалі вершы, напісаныя паэтам за апошнія пятнаццаць гадоў. У іх — роздум пра наш час, любоў да Радзімы, бацькоўскага краю. Асобнае месца ў зборніку займаюць вершы гумарыстычнай тэматыкі.

У выдавецтве "Народная кніга" выйшла ў свет кніга **Алы ЮШКАВЕЦ** *"Происхождение"*. Гэта дэтэктыўныя аповеды і аднайменная кінааповесць. У кніжцы чытач знойдзе разгадкі няпростых вострасюжэтных жыццёвых сітуацый, складаных узаемаадносін паміж людзьмі, абрынецца ў цёмны свет забойцаў і светлыя сны палюбоўнікаў.

У Мінску ў выдавецтве "Конфидо" выйшаў арыгінальны (кішэннага фармату) зборнік выбраных вершаў **Змітрака МАРОЗАВА** *"Малітоўнаю матчынай мовай"*. Гэта тонкая інтымная лірыка, шчымлівыя радкі пра родны край і дарагіх сэрцу людзей. Паэтычным творам папярэднічае пашыраная аўтарская біяграфія, напісаная ў жанры эсэ. Для шырокага кола прыхільнікаў краснага пісьменства.

У выдавецтве "Кнігазбор" выйшаў зборнік казак пісьменніка з Рагачова **Міхася СЛІВЫ** (Міхася Кавалёва) *"Кот Матрос"*. У кнізе змешчаны аўтарскія казкі беларускага літаратара, а таксама яго пераклады казак некаторых народаў свету.

У выдавецтве "Про Хрысто" выйшла кніга ксяндза прэлат доктара **Яна ГУРСКАГА** *"Сустрэча з рэлігіямі"*. Гэта цікавы і дасведчаны расповед пра розныя рэлігійныя вызнанні людзей у нашым свеце. Як піша аўтар: "Няхай уводзінамі да гэтай працы паслужаць словы св. Аўгустына: "Найперш заахвочваем вас, браты, да любові не толькі адных да другіх, але таксама да тых, хто застаецца не з намі, ці то паганаў, якія не прызнаюць яшчэ Хрыста, ці то адлучаных ад нас (...). Хочуць яны таго, ці не, яны з'яўляюцца нашымі братамі". Пераклад Хрысціны Лялько. Уступнае слова арцыбіскупа Тадэвуша Кандрусевіча, Мітрапаліта Мінскага і Магілёўскага.

У выдавецтве "Народная кніга" выйшаў зборнік **Алы ЮШКАВЕЦ** *"Братья меньшие (рассказы о животных)"*. Гэта своеасаблівыя кароткія апавяданні пра хатніх ды дзікіх жывёл і птушак, з якімі ў розных сітуацыях давялося сустракацца аўтару. Распавядаецца пра тых нашых "братоў меншых", якія загойваюць нашы душэўныя раны, вучаць нас любові, вернасці, адданасці, саграваюць сваёй цеплынёй нашу жыццёвую адзіноту.

Гэтую кнігу нельга не заўважыць. Гэтай кнізе нельга не ўзрадавацца. Гэтаю кнігаю нельга не ўразіцца. Гэтая кніга — нарэшце і найперш! — свята беларускай мовы, на якой так прыгожа, годна і нязмушана загаварылі 658 паэтаў з 57 краін свету. Амаль 200 настаўнікаў — паэтаў і перакладчыкаў, — вучылі іх гаварыць па-нашаму. А каго, зірніце, перакладалі: Гамер і Гарацый Катул і Марцыял, Авідзій і Ду Фу, Дантэ і Петрарка, Гётэ і Гюго, Верлен і Віён, Хаям і Махтумкулі, Уайльд і Кіплінг, Лорка і По, Уітмен і Пушкін, Тагор і Райніс, Бадлер, Хлебнікаў ды іншыя знаныя ў свеце пісьменнікі. Розныя эпохі, розныя краіны, розныя мовы. А як жа натуральна, сабраныя разам, размаўляюць паэты па-беларуску — нібыта наша мова ім родная.

Роздум над вялікаю кнігай

Размова пра анталогію паэзіі свету ў беларускіх перакладах XX стагоддзя "Галасы з-за небакраю". Неверагодна цяжкую працу па яе стварэнні, якая патрабавала, можа, намаганняў цэлага акадэмічнага інстытута, зрабіў адзін чалавек — Міхась Скобла, паэт, перакладчык і выдавец.

Упершыню рубрыка "Галасы з-за небакраю" з'явілася гадоў дваццаць таму ў газеце "Звязда". І з таго часу яна пачала з'яўляцца, ўсё часцей і часцей — было бачна, што складальнік працуе шмат і сур'ёзна. І вось, нарэшце, перад намі беражліва складзеная, з пашанаю выдадзеная кніга. У ёй — на ўсіх хапіла месца і ўвагі: традыцыяналісты, сімвалісты, імпрэсіяністы, эстэты, філосафы, лірыкі... У анталогіі прадстаўлены каталіцкі кардынал, мусульманскі імам, праваслаўны манах, тыбецкі далай-лама. Адным словам, уся рознамоўная і рознатварая сусветная паэзія.

Мне здаецца, ніводная літаратура ў свеце, якой бы моцнай і самадастатковай ні была яна, не можа жыць без перакладаў. Бо пераклады — гэта жывая кроў любой літаратуры. І без гэтай жывой крыві не ўяўляецца поўнавартаснай і, як гэта ні парадаксальна, самастойнай, да прыкладу, паэзіі, бо яе самастойнасць і паўнавартаснасць таксама і ў прыдбаных, прысвоеных, дзякуючы перакладам, творах.

Пераклады — цяжкая праца. Калі гэта сур'ёзна. Калі гэта пот і цярплівая стома перастварэння. І як жа прыемна, што ў анталогіі не адчуваецца ні поту, ні стомы — чытаецца гэты важкі том лёгка, на адным дыханні.

У пераствораным вершы павінен адразу ж пазнавацца аўтар, аднак і перакладчык мусіць таксама прысутнічаць: ён жа ўпускае паэта ў сваю душу і ўжо думае разам з ім, глядзіць на жыццё і свет ягонымі вачыма. Да прыкладу, Гаўрыла Дзяржавін і Васіль Зуёнак, верш "Правіла жыць".

Суцеш паклонам ганарліўца,
Зваж аплявухаю сварліўца,
Улашчы маззю скрып варот,
Заткні сабаку скібай рот, —
Іду ў заклад, клянуся шчыра:
Замоўкнуць тут жа ўсе чатыры.

Ёсць меркаванне, што абавязковай якасцю перакладчыка павінна быць асабістая сціпласць. Пра гэта гаворыць і Ева Лявонава ў сваёй глыбокай і змястоўнай прадмове да анталогіі, падмацоўваючы сваю думку словамі В. Бялінскага: "Калі б сам Пушкін узяўся перакладаць Гётэ, мы і ад яго патрабавалі б, каб ён паказаў нам Гётэ, а не сябе".

"Помнік" Гарацыя перастварыў А. Пушкін: зрабіў вольны яго пераклад на рускую мову. Гэты верш перакладалі і да Пушкіна, і пасля яго: Ламаносаў, Дзяржавін, Фет, Брусаў, памерам арыгінала — Нікольскі. А ў нашыя дні самы вядомы пушкінскі пераклад! Чаму? Ды таму, што Аляксандр Сяргеевіч падышоў да яго не баязліва азіраючыся, а смела, упэўнена. Дзіўна, але "Помнік" Гарацыя цяпер ужо ўспрымаецца толькі як "Помнік" самому Пушкіну!

Дарэчы, "Помнік" Гарацыя, які змешчаны ў анталогіі, перастварыў па-беларуску Максім Багдановіч. Мне здаецца, ён, звяртаючыся да перакладаў, не саромеўся нічога і не баяўся нікога. Чаго ж баяцца: калі ўзяўся — рабі! Хіба мог баяцца Міцкевічавага "Пана Тадэвуша" Язэп Семяжон, пераствараючы яго па-беларуску? Ці Анатоль Клышка, узяўшыся за славутую "Адысею" Гамера? Ці Васіль Сёмуха, які падараваў нам "Фауста" Гётэ ды "Найвышэйшую песень Саламона"? і Уладзімір Скарынкін, які зрабіў нашымі аж трох волатаў — Дантэ, Петрарку, Байрана?

Я спрабаваў у гэтым аб'ёмным томе знайсці вершы, перакладзеныя з бояззю вялікіх аўтараў, і не знайшоў іх.

Вось славуты "Альбатрос" Шарля Бадлера ў перакладзе Сцяпана Ліхадзіеўскага:

Часта ловяць сабе на забаву матросы
Там, дзе чорная бездань,
ні знаку зямлі,
Белых птахаў,
вялізных марскіх альбатросаў.
Што рашыліся суправаджаць караблі.

І як толькі на палубе іх распластаюць,
Сарамлівых, няспрытных блакіту цароў,
Крылы жаласна белыя іх пачынаюць
Валачыцца, як вёслы,
з абодвух бакоў.

Упершыню рубрыка "Галасы з-за небакраю" з'явілася гадоў дваццаць таму ў газеце "Звязда". І з таго часу яна пачала з'яўляцца, ўсё часцей і часцей — было бачна, што складальнік працуе шмат і сур'ёзна. І вось, нарэшце, перад намі беражліва складзеная, з пашанаю выдадзеная кніга. У ёй — на ўсіх хапіла месца і ўвагі: традыцыяналісты, сімвалісты, імпрэсіяністы, эстэты, філосафы, лірыкі...

Найвядомейшы ў свеце "Крумкач" Эдгара Алана По. Здаецца, ён няблага загаварыў па-беларуску, дзякуючы перакладам Алега Мінкіна:

Неяк змрочным часам ночы,
калі я заплюшчыў вочы,
Разбіраючы прарочы сэнс
старых пажоўклых кніг,
Раптам стук пачуў праз стому,
ціхі стук у дзверы дому,
Быццам нехта невядомы
прыпыніўся каля іх.
"Гэта нейкі госць, —
я мовіў, — прыпыніўся каля іх,
Там, каля дзвярэй маіх".

Мне не сустрэлася ніводнага перакладу, які быў бы зроблены абыякава. Гэта, вядома ж, заслуга саміх перакладчыкаў, аднак і густ складальніка, які не дазволіў сабе ўключыць у анталогію слабыя пераклады, таксама многае значыць.

Без боязі паспаборнічаў з Аляксандрам Пушкіным і Міхаілам Лермантавым Алег Бембель, Зніч, брат Мікалай, манах Жыровіцкага манастыра. Пераклады адвольныя, на што звярнуў увагу і складальнік, але своеасаблівыя і цікавыя.

Ты сатварала узрушэнне...
... і рэхам поўніцца трава —
як лёгкакрылае імгненне,
як геній цноты й хараства.

Зразумела, гэта не Пушкін. Якое рэха? Адкуль тут трава? Няма ў Пушкіна травы! Ды і чаму рэха ў траве... І гэта — цуд! І гэта — Пушкін. Не словамі, а душою, эмоцыямі, пачуццямі. Зніч знайшоў ключ перакладу "Я помню чудное мгновенье". Але, на жаль, не поўнасцю выкарыстаў яго.

Перакладчык, не зважаючы на гады і стагоддзі, — сябра, таварыш, сучаснік паэтам, якіх перакладае. Бо ён жыве ў іхнім часе, тымі ж клопатамі, якімі жылі і яны.

Янка Купала і Адам Міцкевіч, Якуб Колас і Рабіндранат Тагор, Максім Багдановіч і Гарацый, Авідзій, Гейнэ, Верлен. Хіба яны не сучаснікі па паэзіі?

А. Клышка, аўтар "Буквара", вядомы знаўца антычнай літаратуры, перакладчык Гамера і Евангелля. У анталогіі ён прадстаўлены фрагментам з "Адысеі" ды эпіграмамі Марцыяла.

В. Сёмуха — гэта не толькі славуты "Фауст" Гётэ ды "Найвышэйшая песня Саламону", але і пераклады з Ніцшэ, Рыльке, Гесэ, Райніса.

Я. Семяжон пераклаў творы паэтаў аж з трыццаці чатырох моваў свету!

Р. Барадулін — гэта Лорка, Містраль, Хаям, Пастэрнак, Вазнясенскі, Шэлі, Кітс, Кіплінг, Шагал, Мандэльштам.

Н. Гілевіч — гэта балгарская літаратура і ўвогуле славянская паэзія.

Н. Мацяш — гэта французы: Рансар, Марыяк, Арагон ды іншыя. Выдатна, душою перакладзеныя. Светлая памяць ёй.

А. Лойка — гэта Наваліс, Гётэ, Верлен.

А. Куляшоў пераклаў "Яўгенія Анегіна" Пушкіна, "Спеў аб Гаяваце" Лангфела, "Энеіду" Катлярэўскага і лірыку Ясеніна.

Максім Танк і польскія паэты, Алесь Звонак і Шата Руставелі, Э. Агняцвет і Беранжэ ды Апалінэр, У. Караткевіч і Катул, А. Вярцінскі і Андрэй Германаў, Р. Баравікова і Ганна Ахматава, У. Папковіч і нямецкая паэзія, Г. Бураўкін і Іван Драч, А. Тулупава і Лі Цынджо, В. Жуковіч і Алішэр Наваі, Р. Сітніца і Уладзімір Набокаў, Г. Дубянецкая і Роберт Бёрнс.

Я. Чыквін з "Богаўдзячнаю малітваю з засцярогай", з нялёгкім пытаннем да Бога: "Чаму зрабіў мяне палякам", з перакладам з Анджэя Бурсы, які памёр дваццацігадовым...

С. Панізнік — гэта Латвія, Т. Бондар — творы румын ды малдаван.

Х. Лялько перакладае папскія энцыклікі. Яе голасам Караль Вайтыла (Ян Павел II) у вершы "Юдэйская пустыня" гаворыць:

Марна шукаць тут хоць якой зеляніны.
Людзі адсюль адышліся далёка.

Адчуваеш, што менавіта так гаварыў Вайтыла, як пераказала яго думкі Х. Лялько. І я, ведаеце, бачу іхнюю пустыню!

Л. Сільнова перакладае з эсперанта. У анталогіі змешчана па вершы чатырох паэтаў-эсперантыстаў. В. Жыбуль, майстра паліндромаў, у якога ёсць нават паліндрамічныя паэмы ("Кацёл клёцак" ды "Палігон ног і лап"), прадстаўлены ў анталогіі перакладамі вершаў сучаснага амерыканскага паэта-вандроўніка Кэры Шона Кіза. Спачатку хочацца знайсці ў яго і перакладзеныя паліндромы, але потым разумееш, што паліндромы не перакладаюцца, яны жывуць толькі ў сваёй мове.

"Палабскую вёсачку лес завязаў, як вузельчык". Хораша! "Хаты сышліся на раду — як развязаць пятлю адзінай дарогі, што пачынаецца і сканчаецца тут". Як усё гэта блізкае нам! Як менавіта такога верша неставала нашай паэзіі! Знайшоў яго ў Міхала Чэрніка і пераклаў М. Скобла. Дарэчы, з Адама Міцкевіча для сваёй анталогіі складальнік выбраў тое ж, што на рускую мову пераклаў і А. Пушкін: "Тры Будрысы" і "Заяводу". І яму ўдалося на высокім узроўні зрабіць пераклад гэтых твораў нашага таленавітага земляка.

Маладыя часцей за ўсё перакладаюць маладых. Сваіх равеснікаў. Бывае, без знакаў прыпынку, без вялікіх літар, з глыбока схаваным сэнсам...

Аднак нярэдка і плённа маладзейшыя спаборнічаюць са старэйшымі перакладчыкамі, перастварэючы нават класікаў.

А. Хадановіч пераклаў для анталогіі цэлую бібліятэку знаных паэтаў: Віён, Малерб, Джон Дон, Бадлер, Малармэ, Рэмбо, Апалінэр, Паўнд.

Трыццацігадовыя шукаюць у паэзіі чагосьці новага, незвычайнага, нечаканага. М. Мартысевіч нават сваё разуменне перакладу падае: "Пераклад для мяне — гэта плагіят". Афарызм, вядома, неблагі, але з ім варта і трэба спрачацца. За ісціну!

Хоку японца Аракіда Марытаке ў перакладзе студэнта Віцебскага дзяржаўнага універсітэта А. Арашонка хораша гучыць па-беларуску:

Пажухлае лісце
Ляціць назад да галін?
Ах! Гэта матылькі!

Вальжына Морт, нядаўняя бум-бам-літаўка, якая цяпер жыве ў ЗША, разам з Рафалам Ваячакам суміцца:

Не пытаю,
ці вернешся ты дадому.
Калі вяртаешся, дзе ты быў,
не пытаюся.

А аспірантка кафедры замежнай літаратуры БДУ Н. Ламека, добра разумеючы Джона Мілтана і яго "Страчаны рай", з надзеяй выдыхае па-беларуску:

Дык прасвятлі ж душу, Святло Нябёс!
Рассей туман, каб змог убачыць я
І расказаць аб тым, чаго смяротны
Ні ўбачыць, ні спазнаць,
на жаль, не здольны.

Бібліяграфічныя даведкі склаў таксама М. Скобла. Іх вельмі цікава чытаць: шмат інфармацыі, своеасаблівыя ацэнкі, нечаканыя вывады. Можа, дзе-нідзе і крыху крыўднаватыя для аўтараў. Але ж гэта аўтарская анталогія, і яна мусіць быць шчырай...

Я знарок не ставіў сабе за мэту зрабіць тэксталагічнае даследаванне перакладзеных і змешчаных у кнізе вершаў. Гэта, спадзяюся, зробяць даследчыкі. Мне ж проста хацелася парадавацца з нагоды з'яўлення ў нашай літаратуры гэтай вялікай кнігі.

Ці ёсць недахопы? Вядома ж, ёсць. Аднак у параўнанні з тым, што зроблена, — гэта такія дробязі. Галоўная мэта дасягнута: шмат якія краіны і шмат якія стагоддзі і нават тысячагоддзі загаварылі па-беларуску.

Янка СІПАКОЎ

Цікавае знаёмства

Ірына Шатыронак — наша, маладзечанская. Як сама прызнаецца, "дзяцінства прайшло ў раёне вакзальна-пешаходнага моста — вакзала". У яе, журналісткі па адукацыі, якая практычна ўсё жыццё займалася інфармацыйна-рэкламнай работай, тры выдадзеныя кнігі прозы. Жанравая палітра розная: апавяданні, аповесці, эсэ, лірычныя замалёўкі. Ім уласцівы філасофскі роздум.

На старонках кнігі "Старый двор моего детства" Ірына Шатыронак паспрабавала перадаць дух таго часу, які запомніла яшчэ маленькай. Праўда, на часы свайго маленства яна глядзіць ужо праз прызму пражытага і перажытага, з улікам тых грандыёзных сацыяльна-палітычных перамен, якія адбыліся ў грамадстве.

У "Слове да чытачоў" яна гаворыць, што "мы жывём даўно ў іншай краіне" і дадае: "Да нас наблізіўся чужы свет, які ўжо трэба будзе асвойваць нашым дзецям і ўнукам. І свет гэты — спажывецтва. А ён з вялікім апетытам спажывае нашы душы".

У дзіцячым узросце Ірына вельмі любіла кнігі і ўсё, што з імі звязана. Аб гэтым гаворыць у "Пестрых повестях", непасрэдна ў апавяданні "Сестра". У дзяцінстве навучылася чуламу, трапяткому разуменню слова. І тут, як прызнаецца, выключная роля бацькі...

У сучасных жа дзяцей, разважае яна, няма знакавых дваroў іх дзяцінства, дзе павінны, на думку пісьменніцы, закладвацца асновы будучага жыцця. Дом — школа, і зноў школа — дом... Даволі сумны набор правіл без актыўнага ўдзелу трэцяга звяна — жыцця ў двары. Сёння, калі з'явіліся камп'ютэры, падлеткаў ад іх не адцягнуць. Адсюль: калі дзеці становяцца дарослымі, у пэўнай меры некаторыя з іх затым у сучасным свеце адчуваюць адчужэнне душ, замкнутасць і адасобленасць. А ў сучасным свеце чалавека ўсё больш, як сцвярджае аўтар, сталі падсцерагаць адзінота і адчай. Гэта не можа ашчаслівіць чалавека. Ён стаў нейкім нервовым, закамплексаваным... Стаў шукаць схованку ў Інтэрнеце, камп'ютэрных гульнях, фільмах, якія анічога ні розуму, ні сэрцу звычайна не даюць, урэшце — у алкаголі, ратуючыся ад неразумення і адзіноты...

Ірына Шатыронак расказвае аб добрых справах, добрых учынках. І добрае слова пра творчасць пісьменніцы гаворыць Людміла Кебіч — старшыня Гродзенскага абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі.

Сцвярджаецца, што героі кнігі "Пестрые повести" і "Старый двор моего детства" — рэальныя, а таму заўсёды розныя: яны цудоўныя і заганныя адначасова (Ціна са "Шляпки"), вартыя жалю і бездапаможныя (Міхайлаўна з "Была у старушки избушка лубяная").

Героі кніг дзіцячай пісьменніцы з Гродзеншчыны, карані якой тут, у Маладзечне, жыццёва праўдзівыя, таму і знаёмства ў мяне з імі было цікавым. Думаю, што кнігі, у якіх яна шчыра і адкрыта выказвае сваю любоў да зямлі, дзе нарадзілася і вырасла, будуць прыязна сустрэты чытачамі.

Аляксандр ХАЗЯНІН

Галіна КАРЖАНЕЎСКАЯ

* * *

Разгойдвае вецер арэлі,
Імчыцца кудысьці за свет.
І ночы, і дні адубелі,
Ссінеў на прагулцы паэт.

Усё, што прасілася ў творы,
Адмерла і знікла даўно.
Адно раўнадушныя зоркі
Глядзяць на зямное кіно.

Што ім нашы пробы і ролі,
І творчы парыў, і прастой?
Згінаецца тонкае голле
Пад ветру магутнай рукой.

Так лёс нас
уладна згінае,
Фармуе, як цеста ў дзяжы.
Гарбатка такая смачная...
Ну вось і сугрэў для душы.

* * *

Сіберна, дружа мой, сіберна...
Лістком акрылася зямля.
Была і я калісь няверная,
Ды павінілася пасля.

Мы ўсе у чымсьці вінаваты,
Ды адпускаецца не ўсім.

Хацелі крылаў?
Неба ў кратах,
Бо непрабудна, цяжка спім.

Жыццё у будучынь сплывае,
Дзе невядомасць, шэры змрок.
І ранкам знойдзеш (так бывае)
Халодны птаха камячок.

* * *

Мне так балюча, дарагі,
Што лепш узяць
ды сэрца выняць.
Ні ланцугі, ні абцугі
Такога болю не прычыняць.

І звыклым ён не можа стаць,
Як іншы нейкі боль хранічны.
... Хачу заснуць, каб вечна спаць,
Ды не дае твой голас зычны.

Зімовы дзень

Падалі, быццам са жмені сняжынкі —
Чыстых, халодных нябёс
напамінкі.

Голуб ляцеў, і ляцеў яго цень.
Сонечным быў
і марозным той дзень.

Плаўна сцякаў ён у вечнасць і сон,
Быццам даводзіў:
не верце у скон!..

Пасля буры

Цэлую ноч
Ветрам голле трапала,
Вунь, веліканы ўпокат
Ляжаць на траве...
Я не хачу быць дрэвам, якое ўпала.
Я хачу быць дрэвам, якое жыве.

* * *

Усё-ткі цікава
жыццё пражываць:
Ставіць пытанні, адказы шукаць.
Бачыць прычыны
з-пад тоўшчы гадоў,
Сутнасць сваю адкрываць
зноў і зноў.

Крыўды паднімуцца, як таплякі,
І падзівуешся:
"вось ты які!"

Думаў "лагодны" ты сам пра сябе,
Ды з галавою заграз у злабе.

Думаў,
за ўсіх тваё сэрца баліць —
Проста хітрыў
і хацеў дагадзіць.

Думаў, ты золата?
Покуль што медзь.
Добра усё-ткі ілюзій не мець!

* * *

І куды людзям спяшацца?
І чаго ім так ляцець?
Не ўцячэ нікуды праца,
Бо не воўк і не мядзведзь.

Ўсе адбудуцца сустрэчы,
Прыйдуць поспехі і рэчы —
Трэба крышачку счакаць.
Дзіўны клопат чалавечы —
Свае шанцы даганяць!

* * *

Светлае войска імкліва
мячы навастрыла.
Ў небе таксама двубой,
бо йдзе сіла на сілу.

Тыя вузлы, што за жыцці
мы ўсе завязалі,
Будуць развязаны лёгка —
і зроўняцца шалі.

Там разглядаюцца
нашы зямныя намеры,
Там адчыняюцца
колісь закрытыя дзверы.

Там вырашаюцца
нашага лёсу пытанні.
Што прарывае —
хутка балець перастане.

Узрост

Ад ранкаў залатых, крыху заспаных,
Да вечароў — падобна, алавяных.
(Бо кіснеш ля блакітнага экрана:
І тлум у галаве, і легчы рана).

Ад поўдняў энергічных —
неўпрыкмет
Да тых начэй, калі нямілы свет,
Калі перабіраеш лёсу клунак,
Калі б заснуць было, як падарунак.

* * *

Не ўсё так кепска.
Сонца засвяціла
Пасля залевы.
Страсянула крылы
Сарока...
Што нясе за навіну?
Што я за вушка выцягну ману
І рукі абтрасу
ад прайдзісветаў.
Яшчэ крыху — і забуяе лета,
Пасаджаная вішня
пойдзе ў рост
І я пайду па лужынах наўпрост.



Анатоль ЖУК

Днямі адзначыў сваё 60-годдзе вядомы беларускі празаік, паэт, кінасцэнарыст, акцёр Анатоль Жук. Рэдакцыя "ЛіМа" далучаецца да ўжо агучаных віншаванняў шаноўнаму юбіляру ды жадае яму здароўя, бадзёрасці, новых творчых здзяйсненняў.

* * *

Коласам апетая жытнёвым,
Улюбёная купальскай воляй,
Ты заўжды мне чыстая і новая,
І заўжды адзіная да болю.

Сонечная, росная, квяцістая,
Добрая, як мара дзён дзяцінства,
Як матулі вочы, як далоні
Яе рук — шурпатыя, стамлёныя.

Ты — усё! Мая ты. А я — твой.
Вечар. Звон. Мяцеліца. Дарога.
Я заўжды вітаўся, нібы з Богам,
І з вясной, і з восенню тваёй...

І ніякаю чужою воляй
Мне не выстудзіць маю любоў
Да твайго да неба і да поля —
Дзе з тваёй мая злілася кроў,

Беларусь!

* * *

Дзе дарога, там і доля,
Там прастор, там думна.
Не бывае мне ніколі
На дарозе тлумна.

Там я дыхаю, жыву я,
Волі час вітаю,
Там я самую святую
Радасць сустракаю.

А як скончыцца дарога,
Вырай жураўліны
Панясе душу нябогі
Да нябёсаў клінам.

І дарогаю апошняй
Ляжа вечнасць ціха.
Паплыву па ёй, пакрочу
Без бяды, без ліха.

* * *

Раскажу пра сябе. Пра свой час,
Як я жыў, як кахаў, як думаў,
Што здзіўляла мяне кожны раз,
Калі я пазбаўляўся тлуму.

Раскажу пра свае берагі,
Па якіх я блукаў, няўцешны,
Дзе я, вечна святы, вечна грэшны,
Вашай не пазбаўляўся тугі.

Раскажу ўсё, што змог і не змог, —
Калі стане мне вусцішна крыху,
І душа не спакусіцца ліхам,
Каб мне вас не пакрыўдзіць, крый Бог!

* * *

Мне без вясны — вясны
Не будзе аніколі.
Люблю яе красы
Духмянае прыволле.

Дзе птушак перазвон,
Бы з кліраса асана,
Дае жыццю разгон
Аж да нябёсаў самых.

Дзе ў жыце васількоў
Сінеюць аблачыны.
І новае з абноў —
Ва ўсёй прыродзе слыннай.

Святы яе закон
Для ўсіх — адным прызваннем!
І я ўвесь — новы звон! —
Гучу яе гучаннем.

Жыву і буду жыць
Пад сонечнай залевай,
Нагбом духмянасць піць
Шалёнага напеву.

Мне без вясны — вясны
Не будзе аніколі.
Мне сняцца яе сны,
Шчаслівыя да болю!

* * *

Ўсё крычым, што дома мы не госці,
Жылы адно рвём на струны новыя,
І дарогу на вякі як быццам мосцім,
А як глянеш — не тутэйшыя,
Часовыя!

* * *

Быццам жабракі, перада мною
Дні мае гаротныя стаяць,
Як адзін, з працягнутай рукою —
А мне ім няма чаго падаць.

Сам жабрак.
Каб хтосьці з Боскай ласкі
Мне падаў на мой,
на мой, на новы дзень...
І ніякаю чароўнай казкай
Мне не падмануцца больш нідзе.

Хіба толькі згодна ды разумна
Я змагу на белы свет глядзець,
Ды ісці яго дарогай тлумнай
Праз гады, што буду яшчэ мець.

Фота Уладзіслава Басько

Ды адчайна вынішчу да болю
Сум, што нёс я некалі ў жыцці,
Каб пасля ў дарозе больш ніколі
Ён не змог нідзе мяне знайсці.

Плача птушка

Ні травы, ні дрэўца пры дарозе.
Лапікі спустошанай зямлі.
І кугае кнігаўка ў знямозе,
Страшна ёй... Душа яе баліць.

Плача птушка. Ды не плачуць людзі,
Што ім да таго, што свет здзічэў?!
Абы толькі дыхалі іх грудзі,
Ды гучаў салодкай долі спеў.

Не да поля ім і не да неба!
Дзе ўжо да травінкі і куста?!
Іншаю жывуць яны патрэбай —
Без любові, без імя Хрыста.

Як сычы. Як горкай долі шэльмы.
Акрыяў, расправіў плечы хам.
Плача птушка. Ёй балюча вельмі.
Госпадзе, даруй наш вырак нам!

* * *

"Быць альбо не быць?" — Няма адказу.
Хіба толькі ў кожнага ён свой.
Гамлетаўскай бессмяротнай фразай
Вось і я парушыў свой спакой.

"Быць альбо не быць?" — Якой патрэбай
Мне жыцця свой абазначыць шлях?
Хіба толькі, каб было шмат хлеба,
Ды віна да хлеба — і ўвесь страх

Вечнага пытання ад Шэкспіра.
Весяліся, еш сабе і пі,
І твая, што не гучала, ліра,
Прагучыць высокай нотай "мі",

Можа, "фа", а можа, "соль". Без солі
Жыць жыццё — што гора гараваць.
Не шукайце вечнага ніколі,
Вечнасць век нікому на спазнаць.

І Шэкспір не зведаў той вяршыні,
Хоць гукаў на цэлы свет услых:
"Быць альбо не быць?"
Хай першы кіне
Камень у мяне, між вас адзіны,
Той, хто без грахоў жыве зямных.

"Быць альбо не быць?"
— Грахі і святасць!
А яны — хіба што толькі дым...
На зямлі жывуць — каб жыць і плакаць,
І кахаць. Астатняе —
Бог з ім!

Тандэм

Мікола ФЯДОСІК

Апавяданне

Ніхто яшчэ не адкрыў тых законаў ці формулаў, паводле якіх вызначалася б фарміраванне ў чалавеку нараджэнне сімпатыі ці антыпатыі... Але існуе адзін бясспрэчны факт: людзі з аднолькавымі характарамі сябруюць вельмі рэдка, ды што сябруюць — ворагамі могуць быць між сабой...

Але, здараецца, што нават і законы абвяргаюцца. Як выключэнне з правілаў... Бо як тады растлумачыць той факт, калі сяброўства ці ўзаемнае прыцягненне ўзнікаюць, здавалася б, у розных, несумяшчальных па характары, людзей. Пры гэтым, такія адносіны вытрымліваюць самыя неверагодныя выпрабаванні, якія б ні выпадалі на іх долю...

Кожны, хто ў тыя далёкія, шасцідзесятыя гады, уваходзіў у вёску Хвойня — з боку Лучыцаў, — то не мог не звярнуць увагу на дзве хаты, з якіх і пачыналася вёска. То нават і не хаты былі, а дамы. Паміж домам і хатай розніцу тлумачыць не трэба... Вокны вялізных, у параўнанні з астатнімі хатамі вёскі, дамоў глядзелі адзін на аднаго праз дарогу насупраць.

Першы дом, ніжэйшы "ростам", належаў Ілы Прахаську.

Ілья — волат, мо больш як два метры ростам, разважлівы ў рухах і словах. Глядзіць з-пад ілба, але ў яго позірку добразычлівая і хітраватая ўсмешка. Хто яго не ведае, і першы раз убачыць — памяркоўнага і разважлівага, падумае, што ён несусветны гультай і абібок. І — памыляецца, бо дае сваю ацэнку з першага погляду. Толькі аднавяскоўцы ведаюць цану гэтаму незвычайнаму чалавек...

Ілья, каб распачаць нейкую работу, доўга рыхтуецца да яе. Спаквеля ўсё робіць, спаважна. Тыя ж дровы пілаваць, дык ён будзе цэлы дзень вастрыць пілу, чараваць над сякерай... А потым у яго ўсё складна і прыгожа выходзіць...

Так і слова з яго выцягнуць — цэлая праблема.

Зусім процілеглым, як бы гэта сказаць дакладней, антыподам, быў яго сусед насупраць — Фёдар Пракопаў. Хударлявы, доўгі, нібы тая жэрдка, імпульсіўны... Як рукі, так і язык у яго ніколі не гулялі. Якая б тэма не абмяркоўвалася, пра што б ні гаварылі, — Фёдар тут як тут, і свае тры грошыкі ўставіць... Як той Піліп з канопляў вынырне. І сваё меркаванне ён выкажа як абсалютнае, як сапраўднае, яшчэ і падсумуе сказанае: "На свае вочы, браткі, бачыў тое..." Ці — чуў.

Прэтэндуючы на лідэрства ва ўсім, мітуслівасць праглядвалася ў ім неймаверная. А калі быў "пад мухай", то, не кантраляваў сваіх паводзінаў, мог неасцярожным словам пакрыўдзіць любога чалавека... За яго мітуслівасць і мянушку далі адпаведную — "Венцілятар"...

Дужа дзіўным было тое, што такіх два, абсалютна процілеглых па характары, чалавекі, з'яўляліся найлепшымі сябрамі, як кажуць, "не-разлі-вада"...

Калі ж разам браліся за нейкую справу, выходзіла ўсё ладна і хораша. Адзін аднаго слухаліся, адзін аднаму падпарадкоўваліся... Людзі казалі-жартавалі — калі Ілья чыхне, дык Фёдар кашлянуць павінен. Такі ў іх ладны "тандэм" атрымліваўся. Яны нават пабралі сабе ў жонкі родных сясцёр. Так ужо выйшла. Мусіць, і густы ў каханні ў іх былі аднолькавыя...

У кожнага з іх мелася сваё "хобі", свая любімая праца, якую лепш за іх ніхто не мог выканаць. Адкляпаць касу, і, каб на ёй не было "лапатухі"? Папраўіць лязо сякеры? О, тут асам быў Фёдар. А вось што тычыцца забоя гавяды ці кабанчыка — то тут першынство ўжо належала Ілы, ды не толькі ў Хвойні, а і далёка за яе межамі...

Дарэчы, пра забой і смаленне вепручка... О, гэтае мерапрыемства ў вёсцы было сапраўдным святам! І да яго рыхтаваліся загадзя. Вызначалі па поўні і па народных прыкметах, калі пачнуцца маразы, і тады ўжо прыступаліся да запланаванай акцыі... Каб усталяваліся маразы — абавязкова, бо халадзільнікаў тады яшчэ не было...

Тая зіма, а калі больш дакладна, то з шэсцьдзесят восьмага на шэсцьдзесят дзевяты год, выдалася на рэдкасць снежнай і завейнай. Такіх зімаў даўно ўжо няма... А тады ж яны наляталіся сіберныя, з халодным ветрам... І трымаліся зімы тыя амаль аж да сярэдзіны сакавіка...

Вяпрук, якому прыйшла пара ўжо заканчваць свой кругазварот, які ўжо і еў без усялякай ахвоты, пераборлівым стаў, — выглядаў няйначай зубрам. Зразумела, што Фёдар, выгадаваўшы такую вялізную жывёліну, паклікаў разабрацца з гэтай праблемай свайго лепшага сябра — Ілью.

А ў вёску ўжо прыйшла "цывілізацыя" — скрозь пачалі шчэпце абпальваюць паяльнымі лямпамі ці газавымі гарэлкамі. Але сябры прынцыпова не падаваліся спакусе, — прымяняліся, як і дзяды, толькі салому. Ды не любую, а спецыяльна для гэтага адабраную.

Праўда, працэс апрацоўкі вепрука ў іх праходзіў мо і задоўга, але ж і сала потым атрымлівалася беласнежным, з жоўценькім адлівам, і скура мяккая, не адрознівалася ад сала...

А распрацоўка вялася ў паветцы, — ні ветру табе, ні снегу з неба. Зацішна, як у хаце.

Працэс, як заўсёды, пачынаўся з адной і той жа працэдуры — аддзялення грудзінкі, і адбору кавалкаў для смажаніны. Тут усё было разлічана да дробязяў — пакуль гаспадыня падрыхтуе для іх усё неабходнае, яны паспявалі зрабіць тое, што патрабавалася. Тэхналогія, вядома, была адпрацавана да аўтаматызму. Сябрам хапала трошкі больш, чым паўгадзіны, каб не толькі расправіцца з тушай, але і разнесці ўсе часткі ў летнік для ахалоджвання...

Спакон вякоў павялося ўжо ў тых краях, што на свежыну заўсёды запрашаліся і бліжэйшыя суседзі. Тады за сталом збіралася чалавек з дзесяць, ну, пятнаццаць...

І цяпер сабралася каля дзесяці суседзяў. Марыя Кузьмінічна, жонка Фёдара, пакуль сябры даводзілі да ладу сала ды мяса, паспела ўсяго насмажыць і напарыць, накрыць стол і запрасіць суседзяў на пачастунак.

І вады не забылася нагрэць, каб удзельнікі традыцыйнага працэсу змаглі змыць, як казаў Фёдар, "тэхналагічны бруд".

Чыгун, на вядро, жанчына прынесла з печы і паставіла каля паветкі — на калодку. Побач паклала кавалак гаспадарчага мыла. Ручнік ускінула сабе на плячо. Узяла вялікі кубак і мерылася паліваць мужчынам на рукі.

Першым, як і заўсёды, падышоў да Марыі Ілья. Узяў у рукі мыла, папрасіў:

— Капні мне, Мар'я...

Жанчына, не шкадуючы вады, аддзяліла палавіну — лінула кіпню на рукі.

Ілья здрыгануўся ўсім целам, выхапіў рукі, і тут жа іх усунуў у снег.

— Што з табой, Ілья? — не зразумела гаспадыня, аглядваючыся на веснікі, пачуўшы, як ішлі да іх на свежыну суседзі.

— Ды нічога, снегам трэба бруд адшураваць... А ты цяпер мужу палі...

Падышоў Фёдар. Закасаўшы рукі да локцяў, узяў мыла, чакаў цёплай вады...

— Ліні, Марыя!..

Жонка адарвала позірк ад гасцей, зачарпнула зноў поўны, літровы кубак, вады, выліла на рукі мужу...

— А-ааа! — ускрыкнуў, падскочыў на адным месцы Фёдар, задраў рукі, затанцаваў — не здагадаўся, як Ілья, уваткнуць іх у снег.

— Ты што... жонка-а-а-а! — крычаў ён, бегаючы па двары, не ведаючы, як суцішыць апёк.

Сябар хітра пасмейваўся ў пракураныя вусы, маўчаў.

Ён нават і экзекуцыяй хацеў падзяліцца са сваім сябрам. Радавацца — разам, боль цярпець — таксама разам...

Замест вясёлай свежыны суседзі пачалі бегаць па вёсцы ў пошуках машыны, каб адправіць сяброў у пасёлак Акцябрскі — у бальніцу. Бліжэйшай лячэбнай установы, на жаль, не мелася.

Ім перавязалі рукі, забінтавалі. Адправілі дадому. Сказалі, каб праз тры дні прыехалі на перавязку.

Упершыню ў жыцці сяброў адлучылі ад працы. Якая можа быць праца, калі рукі ў бінтах?

Ды што праца! Чарку ў рукі немагчыма ўзяць! Хіба можна ўявіць нешта горшае за гэтыя пакуты?

Апёкі зажывалі доўга, мо з месяц, ці болей.

Першы тыдзень сябры не толькі не размаўляць, але і глядзець адзін на аднаго не маглі. Марыя хацела памірыць іх, але не асмельвалася, баялася, каб не нарабіць яшчэ большай бяды, каб не разарваць іх дружбу ўшчэнт.

Уся вёска з неймавернай цікавасцю сачыла за імі, перажывала. Калі прайшоў тыдзень, і яны не пайшлі адзін аднаму насустрач, вывад напрошваўся сам — іх дружбе прыйшоў "халэмус"...

Але з цягам часу разам з фізічнымі ранамі, зараслі і душэўныя.

Ніхто не помніць, хто першы пераступіў парог суседа. Калі прайшло з паўгадзіны, мо і болей, з вокнаў на вуліцу паляцела песня "ой, за зялёным лужочкам, хлопец дзеўку цалаваў...". Што дружба вярнулася, гэта зразумелі ўсе, але вось як яны чаркі бралі ў забінтаваныя рукі, ніхто не ўведаў...

У Ілы пачалі раней загойвацца раны, але ён не пайшоў на працу, у знак салідарнасці чакаў, калі адыдуць ад апёкаў рукі ў Фёдара.

Потым, на наступны год, а потым і яшчэ на наступны, калі пачыналася свята смалення вепрукоў, калі падыходзілі сябры да чыгунка з гарачай вадой, то абявязкова загадвалі Марыі, каб яна першай усунула рукі ў гарачую ваду... Ці мала што.

Але ці можа сяброўства існаваць, калі лёс не падкіне яму чарговае выпрабаванне?

Атрымаў позву з ваенкамата пляменнік Фёдара — Сяргей. Падзея гэтая лічылася ў вёсцы адной з важнейшых. Здаралася, што такія праводзіны давалі фору добраму вяселлю. Але тое ўжо залежала ад бацькоў прызыўніка — ад іх шчодрасці і багацця.

Але ў любой вёсцы, што знаходзілася на Пцічы, ды і не толькі, лічылася так — калі няма рыбы на стале, то і праводзіны не праводзіны, а так п'янка-пагулянка...

На сямейнай радзе праблемай з рыбай адзінагалосна было даручана заняцца Фёдару. Тым больш, што ў яго быў невялічкі брэздзянёк, з якім яны з сябрам колькі гадоў тапталіся па затоках Пцічы...

Вось і цяпер яны накіраваліся да ракі.

Раз зацягнулі брэздзень — пуста. Ніводнай, нават самай маленькай, не ўскочыла рыбінкі. Другі раз — вынік той жа. І трэці — тое ж самае...

— Ды што за д'ябал? — пачухаў патыліцу Ілья.

— Гэта здзек нейкі, няйначай, — паддакваў яму Фёдар.

Селі на беразе, задумаліся. Ніколі такога з імі не было, ніводнага разу!

— Што рабіць маем, сусед?

— Разбіцца трэба на два лагеры. Хоць у аднаго, ды атрымаецца.

Ілья напаткаў суседа Ігната, рашылі паспрабаваць з ім налавіць рыбы "волакам". Гэта такі від рыбнай лоўлі, калі спецыяльны брэздзень цягнуць дзвюма лодкамі, плывучы па цячэнні, але прыціскаючы рыбу да берага...

А Фёдар, прыхапіўшы з сабою самагонку і закусь, накіраваўся ў суседнюю вёску Кашэвічы, — да свайго сябра-аднакласніка, які працаваў падрыўніком у геолага-разведачнай партыі. Цёзкі яны з сябрам, абодва Фёдары.

Угаворваў ён свайго сябра доўга і настойліва. Выпіта было тры пляшкі, але праблема не рухалася з мёртвай кропкі. Тады Фёдар збегаў у краму, прыкупіў і яшчэ адну...

— Ладна, — згадзіўся падрыўнік, адстаўляючы ад сябе шклянку з недапітай гарэлкай, — вазьму грэх на душу...

Яшчэ з вечара Фёдар сядзеў на беразе рэчкі, сыпаў і сыпаў на адно і тое ж месца — у кручу — падрыхтаваную падкормку. Ноч была халодная, але ён не адступаў ад задуманага плана.

Не паспеў растаць густы туман, як на дамоўленае месца прыджгаў аднакласнік.

— Ну, як, усё падрыхтаваў?

— Скарміў да рэшткі, што было... Думаю, дастаткова будзе...

— Ладна... Але ты прабяжыся па беразе, прыгледзься, каб нікога не было побач, а то не мінаваць бяды.

Фёдар кінуўся і ў адзін канец, і ў другі — нікога, ні адной жывой душы не ўбачыў.

— Нікога, — далажыў па-ваеннаму, — можна пачынаць...

Аднакласнік выцягнуў з пакунка толавую шашку, змацаваў яе з булыжнікам. Потым уставіў у гняздо дэтанатар, злучыў вывад з тонкімі ізаліраванымі дроцікамі.

Фёдар з цікавасцю назіраў за прафесійнымі рухамі падрыўніка, думаў: "Ну, цяпер будзем з рыбай..."

Прыстасаванне паляцела ў цэнтр кручы, глуха булькнула, падняўшы пырскі над вадой. Глухое рэха пакацілася па маўклівай роўнядзі вады.

Падрыўнік пачакаў, калі булыжнік ляжа на дно, паглядзеў на заказчыка рыбнай эпапеі, — як усё роўна пытаўся дазволу распачаць справу. "Венцілятар" кіўнуў галавой: "Пачынай!.."

Выцягнуўшы з кішэннага ліхтарыка батарэйку, злучыў кончыкі дроту з полюсамі.

Напачатку ўздрыгнула зямля, потым над вадой узняўся шэры слуп вады і глею... Нешта шэрае і вялікае прыўзнялося над паверхняй вады... "Сом?! — узрадаваўся Фёдар. — Добрая юшка будзе!.."

— ...тваю маць! — нехта мацюкаўся там, дзе яшчэ не асеў слуп вады... — вайна пачалася...

У Фёдара ўсё абарвалася ўсярэдзіне — да берага, махаючы з шалёнай хуткасцю вяслом, імкнуўся сусед Ілья... Вочы ў яго былі шырока раскрытыя, нешта гаварыў, але што — нельга было разабраць...

Непадалёку ад іх, яны і не бачылі, стаяў на беразе напарнік Ілы. Ён паспеў ужо са страху выскачыць на бераг, глядзеў на іх, і нічога не разумеў... Галава яго чамусьці ўздрыгвала, як у пеўня перад бойкай... На твары святілася дурная ўсмешка...

— Гы-гы-гы... — паказваў ён пальцам на падрыўнікоў... гы-гы-гы...

Канфуз атрымаўся вялікі, а магло ўсё абярнуцца непапраўным горам.

Увесь начны ўлоў кантужанага сябра апынуўся ў рэчцы.

Фёдар здагадаўся пазбіраць рыбу, пакідаць яе ў човен. А рыбы яны налавілі процьму — уся рака была белай.

Калі да Ілы падышоў Фёдар, сябар паказваючы на раку, паспрабаваў нешта вымавіць:

— Ты... па-па... д-для... б-ббб...

І нічога не мог сказаць.

Сітуацыя была пікантная, таму ніхто да дактароў па медыцынскую дапамогу не звяртаўся.

Калі ж вяскоўцы пыталіся ў Ілы, чаго ў яго пашкоджана галава, тлумачэнні даваў Фёдар:

— Ды гэта... Мы хлеў раманавалі, ды жэрдка паламалася, а мы ўніз паляцелі...

— А чаму не ўверх?

— Чаму — уверх? — перапытваў, не разумеючы, Фёдар.

— Вы ж у нас арлы... А арлы на зямлю не падаюць...

І рагаталі вяскоўцы пасля тых слоў, бо ведалі прычыну "ранення" рыбака.

Школьны сябар на наступны дзень падаў заяву на звальненне і знік у невядомым кірунку. Казалі, што недзе бачылі яго на Поўначы. Потым казалі, што праз дзесяць гадоў ён вярнуўся дадому. Хаця яго за гэты час ніхто і не шукаў...

Ілья да канца свайго жыцця так і не пазбавіўся ад лёгкага заікання, якое набыў той халоднай раніцай.

Але што дзіўна — тое здарэнне яшчэ мацней змацавала іх дружбу. Нават родныя сёстры, іх жонкі, перасварыліся адна з адной, а яны не, толькі пасмейваліся моўчкі...

Не так даўно мне прыйшлося пабываць у родных мясцінах.

Папытаўся пра Ілью і Фёдара ў старога Ігната, вясковага абарыгена.

— Э, чалавеча, — уздыхнуў дзед, гледзячы некуды ў засмужаную далеч. — Нямашака іх, закадычных сябрукоў, нашых рыбачкоў... Фёдар памёр за тры тыдні перад Вялікаднем. А Ілья — на летняга "Міколу"...

Дамкі стаялі, як і раней. Толькі яны мне падаліся чамусьці меншымі, чым былі некалі. Нібыта ўраслі яны ў зямлю, састарэлі, як быццам і іх сагнула жыццё, і ім цяжка стала жыць без сваіх гаспадароў...

Я падумаў пра сябе: "Быццам бы ніякай значнай падзеі і не адбылося, але яскрава бачыцца мне ў цёмных вокнах Ілы і Фёдара асірацеласць вёскі. Быццам яна, вёска, згубіла ці страціла тое галоўнае і духоўнае апірышча, на якім круцілася, віравала паўсядзённае жыццё вяскоўцаў..."

Адзінае, што сагравала і маю, і людскія душы, дык гэта памяць пра гэтых па-свойму незвычайных і каларытных людзей, якія запалі кожнаму ў сэрца.

Бо сардэчных і добрых людзей мы і памятаем па-харошаму...



Дайце дваццаць пяты кадр!

У сталічных кінатэатрах прайшла прэм'ера мастацкага фільма "Кадэт" вытворчасці Нацыянальнай кінастудыі "Беларусьфільм". Аўтары сцэнарыя (у яго аснове — аповесць Анатоля Жука "Помста матылькоў") Валянціна Бялько, Яўген Амельчанка, Анатоль Жук. Рэжысёр Віталь Дудзін. Аператар-пастаноўшчык Дзмітрый Рудзь, мастак Валерый Юркевіч, кампазітар Уладзімір Кандрусевіч. І ў галоўных ролях, і ў эпізодах здымаліся толькі беларускія акцёры.

Сеанс у кінатэатры "Кастрычнік" сабраў запрошаную публіку. Прыйшлі пісьменнікі, дзеячы тэатра, прадстаўнікі самых розных кінематаграфічных прафесій. А яшчэ — суворaўцы, якіх апошнім часам пачалі называць чамусьці кадэтамі, ды ветэраны і сведкі Вялікай Айчыннай. Гэтай невыпадковай, але стракатай аўдыторыі фільм "Кадэт" быў рэкамендаваны як лепшы прадукт кінастудыі апошняга дзесяцігоддзя і як "вельмі годнае кіно, за якое не сорамна".

Падзеі фільма разгортваюцца на тэрыторыі Заходняй Беларусі ў першае пасляваеннае, але далёка не мірнае для гэтых мясцін, лета. Кадэт, ён жа курсант суворaўскай вучэльні Дзяніс Мяшко, бацькі якога загінулі ў вайну, едзе на вакацыі ў вёску да радні. Радасна спяшаецца знаёмымі сцежкамі, акрылены чаканнем сустрэчы з блізкімі людзьмі, і трапляе... на хаўтуры: забілі яго дзядзьку, першага старшыню сельсавета Сцяпана Мяшко. Злачынца не выкрыты, але ёсць падазроны — аднавясковец Мечыслаў Хабёнак, па-тутэйшаму Метак, хлопец са складанай біяграфіяй, вымушаны хавацца ў лесе яшчэ з вайны. Дзяніс Мяшко, апантаны пачуццём помсты і пошукамі забойцы, сочыць за Ганнай, якая ўпотай сустракаецца са сваім каханым Метакам, але неўзабаве рамантычны кадэт пачынае ўспрымаць яе як дзяўчыну сваёй мары... Клубок стасункаў ды акалічнасцяў спакваля раскручваецца, і ўсе яго нітачкі-лініі вядуць да немінучай крывавай развязкі сюжэта.

У новай стужцы з першых кадраў закладзена дэтэктыўная інтрыга, знойдзеш тут элементы і меладрамы, і трагедыі, і камедыйныя эпізоды, і каліўца іроніі. Такі жанравы мікст і дынамічны мантаж не дазваляюць гледачу расслабіцца. Увагу падтрымліваюць выразныя буйныя планы, дзякуючы якім аддаеш належнае арганічнаму і трапнаму акцёрскаму ансамблю. Вядома, што ў сваіх ранейшых фільмах ("Іван", "Пад небам блакітным", "Птушкі без гнёздаў", "Тры жанчыны і мужчына" ды інш.) В. Дудзін, у адрозненне ад іншых нашых рэжысёраў з маскоўскай адукацыяй, стараўся аддаваць перавагу не расійскім акцёрам, а беларускім. А над "Кадэтам" працавала цалкам свая каманда, без удзелу запрошаных артыстаў. Асноўная сюжэтная нагрузка ўскладаецца на "зорнае трыо" — маладых, яркіх, прыгожых Паліну Сыркіну (Ганна), Андрэя Сенькіна (Дзяніс) ды Руслана Чарнецкага (Метак). Але як узбагачае драматургію кадра мудры позірк Генадзя Гарбука (нават шкада, што яго Юзаф з'яўляецца ў адным-адзінюсенькім эпізодзе). Як уражвае насцярожлівы, часам жорсткі, але незласлівы і высакародны твар спакутаванай трывогаю за сына Хабёнчыхі, чыю ролю сыграла Таццяна Гаркуша. Які пранізлівы маналог выказваюць вочы негаваркой і звонку пакорлівай Дзянісавай бабулі ва ўвасабленні Галіны Кухальскай. Як вымушае артыст Алег Ткачоў разгадваць натуру свайго Чэся, вясковага "актывіста", абцяжаранага асабістымі рахункамі да суседзяў і подлай жыццёвай філасофіяй. Як імкнецца ўнесці цёплыя, душэўныя штрыхі ў партрэт "правільнага" савецкага афіцэра Аляксандр Суцкавер. Як ажыўляюць і разраджаюць напятую атмасферу нейкай прыцішанай, запалоханай вёскі гарэзлівыя грымаскі дасціпных і ўсюдыісных малых...

Прывабнасць кінавідовішчу надаюць не толькі красамоўныя партрэты-характарыстыкі, але і ярка знятыя сцэны, і лаканічныя дэталі (рытмічная, нібы танец, прабежка галоўнага героя басанож па мурожным стракатым кіліме; купанне ў рэчцы; "двубой" і замірэнне Дзяніса ды Ганны пад цікаванне вясковай дзятвы; сталінскія партрэты і непрыстойныя карцінкі пад крысом пінжака ў падпольнага чыгуначнага "карабейніка"; рыжы кот — і сімвал, і гаспадар мірнага жыцця; загрубелыя пальцы, што далікатна абіраюць першыя лясныя суніцы).

Істотная адметнасць новай стужкі, мне падаецца, вось у чым. Тут ці не ўпершыню за ўсю гісторыю беларускага кінематографа, вядомага ў народзе — не сакрэт жа! — як "партызанфільм", прагучаў намёк на грунтоўнае, глыбокае, мудрае і дальнабачнае разуменне пацыфісцкай, міралюбнай, талерантнай сутнасці патрыятызму. Яно высноўваецца з крыху дэкларатыўнай палемікі Дзяніса і Мэтака: патрыёт — гэта перадусім самаадданы і руплівы гаспадар сваёй зямлі, а не толькі ваяр са зброяй; сапраўдны гаспадар павінен трымацца свайго дома. І (цытую рэпліку Метака) "радзіму абараняць — гэта не тое, што страляць у суседа, які думае па-іншаму".

Жыццё, тым больш, калі яно разгортваецца на кінаэкране, — рэч, вядома, парадаксальная. А дзе парадоксы, там і пытанні. Назіраючы за падзеямі фільма "Кадэт", я не магла даўмецца: чаму старшыню сельсавета ва ўмовах заходнебеларускай вёскі, у асяроддзі людзей з каталіцкімі традыцыямі ды адпаведнымі імёнамі, адпявае праваслаўны поп? Чаму салдаты, якія палююць на Мечыслава Хабёнка, дзейнічаюць, нібы спанатраныя сучасныя спецназаўцы падчас паказальных выступленняў, а сцэна захопу заложніка выглядае пародыяй на штамп з галівудскіх баевікоў? Чаму героі фільма размаўляюць на нейкай сяроднестатыстычнай, штучнай, спустошанай рускай мове, у якую зрэдчас укручаны польскія ідыёмы, кшталту "холера ясна"? Нават родная і неўміручая трасянка прагучала б тут з большай шчырасцю. Заўважце: у лепшых расійскіх мастацкіх фільмах пра рускую глыбінку героі ніколі не размаўляюць на мёртвай кніжнай мове, і ў дыялогах заўсёды адчувальны мясцовы каларыт: ці то паволжскі, ці то паўднёварускі, адметная вясковая інтанацыя, дый гаворку гараджан — масквічоў ці піцерцаў — адрозніць можна... Перапрашаю за рэзкасць параўнання, але калі чуеш, як агучаны ігравыя беларускія фільмы з прэтэнзіяй на тутэйшы (каб не сказаць — нацыянальны) каларыт, разпораз узнікае ўражанне, што іх персанажы "спяваюць пад фанеру" або гэта звычайны дубляж.

Той, хто больш-менш сур'ёзна займаецца кіно, ведае пра эфект г. зв. "дваццаць пятага кадра". У чым жа яго сутнасць? Гледзячы на экран, мы свядома ўспрымаем 24 кадры за секунду — менавіта з такой хуткасцю рухаецца кінастужка. Таму калі пры мантажы фільма пасля кожнага 24-га кадра ўстаўляць дадатковы 25-ы кадр з пэўным тэкстам, дык ён будзе ўспрымацца намі ўжо на ўзроўні падсвядомасці. Ніякіх дадатковых карцінак мы не ўбачым, аднак "прыхаваная" ў дваццаць пятым кадры ключавая інфармацыя трапіць напрасткі ў нашу памяць і — трывала прапішацца ў ёй...

Лепш бы не ведаць мне пра гэты кінематаграфічны эфект! А то паглядзела прэм'еру, паапладзіравала, як мае быць, стваральнікам фільма, і не магу пазбавіцца адчування, што бракуе ў ім акурат славутага дваццаць пятага кадра. Гэткага неадчувальнага інфарм-уколу, прышчэпкі да глядацкай падсвядомасці, што засцерагала б ад скептычнага стаўлення да айчыннага кіно, не дазваляла б сумнявацца ў мастацкіх вартасцях новай работы "Беларусьфільма" і спрыяла непахіснай перакананасці: наша — лепшае.

Святлана БЕРАСЦЕНЬ

На здымках: рэжысёр В. Дудзін прадстаўляе на сцэне кінатэатра "Кастрычнік" здымачную групу; за паўгадзіны да сеанса; П. Сыркіна, Р. Чарнецкі, А. Сенькін у фільме "Кадэт".

Фота Віктара Кавалёва

Грані кіно маладога

Наколькі шматграннае наша жыццё, паказалі ўдзельнікі Мінскага адкрытага фестывалю студэнцкага кіно і відэа "Кінагрань". Увесь свет, прапушчаны праз прызму маладога светапогляду. Бязмежжа думкі і фантазіі, вастрыню супярэчнасцяў рэчаіснасці ўвасобілі ў сваіх кінаопусах маладыя рэжысёры. Але гэта датычыць, у большасці, толькі прадстаўнікоў замежных краін. Таму што беларускія рэжысёры ў сваім майстэрстве відавочна ім саступалі.

Трэці год запар прымала гэты фестываль сталіца. І адкрывала новыя імёны тых, хто імкнецца ствараць цудоўны свет кіно. Сёлета ў аргкамітэт было даслана з 30 краін каля 350 работ. З іх толькі 129 удзельнічалі ў конкурсных паказах, размежаваных на міжнародны конкурс "Маладыя прафесіяналы" і нацыянальны конкурс незалежнага і аматарскага кіно. У некаторых стужках адзначалася шмат жорсткасці і бязлітаснасці. І прычына, мабыць, не толькі ў бескампраміснасці творцаў. Кіно ж заўсёды было люстэркам жыцця.

Што датычыць нацыянальнай праграмы... Інтравертнае і мала кім зразуметае кіно нашых суайчыннікаў падалося не вельмі ўдалым. І няхай у выніку адзін з прызёраў прызнаўся, што "хацеў проста пасцябацца", для беларускага дылетанцкага кіно гэта не апраўданне. Слабасць стужак беларускіх аўтараў пацвердзіла і рэжысёр дакументальнага кіно, член журы Галіна Адамовіч. "Такія фестывалі і існуюць для таго, каб назіраць, параўноўваць. Не ведаю, што будзе далей, але беларусам трэба пакуль вучыцца," — зазначыла яна.

Павучыцца, дарэчы, можна было і ў межах фестывальнай праграмы, якая прадугледжвала майстар-класы спецыялістаў у галіне кінематаграфіі і тэлебачання. Ладзіліся імправізаваныя гутаркі з аніматарам Ірынай Кадзюковай, дакументалістамі Міхаілам Жданоўскім і Галінай Адамовіч. У адзін з фестывальных дзён адбылася прэзентацыя кнігі "3500" расійскага кінакрытыка Сяргея Кудраўцава. Але маладыя рэжысёры праігнаравалі досвед прафесіяналаў. І на пытанне спецыялістаў: "Ці ёсць у зале будучыя рэжысёры?" у адказ падымаліся дзве-тры рукі.

Але журы ўсё ж мусіла выбіраць. Прызы атрымалі анімацыі "Іншая" расійскага рэжысёра Ганны Шапілавай і айчынная "Што вечнае?" Валянціна Кукалева; ігравое кіно — "Цішыня" (Ізраіль) і "Знікненне гуку" Яўгена Ісачанкі (Беларусь); эксперыментальнае — нямецкая стужка "Арол" і беларуская "Ногі" Ігната Сідорчыка; дакументальнае "Куды не спяшаецца сонца" (Польшча), "Гродна. Новы свет" Арцёма Лобача. Асаблівую цяжкасць у журы выклікалі музычныя ролікі. "Падпяваць не вельмі хацелася," — заўважыла Людміла Перагудава. Таму прызёр толькі адзін: беларускія "Тры анёлы" Юліі Рудзіцкай. Фаварытам гледачоў стала швейцарская анімацыя "Рана ці позна" пра сапраўдную моц сяброўства. А Гран-пры дастаўся славенскаму рэжысёру за ігравую стужку "Агапе", якая пераконвае, што жаданню кахаць нішто не перашкодзіць.

"Хочацца верыць, што я прысутнічаю пры нараджэнні новай зоркі," — выказаў думку кінарэжысёр Аляксандр Карпаў-малодшы. Што ж, напэўна, нездарма ролік-застаўка фестывалю паказвае чалавека з камерай на плячы, які ідзе ад аднаго будынка да другога па тонкім канаце. І шлях маладых канкурсантаў "Кінаграні" пралягае ад аматарскага да вялікага кіно.

Ганна КАРПУК

Установа адукацыі «Беларуская дзяржаўная акадэмія музыкі»

аб'яўляе конкурс на замяшчэнне пасад (да 5-ці гадоў) прафесарска-выкладчыцкага складу (для тых, хто мае мінскую рэгістрацыю) з далейшым заключэннем кантракту ў выпадку выбрання на тэрмін, вызначаны Наймальнікам:

кафедра філасофіі:
дацэнт — 1 ст.

Натхнёная Флорай

Пра выставу фларыстыкі мастака Святланы Швайбовіч "Кветкі роднай зямлі" ў Барысаўскай ЦРБ імя І. Каладзеева

Многія з нас уяўляюць фларыстыку як вельмі простую забаву: сушы некалькі кветак, кладзі пад шкло — вось і фларыстычная работа. Але фларыстыка даўно перарасла звычайныя засушаныя кветкі. Сучасныя тэхнікі дазваляюць стварыць дзівосны свет, які мы часта бачым за вокнамі, але, на вялікі жаль, не маем магчымасці захаваць у хаце надоўга. Вось такую прыгажосць прыроды, якая здзіўляе і натхняе нас, Святлана ад усёй душы падарыла сваім гледачам.

— *Захапленне фларыстыкай у мяне, можна сказаць, — з дзяцінства, — распавядае С. Швайбовіч. — Я гадавалася ў дзядулі з бабуляй у цудоўным Нарачанскім краі. Кожнае лета бавіла там. І ўся прырода, усе кветкі спрыялі таму, каб захапленне перарасло ў творчасць. Сур'ёзна займацца фларыстыкай я пачала гадоў 5—6 таму, калі ў мяне нарадзілася трэцяе дзіця. Некага гэта здзівіць: маўляў, навошта ёй спатрэбіліся лішнія клопаты? Але менавіта тады я вырашыла: альбо зараз, альбо ніколі. І паціху-паціху пачала вучыцца калажу ў Мінску ў сталічных майстроў. Цяпер ужо займаюся з маскоўскімі мастакамі, якія прыязджаюць і даюць майстар-класы ў Мінску. Такім чынам маё хобі набывае прафесійныя рысы. Гэта мая першая персанальная выстава. Раней выстаўлялася разам з мінскімі фларыстамі. На дасягнутым не збіраюся спыняцца. Цяпер асвойваю новую тэхніку — скраб-букінг. Наогул, сёння фларыстычны калаж — гэта не толькі кветкі, сцяблінкі, травінкі, але і іншыя матэрыялы, неабавязкова прыроднага паходжання. Камень, тынк, шпаклёўка, пясок — усё тое, што мы бачым на вуліцы, у парку, у лесе, літаральна пад нагамі, можна ператварыць у нешта прыгожае. У сваіх калажах я ўжываю змяшаныя тэхнікі. Мастак, які дае нам майстар-класы, працуе больш як у 60 тэхніках! Таму на выставе можна ўбачыць дэлікаманію, батык, ірванную паперу, аўтарскую паперу і г.д. Але часцей за ўсё — гэта змешаныя тэхнікі. Фларыстычны калаж настолькі ўсеабдымны, што проста нельга спыніцца толькі на адной з іх. І тэхнікі развіваюцца, набываюць новыя абрысы.*

На просьбу распавесці пра сябе Святлана Аляксандраўна адказала:

— *Я закончыла барысаўскую 8-ю сярэднюю школу. Пасля заканчэння педагагічнага універсітэта працавала настаўнікам беларускай мовы і літаратуры ў 12-й школе. Пакуль што ў мяне перапынак у педагагічнай дзейнасці, хаця і вяду гурток у дзіцячым пакоі "Світанак" УП "Жылле". Працую адміністратарам у кампаніі "Металкамплект", якая займаецца пастаўкай каляровых металаў, выхоўваю траіх дзяцей. Як ні дзіва, фларыстычны калаж дапамагае мне ў працы. Асабліва ўдзячная майму мужу Георгію Уладзіміравічу: не кожны вытрымае творчага чалавека побач. Тым болей, што мая творчасць не заўсёды прыгожая ў самім працэсе, бо тут і галінкі, пясок, смецце, і не кожны гэта зразумее. Я з задавальненнем вяла б майстар-класы для дзяцей, дый для дарослых. Мая педагагічная сутнасць нагадвае пра сябе: вельмі падабаецца займацца з людзьмі. А самыя ўдзячныя гледачы — гэта ўсё ж такі дзеці.*

Гутарыў Анатоль МАЗГОЎ

На здымках: С. Швайбовіч, "Спадарыня-вясна"; тэатр авангарднага касцюма "Магія" на вернісажы.

Фота аўтара г. Барысаў

Радуемся разам

Уладальнік Гран-пры многіх міжнародных тэатральных фестываляў у Аўстрыі, Беларусі, Германіі, лаўрэат спецыяльнай прэміі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь у галіне тэатральнага мастацтва Рыд Таліпаў — новы мастацкі кіраўнік Нацыянальнага акадэмічнага драматычнага тэатра імя Якуба Коласа. Раней гэты своеадметны і добра вядомы не толькі ў нашай краіне рэжысёр паставіў на віцебскай сцэне такія маштабныя спектаклі, як "Кацярына Іванаўна" паводле Леаніда Андрэева і "Васа" паводле Максіма Горкага. Беларускія тэатралы — у чаканні новых пастановак майстра.

Персанальная выстаўка Наталлі Рачкоўскай, прымеркаваная да яе 60-годдзя, прайшла ў сталічным Палацы мастацтва. "Добра, калі б мы аўтаматычна з цягам часу станавіліся мудрацамі і, нарэшце, разабраліся, які ўплыў робяць месца і час нараджэння, акалічнасці нашага жыцця, музыка, прачытаныя кнігі, сустрэчы, расставанні, меркаванні... Як у гэтым бясконцым хаосе знянацку пачынае гучаць ціхая мелодыя, з якой выкрышталізоўваецца вобраз, ад якога немагчыма пазбавіцца, пакуль ён не выйдзе на плоскасць палатна і не пачне жыць самастойна", — разважае мастачка. Апроч жывапісу, яна займаецца графікай, дэкаратыўна-прыкладнымі жанрамі.

"Мроі-відзежы" — такую назву атрымала выстаўка работ Рымантаса Дыхавічуса, што прайшла ў мінскай галерэі "Мастацтва". Заслужаны дзеяч мастацтваў Літвы і Рэспублікі Паўночная Асеція (Аланія) Р. Дыхавічус — мастак, фатограф, выдавец. "Ён аформіў

дзесяткі кніг. Выстаўляўся ў многіх краінах, у тым ліку ў Літве і ў Расіі, ЗША і Францыі, Польшчы і Арменіі, Украіне і Чэхіі, — зазначае мастацтвазнаўца Галія Фатыхава. — Фотаальбом Рымантаса Дыхавічуса "Кветкі сярод квтетак", выдадзены ў 1987 годзе, абышоў увесь свет і перавыдаваўся чатыры разы. А унікальныя фотакарціны з серыі "Мроі-відзежы", у якіх аўтар стварыў непаўторны свет формы і колеру, падарожнічаюць сёння па выстаўках і галерэях свету".

Да 120-годдзя з дня нараджэння вялікага Чарлі Чапліна Музей гісторыі беларускага кіно наладзіў рэтраспектыўны паказ камедыйных фільмаў з удзелам легендарнага артыста. Праграма, якая працягнецца да 29 мая, уключае амаль паўтара дзесятка стужак, сярод якіх — "Валацуга", "Банк", "Залатая ліхаманка", "Агні вялікага горада".

Пяты раз прайшоў у горадзе на Дняпры "Магілёў-Бахкалегіум" — фестываль музыкі Ёгана Себасцьяна Баха. Свята, арганізаванае па ініцыятыве Магілёўскай гарадской капэлы на чале з Сяргеем Лішчанкам, дасягнула сваёй галоўнай мэты: парадавала публіку жывым гучаннем бахаўскай музыкі, паказала жанравую разнастайнасць творчасці геніяльнага кампазітара, якая сілкуе і сучасныя мастацкія ідэі. У розных залах Магілёва можна было паслухаць камерныя інструментальныя, аркестравыя, вакальна-сімфанічныя творы Баха. Удзельнікамі фестывальнай праграмы былі знаныя айчынныя выканаўцы: арганістка Ксенія Пагарэлая, аркестр і хор Магілёўскай гарадской капэлы пад кіраўніцтвам Сяргея Лішчанкі, Дзяржаўны камерны аркестр Беларусі пад кіраўніцтвам Пятра Вандзілоўскага.

Лана ІВАНОВА

На здымках: рэжысёр Р. Таліпаў; Н. Рачкоўская, "Двое"; на выстаўцы Р. Дыхавічуса.

Фота Кастуся Дробава і аўтара

Класіка on-line

На жаль, большасць людзей уяўляе канцэрт класічнай музыкі як вольны час вузкага кола прыхільнікаў, і асацыіруецца класіка з халодным мігценнем крышталю і чапурыстасцю аксаміту. Такое ўяўленне акадэмічнасці і элітарнасці — вынік, мякка кажучы, "комплексу" поўнай непадрыхтаванасці. Аднак жа не трэба бянтэжыцца перад вялікім светам музычнай класікі, у якім кожны можа знайсці нешта сваё, неабходнае і светлае. Акрамя таго, навука даўно даказала, наколькі класічная музыка карысная для маральнага, душэўнага і фізічнага здароўя. Людвіг ван Бетховен называў музыку "адкрыццём больш сапраўдным, чым уся сусветная мудрасць і філасофія". Нельга не пагадзіцца, калі кожны гук, кожны ледзь адчувальны штрых мелодыі зліваюцца ў цудоўны ручай, які вядзе нас у вытанчаны і пачуццёвы свет шэдэўраў музычнага мастацтва.

Назву "Шэдэўры музычнага мастацтва" атрымаў канцэрт камернага аркестра Гомельскай абласной філармоніі (мастацкі кіраўнік Таццяна Томсан) і заслужанай артысткі Расійскай Федэрацыі, лаўрэата міжнародных конкурсаў, салісткі Валградскага дзяржаўнага тэатра "Царыцынская опера" Ганны Мядзведзевай. У рэпертуары артысткі больш як сотня рамансаў айчынных і замежных аўтараў, некалькі праграм старадаўняй музыкі, папулярных оперных арый, песень рэтра, а таксама этнічная музыка. Ганна яшчэ і запрошаная салістка опернай трупы Вялікага тэатра Расіі, выкладчыца акадэмічнага вакалу, аўтар вучэбна-метадычнай праграмы. А дапамагае ёй вытрымліваць такі хуткі тэмп жыцця агульнавядомы прынцып: чым складаней выглядае мэта, тым больш салодкае яе дасягненне. Як прыклад — двухгадзінны сольны канцэрт у Гомелі.

У праграме былі складаныя для выканання фрагменты з опер Д. Вердзі і В. Беліні, а таксама арыя Франчэскі з оперы "Франчэска да Рыміні" С. Рахманінава. На думку Г. Мядзведзевай, трэба не спяваць, "а перажываць кожны твор on-line". Толькі пры такіх умовах магчыма поўнае раскрыццё ўнутранага стану творчай асобы. "Шэдэўры музычнага мастацтва" — не першая сустрэча спявачкі з нашымі слухачамі. Летась яна ўдзельнічала ў Міжнародным фестывалі мастацтваў "Беларуская музычная восень", у канцэрце салістаў тэатра "Царыцынская опера". Нашу гасцю слухачы зноў прымалі з любоўю і ўдзячнасцю, шматкроць выклікалі артыстку на "біс".

Дэбют камернага аркестра атрымаўся яркі, эмацыянальны, поўны шчырага натхнення. Сонечныя і загадкавыя, сентыментальныя і рамантычныя творы В. А. Моцарта, Ё. С. Баха, Ё. Гайдна, Г. Ф. Гендэля, А. Скарлаці, Д. Качыні, Г. Пёрсела добра прымала публіка. Удалым было і само месца правядзення канцэрта — Калонная зала Палаца Румянцавых і Паскевічаў, якая гасцінна адчыніла дзверы ўпершыню пасля рэканструкцыі.

Яніна ЧАРПУХІНА-АНДРЭЕВА

г. Гомель

Жанчыны і мроі

Апошнім часам у беларускай сталіцы прыкметна актывізавалася мастацка-выставачнае жыццё. Мноства буйных, рэспубліканскай значнасці, а таксама шматпланавых камерных прафесійных вернісажаў, прымеркаваных да розных нагод, арганізуецца ў дзяржаўных і прыватных галерэях, салонах-крамах, музеях горада і грамадскіх установах. Музей сучаснага выяўленчага мастацтва, які абраў сваім дэвізам крылатае лацінскае выслоўе "Ars longa" ("Мастацтва — вечнае"), аператыўна адгукаецца на найноўшыя стылявыя павевы-пошукі як у айчынным, так і ў замежным мастацтвах, трымае ў сваім полі зроку асобы яркіх дзеячаў і адметныя творчыя суполкі, прываблівае аматараў Прыгожага цікавымі канцэптуальнымі праектамі-імпрэзамі. Сярод іх вылучылася вясновая выстаўка "Адзін дзень з жыцця жанчыны: мроі і рэальнасць".

У экспазіцыі "дэбютавалі" першыя самастойныя і арыгінальныя творы 34-х маладых жывапісцаў, графікаў, скульптараў, дызайнераў, нядаўніх выпускніцоў Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў, палова з якіх — таленавітыя дзяўчаты. Хлопцы, відавочна, далікатна, "па-рыцарску" падладжваліся пад агульную жаночую тэматыку, імкнучыся пры гэтым шчыра выказаць уласныя сюжэтамі ды фарбамі павагу і захапленне каханымі, сяброўкамі, калегамі, якія дораць свету аптымізм і натхненне, раўнавагу-гармонію, жыццёвыя сілы.

Цудоўныя, пяшчотныя вобразы на "жамчужных" палотнах А. Даманава "Дзяўчына з яблыкамі" і "Якая чытае ў майстэрні" нечым нагадваюць жывапіскласіку "малых галандцаў", Я. В. Дэльфцкага. Віртуозна выкананыя з мармуру, мякка стылізаваныя партрэты-"накцюрны" сучасніц-прыгажунь — работы студэнткі-скульптара В.Высоцкай. Самабытная жывапісная серыя "казачных" карцін А. Дзямідава ("Гаспадыня", "Сцэна са спектакля"), створаная пад значным уплывам багатых мастацкіх народных, г. зв. лубачных, традыцый. А побач — ужо знаёмая і прызнаная мінчанамі жывапісная мова А. Шлегель (цыкл "Алфавіт") і эратычнасць (падкрэсленая часам, здаецца, неяк недарэчна і спрэчна), уласцівая займальным "пошукавым" творам Г. Сілівончык.

Прыемнай нечаканасцю для наведвальнікаў выстаўкі была маляўнічая экспазіцыя ў экспазіцыі — паказ дызайнерскіх манекенаў паненак-лялек, выкананых выхаванкамі школы-майстэрні І. Ражко.

Аляксандр РУНЕЦ

Фота Кастуся Дробава

Нататкі краязнаўца

З усіх публікацый, прысвечаных гісторыі Гродзенскай абласной бібліятэкі імя Я. Карскага, артыкул С. Міхальчык, змешчаны на старонках гісторыка-дакументальнай хронікі горада Гродна "Памяць" (Мінск, 1999), з'яўляецца, бадай, самым поўным і грунтоўным. Аднак і ў ім ёсць некалькі памылак.

Калі святкаваць нараджэнне?

Так, у самым пачатку артыкула С. Міхальчык піша:

"У верасні 1830 г. Міхаіл Трафімавіч Бабяцінскі, гарадзенскі генерал-губернатар, сабраў на нараду высокапастаўленых асоб для вырашэння пытання аб адкрыцці бібліятэкі ў адпаведнасці з указаннем міністра ўнутраных спраў Расіі. Тут жа было вырашана і пытанне аб першым бібліятэкары. Ім быў назначаны ксёндз Міхаіл Зелянко, які адначасова з'яўляўся прэфектам гімназіі".

На жаль, аўтар не пазначыў крыніцу, адкуль узяты гэтыя звесткі. Аднак тое, што яны не адпавядаюць сапраўднасці, цалкам відавочна. М. Бабяцінскі ніколі не быў гродзенскім генерал-губернатарам, ён быў грамадзянскім. Па-другое, Міхаіла Зялёнку ніхто не прызначаў бібліятэкарам.

Далей С. Міхальчык працягвае:

"17 верасня 1830 г. пасада бібліятэкара была даручана архіварыусу Фаме Красоўскаму. Дарэчы, гэтая дата адзначаецца ў калектыве сучаснай абласной бібліятэкі імя Я. Карскага як дата заснавання гарадзенскай публічнай бібліятэкі".

Варта адзначыць, што факт прызначэння Фамы Красоўскага бібліятэкарам па сумяшчальніцтве яшчэ раз пацвярджае наша меркаванне адносна *"прызначэння бібліятэкарам М. Зялёнкі"*. Акрамя таго, гэты факт ніяк не можа служыць падставай для вызначэння даты арганізацыі бібліятэкі, паколькі самастойнай адзінкі бібліятэкара яшчэ не было. Адсутнічала гэтая адзінка і ў 1831 годзе, калі, паводле сведчання С. Міхальчык, пасаду бібліятэкара займаў другі архіварыус канцэлярыі Фадзей Левановіч.

Каб вызначыць дату заснавання Гродзенскай абласной бібліятэкі, неабходна мець афіцыйны дакумент — загад або дазвол таго ж міністра ўнутраных спраў. А паколькі такі дакумент існуе, то і дата яго з'яўлення павінна стаць датай заснавання бібліятэкі. Аднак з'явіўся гэты дакумент не адразу, не ў верасні 1830 г., а значна пазней. Таму і мы, "чакаючы" яго з'яўлення, звернемся да падзей, што адбываліся напярэдадні.

Сапраўды, 3 верасня 1830 г. грамадзянскі губернатар М. Бабяцінскі сабраў нараду высокапастаўленых асоб губерні, дзе былі агучаны два цыркулярныя прадпісанні міністра ўнутраных спраў А. Закрэўскага ад 5 і 25 ліпеня 1830 года "Пра завядзенне ў губернях публічных бібліятэк для чытання". Пасля гэтага, выслухаўшы розныя прапановы, губернатар Бабяцінскі паведаміў, што для памяшкання публічнай бібліятэкі першапачаткова аддае сярэдні пакой на левай палове дома, які ён сам займае, з дастаўкай неабходнай мэблі з яго ўласнай канцылярыі. А прэфект ксёндз Зялёнка "выявіў жаданне прыняць на сябе званне бібліятэкара".

Акрамя гэтага, губернская камісія пастанавіла: *"Покорнейше просить е. с. министра внутренних дел об учинении с кем следует сношения, чтобы всех сочинений, издаваемых под ведением Виленского университета, а равно и "Литовского курьера" доставляемо было в сию библиотеку по 1 экземпляру"*...

Як бачым, ніякага рашэння нават аб часовым адкрыцці бібліятэкі, а таксама аб прызначэнні М. Зялёнкі бібліятэкарам прынята не было. Ды і не магло быць прынята, таму што шмат было яшчэ так званых арганізацыйных пытанняў, без вырашэння якіх бібліятэка не магла функцыянаваць. Гэтыя пытанні маглі быць вырашаны ў бліжэйшы час. Аднак нечаканыя падзеі 1830-1831 гг., якія шырока разгарнуліся, адсунулі іх вырашэнне на няпэўны тэрмін. Адзінае, што паспелі зрабіць члены губернскай камісіі, — гэта даручыць архіварыусу Фаме Красоўскаму часова выконваць абавязкі бібліятэкара па сумяшчальніцтве, каб своечасова атрымліваць і захоўваць нумары "Коммерческой газеты" і "Горного журнала", якія пачалі паступаць для будучай Гродзенскай публічнай бібліятэкі.

Наступнае пасяджэнне па арганізацыі публічнай бібліятэкі ў Гродне адбылося, верагодна, недзе вясной або летам 1832 года. Пра гэта сведчыць зварот міністра ўнутраных спраў да гарадзенскага грамадзянскага губернатара ад 8 красавіка 1832 года аб правядзенні нарады з губернскімі кіраўнікамі дваранства, дырэктарамі гімназій і ўвогуле ўсімі аматарамі навукі, літаратуры і мастацтва з нагоды абмеркавання арганізацыі бібліятэкі. На жаль, пратакол гэтага пасяджэння не захаваўся. Аднак тое, што яно адбылося і на ім былі вырашаны некаторыя арганізацыйныя пытанні, сумненняў не выклікае. Такія цыркулярныя прадпісанні выконваліся, як мы бачылі, тэрмінова.

Дарэчы, прыкладна ў гэты ж перыяд ці, магчыма, крыху пазней, губернскія публічныя бібліятэкі былі перададзеныя з распараджэння Міністэрства ўнутраных спраў у Міністэрства народнай асветы. Працэдура перадачы бібліятэчных спраў, а таксама іх уважліваe вывучэнне таксама занялі некаторы час. Толькі 25 ліпеня 1834 года на імя гродзенскага грамадзянскага губернатара прыходзіць цыркулярны ліст ад міністра народнай асветы графа С. Уварава: *"... Полагая, что хотя при имеющихся доселе способах не представляется возможности прочно приступить к заведению в Гродно публичной библиотеки, вполне соответствующей своему предназначению; но как, с одной стороны, предварительные к тому распоряжения вами уже учинены...; с другой же, имея в виду, что при одинаковых почти способах в большей части губернских городов России библиотеки усердием и пожертвованиями просвещённого класса жителей и попечительном воздействии местного гражданского начальства уже открыты или предназначены в скором времени к открытию, я представляю усмотрению в. п. открыть библиотеку ныне же в гор. Гродно... <...> по получении от вас уведомления об открытии Гродненской библиотеки распоряжусь доставлением для неё некоторых полезных сочинений из императорских академий наук и Российской, также из книжного магазина Департамента народного просвещения"*.

Мабыць, гэты дакумент, за адсутнасцю іншага, і павінен служыць падставай для высвятлення даты заснавання абласной бібліятэкі імя Я. Карскага ў Гродне. Такім чынам, бібліятэка была адчынена калі не ў жніўні, то ў верасні 1834 г., паколькі, паводле сведчання С. Міхальчык, да 1835 г. была ўжо складзена першая гадавая справаздача, згодна з якой у бібліятэцы налічвалася 234 найменні разнастайных выданняў або 518 тамоў.

Вячаслаў АФАНАСЬЕЎ

P. S. Больш падрабязна пазнаёміцца з прыведзенымі дакументамі можна праз аўтара, нумар тэлефона якога знаходзіцца ў рэдакцыі.

«Зямлі сваёй мы родныя сыны!»

Вырасці б слову майму
Зернем матчынай мовы!
Іван Станкевіч

Беларусь — багатая на пісьменнікаў краіна. Гэта сцвярджэнне ўжо стала аксіёмай. Але нярэдка творчасць пісьменнікаў не выходзіць за межы мясцовасці, у якой яны нарадзіліся ці жывуць. Адна-дзве публікацыі ў рэспубліканскіх часопісах і газетах на год не змяняюць сітуацыі. Але гэта не сведчыць аб тым, што такія пісьменнікі не вартыя ўвагі. У кожным раёне ствараюцца свае летапісы мясцовых літаратараў. Вось і яшчэ адзін штрых да літаратурнай Вілейшчыны.

Мінула больш трох дзесяткаў гадоў, як пайшоў з жыцця паэт Іван Станкевіч. Было яму 27. Гэта ўжо стала нейкай заканамернасцю, што паміраюць здольныя, але не раскрытыя маладыя пісьменнікі. Праводзяцца паралелі з Адамам Гурыновічам, Дзянісам Хвастоўскім...

Што вядома з біяграфіі Івана Станкевіча? Зусім мала. Нарадзіўся Іван Іосіфавіч у 1947 годзе ў вёсцы Папоўка Вілейскага раёна. Пасля заканчэння Нарачанскай сярэдняй школы вучыўся на філалагічным факультэце БДУ. Там пасябраваў з Юркам Голубам, Алесем Жуком... Наведваў літаратурнае аб'яднанне "Узлёт", якім кіраваў Алег Лойка. У 1969 годзе ажаніўся з Алімпіядай Сарокінай. Два гады праслужыў афіцэрам у войску. На тэрмін службы ў Мінску маладой сям'і далі жылплошчу па адрасе вул. Лясная, д. 1, кв. 49. Алімпіяда Уладзіміраўна ў сталіцы працавала ў сярэдняй школе № 115 настаўніцай пачатковых класаў. А ў 1972 годзе Станкевічы прыехалі ў Вілейку. Іван пайшоў працаваць у рэдакцыю раённкі "Шлях Перамогі". Памёр у 1974 годзе. У 1996 намаганнямі сяброў выйшаў яго вершаваны зборнік "Да апошняй маёй пары". Уступ да яго напісаў Юрка Голуб. Каб раскрыць новыя звесткі пра паэта, я патэлефанаваў у Гродна, дзе цяпер жыве Юрый Уладзіміравіч. Мне пашанцавала. Паэт акурат праз дзень збіраўся быць у Мінску. Адгукнуўся на маю просьбу пашукаць фотаздымкі, на якіх ёсць Іван Станкевіч. І прывёз пяць фота. На ўсіх Станкевіч розны. Вось ён стаіць пасярод дзяўчат, відаць, аднакурсніц. На твары — усмешка. На іншым — ён у кампаніі Алеся Жука і Юркі Голуба шпацыруе па парку. З сур'ёзным выглядам. А вось ён у гурце студэнтаў-футбалістаў.

Юрый Уладзіміравіч параіў звярнуцца яшчэ да Алеся Жука. Так і зрабіў. Аказалася, што ў колішняга рэдактара "ЛіМа" захоўваецца архіў Івана Станкевіча, які пасля смерці мужа да пісьменніка прывезла Алімпіяда Уладзіміраўна. Гэта дзве папкі, у якіх сабраны рукапісы вершаў, выразкі з газет і часопісаў з творамі Станкевіча. Тут і пазней аддрукаваныя на машынцы вершы для зборніка "Да апошняй маёй пары". А яшчэ адшукаў там наступны ліст.

"Паважаны тав. Станкевіч!

Рэдакцыя азнаёмілася з рукапісам Вашага зборніка вершаў "Клопат". Зборнік таксама прачытаў член рэдакцыйнага савета паэт Рыгор Барадулін (копію рэцэнзіі дасылаем). Як адзначае рэцэнзент, аснова зборніка ў Вас ёсць. Што цяпер рабіць? Перагледзьце рукапіс, апусціце слабыя вершы, папраўце няўдалыя мясціны, папоўніце новымі творамі і прышліце ў рэдакцыю.

Юрка Голуб і Іван Станкевіч на вайсковых зборах

Жадаем Вам творчых поспехаў".

Такі ліст прыйшоў у жніўні 1971 года за подпісам загадчыка рэдакцыі мастацкай літаратуры выдавецтва "Беларусь" Хведара Жычкі. У сяброў Івана Станкевіча ўжо былі першыя кніжкі. Вось, нарэшце, і ён сабраў вершы ў зборнік. Што ж напісаў Рыгор Барадулін у закрытай выдавецкай рэцэнзіі? Якую ацэнку даў творчасці Івана Іосіфавіча?

"У зборніку здольнага, падкрэсліваю, — здольнага маладога паэта Івана Станкевіча вельмі выразна выяўляюцца недахопы, характэрныя для яго аднагодкаў. Імкненне падкрэсліць эрудыцыю, імкненне падняць, калі не касмічныя, дык хоць сусветныя тэмы прыводзіць да голай рытарычнасці, да самай звычайнай шэрай агульшчыны. Узятыя на пракат сівыя ісціны, вядомыя антычныя вобразы, не прапушчаныя праз прызму ўласнага светаўспрымання, у большасці выпадкаў гучаць проста парадыйна". У канцы рэцэнзент падсумаваў: "Пасля грунтоўнай дапрацоўкі зборнік Івана Станкевіча трэба выдаць абавязкова памерам адзін-паўтара аркуша. У план выдання якога года ўключыць зборнік — справа рэдакцыі.

Яшчэ раз паўтараю: зборнік "Клопат" трэба выдаць".

Але і паэт меў ужо сям'ю. Працаваць з вершамі, відаць, было не так і проста. А можа, і словы Рыгора Барадуліна прыняў занадта балюча. А затым нечаканая смерць. І ўжо сябры праз шмат гадоў заняліся незавершанай справай. Зборнік "Да апошняй маёй пары" увабраў у сябе 42 вершы. Не менш засталося ў рукапісах. Але рэдактары — Юрка Голуб, Алесь Разанаў, Уладзімір Арлоў — выбралі самае "спелае". Спрычыніўся да выдання зборніка і Іван Клімянкоў. Пра што вершы паэта?

Ты, бор,
прыходзіш мне ў сны,
Завеш сягоння
ў адведзіны.
Мой лёс з тваім
Так моцна пераплецены:
Зямлі сваёй
мы родныя сыны!

Іван Станкевіч у вершы "Бор" змог спалучыць любоў да прыроды і да роднай зямлі. Прырода прысутнічае ці не ў палове ягоных вершаў. А як жа іначай. Чалавек, які вырас у вёсцы, проста не можа не любіць лес, рэчку... Цікава паэт у вершы "Землякам" абыграў назвы вёсак Касічы, Кавалі, Муляры, Мечаі. І вобраз маці прысутнічае ў многіх вершах. Жанчына для яго з'яўляецца пачаткам усяго на зямлі.

Жанчына —
першааснова,
Вытокаў усіх пачатак.
Першае матчына слова
З яшчэ невядомых
частак
Вырасце ў мову
матчыну.
Першых далоняў дотык,
Як ласку,
бяром у спадчыну,
Каб людзям дарыць
яе потым.

Увогуле, цытаваць вершы Івана Станкевіча са зборніка "Да апошняй маёй пары" можна доўга. Што ні верш, то знойдзецца страфа ці радок, якім хочацца падзяліцца з іншымі. Так і павінна быць з сапраўднай паэзіяй.

У 2003-м выйшла анталогія паэзіі XX стагоддзя "Краса і сіла". Там надрукаваны вершы Станкевіча "Сонца піло ваду", "Успамін дзяцінства", "Праметэй". У 2005-м да 60-годдзя раённай газеты "Шлях Перамогі" выйшаў зборнік артыкулаў супрацоўнікаў выдання пад назвай "Вяртанне". Ёсць там і тэкст "Палымяная маладосць" Івана Станкевіча. Зараз рыхтуецца да друку грунтоўная кніга пра літаратуру Вілейшчыны, складзеная Розай Шэрай. Знайшлося месца ў кнізе і ягоным вершам. Мо адзін з рэспубліканскіх літаратурна-мастацкіх часопісаў дасць нізку з раней не друкаваных твораў? А там, глядзіш, да 65-годдзя Івана Іосіфавіча з'явіцца асобная кніга, якая ўбярэ ў сябе ўсю літаратурна-публіцыстычную спадчыну паэта.

Сяргей МАКАРЭВІЧ

Чарнобыль — кветка горычы і болю

Пра тое, як вырашаюцца праблемы рэабілітацыі забруджаных тэрыторый, сацыяльнай абароны пацярпелых грамадзян і пра многае іншае нам распавёў начальнік Дэпартамента па ліквідацыі наступстваў катастрофы на Чарнобыльскай АЭС Міністэрства па надзвычайных сітуацыях Уладзімір ЧЭРНІКАЎ.

— Уладзімір Аляксандравіч, якія асноўныя вынікі намаганняў нашай краіны ў супрацьстаянні радыеактыўнаму забруджванню значнай часткі яе тэрыторыі?

— За 23 гады зроблена шмат. Створана адпаведная нарматыўная прававая база, завершана перасяленне грамадзян з найбольш забруджаных тэрыторый. У чыстых раёнах рэспублікі ўзведзены 239 пасёлкаў для перасяленцаў з неабходнай інфраструктурай, пабудавана звыш 66 тысяч катэджаў і кватэр.

У краіне створана эфектыўная сістэма радыеэкалагічнага маніторынгу і радыяцыйнага кантролю. У Гомельскай і Магілёўскай абласцях праведзена пераспецыялізацыя 46 найбольш забруджаных сельскагаспадарчых прадпрыемстваў, забяспечана належнае ўтрыманне тэрыторый зоны адсялення.

З мэтай захавання здароўя падрастаючага пакалення ажыццяўляецца масавае санаторна-курортнае лячэнне і аздараўленне дзяцей і падлеткаў, што пражываюць на забруджаных тэрыторыях.

Але нягледзячы на дасягнутыя вынікі, праблем яшчэ нямала, таму што на 20 працэнтах забруджанай тэрыторыі Беларусі пражывае больш 1,3 млн. чалавек.

— Па самых прыблізных падліках, колькі яшчэ спатрэбіцца часу для поўнай рэабілітацыі пацярпелых тэрыторый?

— Як вядома, перыяд паўраспаду цэзія-137 складае каля 30 гадоў. На працягу наступных 30 гадоў распадзецца яшчэ палова ад той яго часткі што засталася. Прыкладна такі ж перыяд паўраспаду і ў стронцыя-90. Такім чынам, поўнае "знікненне" цэзія-137 і стронцыя-90, якія распаўсюджаны на значных тэрыторыях Рэспублікі Беларусь і складаюць найбольшую небяспеку, — працэс доўгі і зойме не адно дзесяцігоддзе. Значна больш працяглыя перыяды паўраспаду ў трансуранавых радыенуклідаў — плутонія-238, 239, 240.

Другі аспект — уплыў радыенукліднага забруджвання на здароўе людзей.

Навукоўцы ўсяго свету дагэтуль не маюць адзінага пункта гледжання па дадзеным пытанні, за выключэннем, мабыць, прызнання залежнасці рака шчытападобнай залозы і некаторых сардэчна-сасудзістых захворванняў. Медыцынскія даследаванні ў гэтых і іншых кірунках працягваюцца.

— У сувязі з сусветным эканамічным крызісам паўстае заканамернае пытанне аб фінансаванні рэспубліканскіх і міждзяржаўных праграм па пераадоленні наступстваў чарнобыльскай катастрофы. Фінансаванне якіх кірункаў дзейнасці плануецца часова прыпыніць?

— У выпадку неспрыяльнага развіцця эканамічнай сітуацыі ў рэспубліцы аптымізацыя выдаткаў дзяржаўнага бюджэту магчыма. Аднак, падкрэслю, такія меры будуць абгрунтаваны. Нам вядома, напрыклад, што скарачэнне фінансавання чарнобыльскіх мерапрыемстваў у аграрным сектары Украіны прывяло да значнага росту вытворчасці прадукцыі, забруджанай радыенуклідамі. А гэта недапушчальна.

З нашага пункта гледжання магчыма аптымізацыя фінансавання сістэмы радыяцыйнага кантролю, капітальнага будаўніцтва. Пры гэтым скарачэнне фінансавання не закране сацыяльнай сферы, ільгот і кампенсацый.

У бягучым годзе не чакаецца скарачэння фінансавання і даволі ёмістай Праграмы сумеснай дзейнасці па пераадоленні наступстваў Чарнобыльскай катастрофы ў рамках Саюзнай дзяржавы на 2006—2010 гады.

— Дзеючая Дзяржаўная праграма па пераадоленні наступстваў катастрофы на ЧАЭС завяршаецца ў 2010 г. Што будзе рабіцца ў наступны перыяд?

— Сёлета ў лістападзе навукоўцы і органы дзяржаўнага кіравання павінны ўнесці на разгляд урада канцэпцыю новай Дзяржаўнай праграмы на 2011—2015 гады і да 2020 года. Зараз праводзіцца грунтоўны аналіз эфектыўнасці рэалізаваных рэабілітацыйных мерапрыемстваў, вызначаюцца асноўныя задачы і прыярытэтныя кірункі дзейнасці.

— Чым адрозніваецца закон "Аб сацыяльнай абароне грамадзян, пацярпелых ад наступстваў катастрофы на Чарнобыльскай АЭС і іншых радыяцыйных аварый", які ўступае ў сілу з 15 ліпеня 2009 г., ад папярэдняга?

— Прыняты закон аб'ядноўвае ўсе дзеючыя ў рэспубліцы нормы ў галіне сацыяльнай абароны грамадзян, пацярпелых ад катастрофы на Чарнобыльскай АЭС, іншых радыяцыйных аварый, гэта значыць, ён заканадаўча замацоўвае той узровень сацыяльнай абароны, які дзейнічае сёння. Ён не прадугледжвае новых ільгот і кампенсацый.

З прыняццем новага закона больш выразнай і лагічнай стала сістэма ўстанаўлення прычыннай сувязі інваліднасці з катастрофай на Чарнобыльскай АЭС. Гэта будзе дзейсны закон.

— Бясспрэчна, немалаважнае значэнне мае супрацоўніцтва з найбольш пацярпелымі ад наступстваў Чарнобыльскай катастрофы дзяржавамі — Расіяй і Украінай. Раскажыце, калі ласка, як усталёўваецца супрацоўніцтва з суседзямі.

— Найперш трэба адзначыць, што ў Беларусі, Расіі і Украіне ажыццяўляюцца нацыянальныя праграмы па пераадоленні наступстваў катастрофы на Чарнобыльскай АЭС.

Супрацоўніцтва Рэспублікі Беларусь з Расійскай Федэрацыяй у галіне постчарнобыльскай рэабілітацыі вядзецца з 1998 года. У рамках Саюзнай дзяржавы ўжо рэалізаваны дзве праграмы. У цяперашні час выконваюцца мерапрыемствы, прадугледжаныя 3-й праграмай.

Што ж тычыцца супрацоўніцтва з Украінай, то ў 1997 годзе ўступіла ў сілу бестэрміновая дамова паміж Урадам Беларусі і Урадам Украіны аб сумесных дзеяннях па мінімізацыі наступстваў Чарнобыльскай катастрофы. Беларускі бок заўсёды праяўляе адкрытасць і гатоўнасць да развіцця партнёрскага ўзаемадзеяння з украінскімі калегамі, прадстаўляе ім неабходную інфармацыю.

— Якія тэндэнцыі развіцця супрацоўніцтва з міжнароднымі партнёрамі?

— Як вядома, на 62-й сесіі Генеральнай Асамблеі ААН прынята ініцыятыва беларускага боку аб умацаванні міжнароднага супрацоўніцтва і каардынацыі намаганняў па вывучэнні і мінімізацыі наступстваў Чарнобыльскай катастрофы, а таксама рэалізацыя прапановы мінскай Міжнароднай канферэнцыі 2006 года аб абвяшчэнні "Дзесяцігоддзя адраджэння і ўстойлівага развіцця рэгіёнаў, пацярпелых ад катастрофы на Чарнобыльскай АЭС" (2006—2016 гг).

У рамках міжнароднай ініцыятывы паспяхова рэалізавана Праграма CORE "Супрацоўніцтва для рэабілітацыі", мерапрыемствы якой ажыццёўлены ў Брагінскім, Слаўгарадскім, Столінскім і Чачэрскім раёнах.

Актыўна развіваецца супрацоўніцтва з навукоўцамі цэнтраў і інстытутаў па радыяцыйнай абароне і ядзернай бяспецы Францыі і Нарвегіі па вывучэнні ўздзеяння радыеактыўнага выпраменьвання на чалавека і памяншэння радыяцыйнай рызыкі насельніцтва, якое пражывае на забруджаных тэрыторыях.

У Беларусі рэалізуюцца чарнобыльскія праекты МАГАТЭ, сумесныя ініцыятывы па паляпшэнні радыеэкалагічнай сітуацыі ў пацярпелых раёнах.

Гутарыла
Ілона КУПРЭЙЧЫК

Крызіс. Горш за эканамічны!

Што з намі адбываецца? Мы ў гэтым вірлівым жыцці пагублялі гонар, сумленне, годнасць, прынцыповасць ды іншыя духоўныя якасці, што з сівых стагоддзяў былі спрадвечнымі каштоўнасцямі чалавецтва і якія складаюць прастору духоўнасці і яе чысціні. Бачым дурны густ, брыдкаслоўе, якія ўсё больш падштурхоўваюць наша грамадства ўніз. Чаму вульгарнасць у нас стала нормай, якой мы выхоўваем нашых дзетак? Як выратаваць нас ад дэградацыі і крызісу бездухоўнасці?

...Штосьці горача абмяркоўваюць падлеткі на двары — амаль кожнае слова ў іх непрыстойнае, пахабнае, а побач гуляюць яшчэ меншыя дзеці. Незайздросная будучыня падрастае! Ад акселератаў і акселератак, якія віртуозна валодаюць "чорным" словам, тут можна пачуць такое, што і прысніцца не магло недасведчаным работнікам дарэвалюцыйнага гужавога транспарту і так званым біндзюжнікам і прадстаўнікам крымінальных груповак. Падрастаючае пакаленне праяўляе вялікую цікавасць да гэтага "забароненага плода", гісторыя якога старажытная, як сам свет...

Раней толькі мужчыны ўжывалі мат, а жанчыны — сваім непрыяцелям пасылалі праклёны. Згодна з народным павер'ем, чалавек, які брыдкасловіць, абражае не столькі маці субяседніка, колькі сваю ўласную. Нават існуе легенда пра паходжанне мацяршчыны: чалавек, якога паблытаў д'ябал, забіў свайго бацьку і ажаніўся з маці — менавіта з таго часу і пайшла так званая мацерная лаянка. У народнай традыцыі недапушчальнай лічылася лаянка на жанчыну — пад ёй з-за гэтага будзе гарэць зямля-матухна. Асабліва нашы продкі асуджалі ўзаемную лаянку жанчын. Лічылася таксама небяспечным лаяцца на дзяцей — інакш на тым свеце дзеці адвернуцца ад маці, якая на іх лаялася, не пазнаюць яе. Бацькоў жа, якія такім чынам клянуць сваіх дзяцей, чакаюць смяротныя пакуты, на іх асуджана і само дзіця. Аблаянае дзіця могуць забраць злыя сілы. Забаранялася лаяцца і на свойскую жывёлу — пры выпасе, даенні, на вадапоі. Лаянка прыцягвала хваробы не толькі хатніх, але і дзікіх звяроў — гэта добра ведалі нашы продкі-паляўнічыя. Ні ў якім выпадку нельга было лаяцца ў хаце, пры абразах, каля печы. Памятаю, як пачуў ад сваёй бабулі Таццяны такую прымаўку: "Сказала б, ды печка ў хаце"... Меркавалі, што мат вельмі не падабаецца дамавіку. Баючыся лесавіка, не лаяліся ў родным лесе, баючыся палевіка — не лаяліся ў полі. Нашы культурныя продкі лічылі, што брыдкія словы прыцягваюць нячыстую сілу, а ў хату, дзе людзі лаюцца, пранікаюць беды. Анёлы ж, наадварот пакідаюць такое жытло.

Да таго ж лаянка заўсёды змяшчае пажаданне зла, а словы, як вядома, маюць здольнасць матэрыялізавацца ў быце.

Сёння ж, на пачатку XXI стагоддзя, мацюкі, на жаль, сталі масавай з'явай. Лаюцца ўжо і ў дзіцячых садках, і ў пачатковай школе. Больш за тое, чалавек, які не ўжывае брыдкіх слоў, выглядае для многіх дзіўным і падазроным, амаль што вар'ятам, у якога не ўсе дома... Аднак у яго якраз наадварот — усе дома і ўсё выдатна з духоўнай культурай. Чаму ж мы на такіх не хочам раўняцца? У нашых ВНУ вучацца студэнты з многіх краін, і з усіх рускіх слоў у першыя дні вучобы на нашай зямлі яны хутчэй за ўсё засвойваюць менавіта ненарматыўную лексіку — значыць, глеба для гэтага спрыяльная.

Раней наіўна меркавалася, што мат жыве выключна ў цёмных падвалах і брудных падваротнях. Час гэты незваротна мінуў! Мацюкі ўжо даўно ўтульна пачуваюць сябе ў рэспектабельных кабінетах, сучасна абстаўленых кватэрах, у асабістых і службовых аўтамабілях. Пра грамадскі транспарт і гаварыць не даводзіцца. На жаль, брыдкаслоўе адкрыта і шматаблічна прысутнічае на стадыёнах, за кулісамі тэатраў, а то і на сцэнах, у закрытых і адкрытых клубах і сакрэтных лабараторыях. Яно на кароткай назе з людзьмі паважанымі, якія займаюць адказныя пасады ў эканоміцы, навуцы, **культуры** (выдзелена мною. — **К. К.**)

І нікому чамусьці не соромна! Нікога гэта не хвалюе і не абурае. Я вельмі рэдка чую, каб хто-небудзь каго-небудзь дзе-небудзь хоць трошкі прысароміў за паганыя словы. Раней гэтую функцыю добраахвотна выконвалі бабулькі на лаўках, пажылыя жанчыны, старыя са свежай газеткай у кішэні. Цяпер такіх неабыякавых з гушчы народа няма. Зараз нават многія настаўнікі спакойна праходзяць міма, калі вучні лаюцца і кураць, п'юць піва каля роднай школы...

Калі так пойдзе і далей, дык і ніякі "пік-пік" у тэлевізары не спатрэбіцца, а мат атрымае юрыдычныя правы літаратурнага грамадзянства. Ужо выдадзена шмат твораў з пачварным брыдкаслоўем, ужо сёння яно пакрыху адваёўвае месца пад сонцам побач з прыгожай славеснасцю, прабіраецца на тэатральныя падмосткі і на экраны. Пакуль яшчэ ў касцюме простай, але даходліваі, грубай, сакавітай народнай мовы. І пад прыкрыццём лозунга аб праўдзівым паказе нацыянальнай рэчаіснасці.

Можна, канечне, гаварыць сёння пра недастаковы ўплыў сям'і, школы, працоўных калектываў на цяперашняе пакаленне. Толькі ці варта? Можа, лепш наогул не гаварыць? Хаця б тых слоў, якія раней было не прынята ўжываць сярод нармальных людзей. Проста не вымаўляць іх у штодзённым жыцці і іншым не дазваляць! Уласна кажучы, нічога для гэтага не трэба. Ні капітальных укладанняў, ні асаблівых пастаноў. Затое наколькі паветра, якім мы дыхаем, стане чысцей, як пахарашэюць адразу людзі навокал. І як пахарашэем мы самі! Дробязь, здаецца, а жыццё зменіцца абавязкова да лепшага! Не верыце?

Давайце ж жыць без брыдкай лаянкі! Давайце ж казаць толькі добрыя і прыгожыя слоўцы! І не будзем чакаць, пакуль эпідэмія вульгарнасці і бескультурнасці цалкам знішчыць наша духоўнае здароўе!

Канстанцін КАРНЯЛЮК

Энцыклапедыст — трапна сказана

З Анатолем Валахановічам знаёмы яшчэ з тае пары, калі мы працавалі літаральна праз вуліцу: ён у Акадэмічным выдавецтве "Навука і тэхніка" загадваў рэдакцыяй гісторыі і права, а я — рэдактарам у "Мастацкай літаратуры" ў суседнім Доме друку. Бачыліся сяды-тады, бо я часам заходзіў у рэдакцыю акадэмічнага выдавецтва, дзе таксама рэдактарам працаваў мой сябра і зямляк (па былой Баранавіцкай вобласці) Аляксей Пякарскі, сам са Слоніма, добры сябра паэта Алега Лойкі, таксама слонімца, праз якога я і пазнаёміўся з Пякарскім. Вось такі жывы ланцужок...

Мы, як рэдактары, хоць і рознага профілю, дзяліліся навінамі, расказвалі, што цікавага рэдагуем, як шэнціць на аўтараў. Пякарскі быў чалавекам з характарам, адных ён хваліў — таго ж Грыцкевіча, Ермаловіча ці Біча, а некаторых, ужо нават вядомых гісторыкаў ці юрыстаў, страшэнна крытыкаваў, асабліва за іх афіцыёзную пазіцыю, далёкую ад ісціны. Але дзіва дзіўнае, своеасаблівую задзірыстасць Пякарскага ўмеў ураўнаважваць якраз ягоны шэф — Анатоль Валахановіч, гісторык па адукацыі і ўжо вядомы журналіст, краязнаўца, які дагэтуль працаваў у БелСЭ. Пякарскі ж, бачыў я, вельмі прыслухоўваўся да думкі ці парады Анатоля Іосіфавіча, хоць часам мог і паспрачацца, бо рэдагаванне — няпросты творчы працэс, і непазбежныя сутыкненні думак бываюць нават вельмі карысныя.

...Прашумелі, праляцелі гады, і мы ўжо сталі пенсіянерамі, сяды-тады бачымся, сустракаемся на якіх імпрэзах ці хоць на прыпынках. Шэрагі нашы пачалі радзець. Давялося мне праводзіць у апошнюю дарогу сваіх добрых сяброў-слонімцаў Аляксея Пякарскага і Алега Лойку, аднаго раней, другога — нядаўна. Сумна, горка і балюча. Але што зробіш? А той, хто застаўся ў страі, хто маладзейшы па ўзросце, той, як і раней, грунтуючыся на ўжо зробленым, вядзе сваю лінію жыцця, памнажае свае добрыя, грамадству на карысць, справы. Так і карціць тут, каб хоць збольшага прасачыць творчы шлях Анатоля Валахановіча і расказаць пра яго творчыя набыткі. Зроблена, між іншым, шмат, і дагэтуль рука яго застаецца трывалаю, а зрок — вострым, ён не спыніўся ў сваіх пошуках.

Працуючы ў "Беларускай Савецкай Энцыклапедыі" (1968—1975), Анатоль Іосіфавіч надзвычай актыўна ўключыўся ў працу па пошуку новых звестак з біяграфій тых ці іншых герояў нашай гісторыі, як вядомых, так і напаўзабытых ці невядомых зусім. І тут ён паказаў сябе добрым архівістам, шукальнікам папяровых скарбаў, адкрыў для нашага чытача шмат невядомых герояў, шмат новых фактаў з жыцця людзей, якіх, здавалася, мы ўжо ведалі да драбніц.

Пералічваць імёны ці назвы артыкулаў, магчыма, не дужа плённы занятак для аўтара газетнага артыкула, але што да Анатоля Валахановіча, то толькі ўжо звычайны пералік ягоных публікацый для чалавека дасведчанага так шмат гаворыць пра асобу навукоўцы. Зрэшты, красамоўная лічба: ён — аўтар звыш 450 навуковых і навукова-папулярных артыкулаў для энцыклапедычных тамоў, розных зборнікаў, часопісаў і газет. Вось толькі некаторыя з іх — пра М. Ермаловіча, С. Шушкевіча, М. Улашчыка, К. Каганца, Г. Каханоўскага, Ул. Крыловіча, Б. Тарашкевіча, Ф. Аляхновіча, Д. Набароўскага, графаў фон Гутэн-Чапскіх, дваран братоў Дыбоўскіх, паноў Багдашэўскіх, Пашкевічаў...

Шмат яго артыкулаў змешчана ў кнігах "Памяць" — Дзяржынскага, Старадарожскага, Чашніцкага, Клічаўскага, Бабруйскага, Баранавіцкага, Кобрынскага і іншых раёнаў, а таксама горада Мінска.

Дзіву даешся, колькі стварыў Анатоль Іосіфавіч навуковых, навукова-папулярных артыкулаў і кніжак, якія пашырылі наш кругагляд, далі мажлівасць зазірнуць у далёкае і недалёкае мінулае тых ці іншых гарадоў, паселішчаў, гістарычных мясцін роднага краю. "Дзяржынск: Гісторыка-эканамічны нарыс" (1977), "Дзяржыншчына: Мінулае і сучаснае" (у сааўтарстве з А. М. Кулагіным, 1986), "Партызанскі генерал з Амерыкі" (пра начдыва І. Я. Трацяка, 1995), "Споведзь у надзеі застацца жывым: Аўтабіяграфія Браніслава Тарашкевіча" (у сааўтарстве з У. М. Міхнюком, 1999), "Графы фон Гутэн-Чапскія на Беларусі" (2003), "Яго чакала Беларусь чатыры стагоддзі. Зборнік матэрыялаў і дакументаў да 85-годдзя з дня нараджэння Міколы Ермаловіча" (2007), "Путчынскі сельскі Савет: Гістарычны нарыс" (серыя "Летапіс Дзяржынскага раёна", 2005) — гэта толькі некалькі з ліку адметных выданняў.

Вядомы Анатоль Валахановіч і як празаік, хоць напісаў не шмат (мо лепш сказаць: надрукаваў) — не дае разгарнуцца яго захопленасць навуковай, пошукавай працай. Але трэба спадзявацца, што аматары прозы яшчэ будуць мець не адну сустрэчу з ім на старонках часопісаў і кніжак.

На парозе выдання знаходзяцца такія кнігі Анатоля Валахановіча, як "Бараўскі сельскі Савет: Гістарычны нарыс серыі "Летапіс Дзяржынскага раёна", "Адукацыя на тэрыторыі Дзяржынскага раёна: з часоў старажытнасці да нашых дзён", зроблены камп'ютэрны набор кніг "Жёны Максима Горького" і "Забойства Вільгельма Кубэ: міфы, легенды, рэальнасць".

А зусім нядаўна ў газеце "Наша слова" друкаваўся вялікі нарыс Анатоля Валахановіча пад назваю "Рудольф Гес". Аказваецца, аўтару давялося служыць у войсках сувязі Групы савецкіх войск у Германіі, адзін час іх падраздзяленне несла службу па ахове турмы, у якой адбываў сваё пажыццёвае зняволенне паплечнік фюрэра Рудольф Гес...

Постаць 70-гадовага Анатоля Валахановіча — прыклад сапраўднага энцыклапедыста (менавіта гэткае "сур'ёзнае" слова найчасцей адрасуюць Анатолю Іосіфавічу). Дужа хочацца, каб тое, што ім яшчэ задумана, перайшло, лягло на паперу і, як тое зерне, прарасло і стала здабыткам нашай гісторыі, літаратуры, культуры.

Уладзімір ДАМАШЭВІЧ

Нечаканае знаёмства

Наша першая тэлевізійная зорка, народная артыстка Беларусі Зінаіда Бандарэнка пачынала свой творчы тэлевізійны ўзлёт у 1959 годзе як дыктарка Гомельскай абласной студыі. З 1976 года — яна ўжо на чале сталічнага дыктарскага гурта. Без перабольшання можна сказаць: у яе жыцці адбілася ўся гісторыя Беларускага тэлебачання. Усё яе жыццё прайшло перад тэлекамерамі. Доўгія гады ні адно дзяржаўнае свята не абыходзілася без рэпартажаў Зіны Бандарэнкі.

Не ўяўляецца жыццё Зіны Бандарэнкі і без літаратурных праграм. Яшчэ ў школьныя, гомельскія, гады яна літаральна жыла нашай класічнай паэзіяй. Ужо тады равесніцы называлі яе "нашай артысткай". А далей — болей! Тэлевізія зблізіла яе шмат з якімі карыфеямі нашай літаратуры. Прынамсі, з Піменам Панчанкам, Анатолем Астрэйкам, Міколам Аўрамчыкам, Рыгорам Барадуліным, Алесем Бачылам, Анатолем Вялюгіным, Нілам Гілевічам, Анатолем Вярцінскім, Васілём Зуёнкам, Уладзімірам Някляевым... Некаторыя з іх, напрыклад, Анатоль Вярцінскі, прысвяцілі нашай тэлевізійнай зорцы свае паэтычныя радкі.

Былі ў яе стасункі з маладзейшымі літаратарамі, прынамсі, з Анатолем Сысам: "Я ўжо працавала ў Мінску, — згадвае Зінаіда Аляксандраўна, — дыктараў-жанчын у нас было ўдосталь, а вось дыктараў-мужчын не ставала. Пачалі ездзіць па абласных студыях і там прыкідваць, каго б з тутэйшых мужчын завербаваць на рэспубліканскае тэлебачанне. І аднаго разу з Галінай Сядзельнікавай паехалі ў Гомель і з экрана абласнога тэлебачання абвясцілі конкурс на дыктараў сярод мужчын. У прызначаны дзень пачалі прыходзіць да нас прэтэндэнты. Кожны з іх стараўся паказаць сябе як мага найлепей. А нас цікавіла тады найперш мова, дыкцыя. І вось аднаго разу на праслухоўванне прыходзіць даўгавязы і з гэтага трохі няўклюдны юнак і кажа: "Я яшчэ вучуся. Пішу вершы. Можа, і я вам прыдамся. Паслухайце мяне". І пачаў чытаць. Ой, што гэта было за чытанне! Вочы свяціліся, увесь гарэў. Але гэта было аўтарскае чытанне. Пранікнёнае, эмацыйнае, але не дыктарскае. Бракавала крыху і дыкцыі, артыкуляцыі. На дыктара Анатоль яўна не цягнуў, але пакінуць яго па-за тэлевізіяй не хацелася, і мы запрасілі яго ў Мінск. Тут яго залічылі — кім вы думаеце? — кабельным майстрам, гэта значыць, цягаць-перамяшчаць кабелі на тэлевізійных здымках. І ён часта заходзіў да нас у дыктарскую, смакаваў з намі нашу мову, натхняў нас на працу, пісаў мне лісты з сваёй роднай вёскі Гарошкаў, — Зінаіда Аляксандраўна задумалася, памаўчала і дадала: — Гэтак мы жылі, не цураючыся ніякай працы, абы жыло роднае тэлебачанне ды родная мова на ім".

Уладзімір СОДАЛЬ

Да 70-годдзя ўз'яднання Беларусі

На вуліцы 17 Верасня

У Брэсце на вуліцы Савецкіх пагранічнікаў, у доме № 34, размешчаны Дзяржаўны архіў Брэсцкай вобласці. Шмат таямніц ранейшых часоў зберагаюць яго сховішчы. Ды і сам будынак гістарычны: тут, на былой Беластоцкай, у 20—30-я гады месцілася тайная польская паліцыя. Яе галоўнай задачай было высочваць "нядобранадзейных". Таму дзіўна, што зусім непадалёку ад паліцэйскага будынка (на сённяшняй вуліцы 17 Верасня) шмат гадоў праіснавала падпольная друкарня. Рэвалюцыянеры дзёрзка ўладкавалі яе літаральна амаль пад самым носам у паліцэйскіх, пра што нагадвае мемарыяльная шыльда: "На гэтым месцы ў падвале кватэры члена КПЗБ Валошкі І. у 1925—1938 гг. працавала падпольная друкарня ЦК КПЗБ, якая выпускала палітычную літаратуру на пяці мовах".

Увесь час гаспадаром друкарні (ці, як тады казалі, матрыцарні) быў наш зямляк Іван Раманавіч Валошка (1898—1966). Ён нарадзіўся восенню 1898 года ў Рачках, але 17-гадовым юнаком вымушаны быў пакінуць родныя мясціны, ратуючыся ад полымя бязлітаснай вайны. Першая сусветная многіх беларусаў ператварыла ў бежанцаў. Праз пяць гадоў, вярнуўшыся да роднага жытла, Іван не пазнаў сваёй вёскі, разбуранай германскімі салдатамі. Ён адчуў невыносны цяжар, што раптам лёг на плечы: у сям'і чацвёра дзяцей, голадна, бясхлебна... У спадзяванні знайсці працу сялянскі сын падаўся ў Брэст-Літоўск. Знаёмых не меў, грошай — таксама, дый горад сустрэў адразу няветліва: і без Валошкі хапала беспрацоўных.

Начаваў Іван на вакзале, на сенавалах, на беразе Мухаўца, пакуль не ўладкаваўся вартаўніком у гімназіі, што месцілася на другім паверсе дома купца Бірштэйна. Дапамаглі Валошку сябры Камуністычнай партыі Заходняй Беларусі. У падвале будынка знаходзіліся кантора і склад для паперы і канцылярскіх рэчаў. Там Іван і атрымаў пакойчык, які неўзабаве стаў месцам сустрэч камуністаў. У 1923 годзе Валошка далучыўся да КПЗБ. А ў канцы кастрычніка наступнага года пачаў уладкоўваць друкарню. Атрымаўшы чарцёж і парады, ён распачаў рызыкоўную справу. Патрабавалася выкапаць каля 9 кубічных метраў зямлі. Пры гэтым — ніякіх гукаў лапаты і сякеры, ніякіх людзей побач... І глебу трэба было выносіць непрыкметна: у кішэнях, чайніках ды вёдрах з вадой, каб не выклікаць аніякіх падазрэнняў у паліцэйскіх, шпіёнаў. Праца цягнулася мо паўгода.

Па заданні акружнога партыйнага тэхніка Жукоўскага-Зільберга з Вільні ў Брэст прыехаў слесар Натан Соган, які наладзіў работу матрыцарні. Соган быў сапраўдным майстрам з "залатымі" рукамі, ён здолеў нелегальна прывезці часткі друкарскага станка, пранесці іх у падвал і ўстанавіць без адзінага гуку!

Але майстар паехаў, а гаспадар пакойчыка застаўся... За пятнаццаць гадоў не меў ні дня, ні ночы спакою. З Вільні прывозіліся матрыцы, па якіх рабіліся алавяныя адліўкі, потым друкаваліся лістоўкі, цыркуляры брэсцкіх партыйных органаў на пяці мовах (беларускай, рускай, польскай, украінскай, яўрэйскай).

У Брэсцкай падпольнай друкарні, між іншым, з'явіўся ў 1935 годзе даклад Георгія Дзімітрава для VII кангрэса Камуністычнага Інтэрнацыянала. Друкарня працавала да 1938-га. Валошка захоўваў яе абсталяванне ажно да прыходу Чырвонай Арміі. Але завяршэнне гэтай гісторыі сталася зусім не гераічным.

Калі 22 верасня 1939 года горад быў вызвалены, Валошка звярнуўся да чырвонаармейцаў і памежнікаў. Тыя накіравалі падпольшчыка да начальніка контрразведкі. Той, выслухаўшы, клікнуў байцоў, узброеных ламамі і лапатамі. Яны спусціліся ў падвал, зламалі станок, нешта прыхапілі з сабой, расцерушыўшы падшыўкі колішніх выданняў. На развітанне палітрук іранічна спытаў: "І навошта ты гэтай дуратой займаўся?" Было горка да слёз — за страх, за пакуты, што пераносіў доўгімі гадамі.

Аднак, як аказалася, Іван Раманавіч яшчэ не спыніў сваёй барацьбы. Хутка пачалася Вялікая Айчынная вайна, і Валошка стаў сувязным партызанскага атрада імя Міхаіла Фрунзе. Вось калі зноў мог спатрэбіцца друкаваны станок, разбіты салдатамі... Пасля вайны былы партызан і падпольшчык працаваў у дзяржбанку ў Брэсце, памёр 3 лютага 1966 года. А пра яго барацьбу і цяпер нагадвае тая шыльда, уладкаваная на рагу вуліцы 17 Верасня і праспекта Машэрава. Вось якія гісторыі часам захоўваюцца за лаканічнымі надпісамі, пакінутымі на дамах.

Анатоль БЕНЗЯРУК

У госці да Максіма Танка

Ну што ж, кажы,
што ў вас чуваць? —
Пачаў стары пра сенажаць,
Успомніў жыта і авёс...
А вочы ... мокрыя ад слёз...

(М. Танк, "На этапах", 1936)

Нашмат чаго ў гэтым свеце сімвалічна...

Я — звычайны абывацель і думаю адпаведным чынам: як казалі ў школе, як у кніжках пісалі... Для шараговага беларуса Максім Танк — хрэстаматыйны помнік. Да прыкладу, нават узнёсла-сардэчныя "Завушніцы" ніяк не маглі асацыіравацца ў маёй юначай свядомасці з акадэмічным вобразам Танка.

...У часе гэтай паездкі я адкрываў для сябе новыя грані Максіма Танка як з'явы, а болей — як чалавека.

Так і ўспрымайце мае нататкі: чалавек глядзіць, слухае, думае...

* * *

Дарогаю

7 жніўня 1995 года пайшоў з жыцця народны паэт Беларусі Максім Танк. На месцы апошняга спачыну Паэта 7 жніўня 2008 года мелася быць мерапрыемства, прысвечанае яго памяці.

...Такім чынам, на аўтамабілі Аркадзя Жураўлёва на зямлю мядзельскую адпраўляўся маладзечанскі "дэсант": сам гаспадар аўто, вядомы ў краіне краязнаўца, літаратуразнаўца і гісторык Міхась Казлоўскі ды я. І паплылі мясціны, думкі, уражанні...

Сваткі — аграгарадок. У старых Сватках ёсць вуліца Максіма Танка, школа носіць імя паэта. Праехалі ***Даўжані.*** Адсюль выбранніца Аркадзя Жураўлёва, тут жыве яго цешча. ***Новікі.*** У 1943 годзе немцы зрабілі "зачыстку" і спалілі вёску, а раней называлася Слабада. Тут — радзіма жонкі Танка Любові Андрэеўны Асаевіч.

Указальнік: Пількаўшчына — 6 (асфальт палажылі дзякуючы Максіму Танку).

Пількаўшчына (раней называлася Жукаўка). Кідаюцца ў вочы зарослыя рэшткі муроў. Зваленая шыльда напрыканцы вёскі — як сімвал.

Далей — лясная дарога да хутара, дзе знаходзіцца бацькоўскі дом Скуркаў. *Няма нават указальніка.* Адзін з нас усклікнуў: "Каб не ведаў, не дабраўся бы".

Праязджаем куртатае калгаснае поле. Раней тут жыла сям'я Скурко і яшчэ адзін гаспадар. У Скуркаў было 14 ратоў.

Брат Максіма Танка Фёдар ці "чыста па-беларуску" — Хведар (1925 года нараджэння) жыве з жонкай; яна ходзіць за 2 км да аўталаўкі. "А зімой дарогу не прачысцяць".

Паважна стаіць дуб. Фёдар Іванавіч гаворыць, што пасадзіў яго яшчэ бацька ў 1922 годзе, як сям'я вярнулася з Масквы. Па словах Фёдара, бацькоўская хата прастаяла 150 год. Дрэва — елка.

У 30-я гады садзілі Федзя з Іосіфам арэшыны і ліпы, што растуць цяпер абапал дарогі да лесу.

А во і чашчэвік сядзіць. Хведар кажа, што й баравікі тут бываюць. Дзед трохі паскардзіўся на вынікі савецкай хімізацыі — няма наўкола птушак: "Каб варону ўбачыў — шапку б зняў".

...Васількі пры дарозе — сімвал: васількі на кашулі Максіма Танка па здымках у зборніках "Журавінавы цвет" і "Пад мачтай". І імя для псеўданіма Яўген Скурко ўзяў ад "васільковага" Багдановіча.

...Далей нас чакала сучаснае "тэатралізаванае" прадстаўленне: адзін за адным з лесу выплывалі "збожжавыя караблі". Сам я пражыў на гэтым свеце болей як сорак год, але — шчыра — такога не бачыў, каб поле гектары са тры (ды яшчэ з усіх бакоў зашчэмленае лесам) прынараўлялася ўбіраць ажно сем (!) камбайнаў. А наўздагон за імі ўжо мчаўся аграном на "бобіку"...

Ля Максіма Танка (на могілках)

Няма ў нас музея Максіма Танка. Жывуць пакуль у доме брат з жонкай, то яны, як могуць, пастарэчы захоўваюць памяць пра Паэта. Так бы мовіць — сямейны музей. А што далей?

Пад'ехалі да ***Слабодскага пагоста.***

...Любоў Андрэеўна ў канцы жыцця была вельмі хворая, амаль нерухомая. Не стала яе, калі пахаваў дачку Веру... Максім Танк і сам як бы стаў збірацца. Гаварыў, каб пахавалі яго на родных вясковых могілках, побач з бацькамі, прасіў, каб на апошнім развітанні не было нічога лішняга, паказнога, нават музыкі...

Два простыя чорныя крыжы: яго і жонкі...

"Максім Танк 1912 — 1995
Любоў Скурко 1912 — 1995".

Два крыжы, два чалавечыя лёсы, што зліліся ў адно цэлае...

Далей пахаваны Домна Іванаўна і Іван Фёдаравіч Скурко — бацькі Максіма Танка, Фадзей Фёдаравіч Скурко, воддаль — іншыя родзічы.

Пачалася імпрэза. Нібы эпіграфам пры яе адкрыцці прагучалі словы дырэктара бібліятэкі імя Максіма Танка з Мядзела Людмілы Несцяровіч: "У жніўні 1995 года Максім Танк сабраў землякоў з суседніх вёсак...". Па чарзе выходзілі выступоўцы, кожны ўнёс нешта сваё ў сказ пра вялікага творцу і чалавека.

...У заключным слове Несцяровіч прывяла словы Рыгора Шырмы: "Заззяе паэзія Максіма Танка ў сузор'і Купалы і Коласа".

Далей рушыў хто куды. Мы накіраваліся да магілы педагога Міколы Арсеньевіча Пашкевіча (1936 — 1972). Надпіс на помніку: "Светлы след будзе вечна жывы" (могілкі в. Гарадзішча). Пабылі і каля яго дома. Пэўна, мала што скажа гэта прозвішча чытачу шараговаму. А настаўнік Пашкевіч быў незвычайны, да самазабыцця заняты настаўніцкай працай. У рабоце школьнага літаратурнага гуртка Сваткаўскай школы прымалі ўдзел Янка Брыль, В. Быкаў, У. Караткевіч, І. Навуменка, Максім Танк і шмат іншых літаратараў.

з дарожнага дзённіка

...Любоў Андрэеўна ў канцы жыцця была вельмі хворая, амаль нерухомая. Не стала яе, калі пахаваў дачку Веру... Максім Танк і сам як бы стаў збірацца. Гаварыў, каб пахавалі яго на родных вясковых могілках, побач з бацькамі, прасіў, каб на апошнім развітанні не было нічога лішняга, паказнога, нават музыкі...

Хвароба заўчасна адарвала яго ад гэтага свету.

Адзін з былых філфакаўцаў успамінае, што ў час яго вучобы ў БДУ, на розных курсах факультэта займалася чалавек дванаццаць са школы Пашкевіча!

Памяці М. Пашкевіча прысвечана аповесць В. Быкава "Абеліск", верш А. Лойкі "Каліны", карціна А. Пупко "Памяць"...

Бібліяграфія

Цікавай падаецца адукацыйная эпапея Яўгена Скурко. Чалавек імкнуўся да вучэння але не па сваёй прыхамаці, так і не змог атрымаць сярэднюю адукацыю. Была пачатковая школа ў Маскве (тут у 1916 — 1922 гадах сям'я Скурко жыла ў Маскве бежанцамі), пачатковыя польскія школы (Шкленікава (Шкальнікова) і Сваткі), Вілейская руская прыватная гімназія (1927—1928 гады, гімназію зачынілі польскія ўлады), Радашковіцкая беларуская гімназія (1929 год, быў выключаны за ўдзел у забастоўцы), Віленская беларуская гімназія (з яе 15-гадовы хлопец выйшаў сам, правучыўшыся месяц), Віленская руская гімназія...

У сакавіку 1932 года за ўдзел у падпольнай рабоце будучы паэт трапіў на месяц у віленскую турму Лукішкі — гэта ўжо адукацыя іншага характару.

Між тым, імя чалавека, каторы не меў афіцыйнай сярэдняй адукацыі, заслужана носіць "самая педагічная" ўстанова краіны — Беларускі дзяржаўны педагагічны універсітэт.

З надзеяй прадоўжыць вучобу і шукаючы ратунку ад "апекі" дэфензівы, Я. Скурко восенню 1932 года тайна перайшоў польска-савецкую граніцу і дабраўся да Мінска. Задуманае не атрымалася: праверылі адпаведныя органы і завярнулі назад.

Вельмі імкліва і ярка адбывалася паэтычнае ўзыходжанне ўжо не Яўгена Скурко, а Максіма Танка: друкавацца пачаў у 1932 годзе, а ў 1936-м у Вільні выдаецца першы зборнік "На этапах" з прадмовай Рыгора Шырмы. Выданне адбылося пры матэрыяльнай падтрымцы КПЗБ і настаўніка Васіля Труцька (у час імперыялістычнай вайны быў атручаны газамі і змог дабіцца кампенсацыі). А затым былі: "Журавінавы цвет" (1937), "Пад мачтай" (1938), паэма "Нарач" (1937). Зборнік выбраных вершаў Максіма Танка "Стихотворения" быў выдадзены ў Маскве ўжо ў 1940 годзе!

На сустрэчы з Танкам збіралася эліта Варшавы і Вільні, генерал Жылігоўскі прыходзіў паглядзець і паслухаць гэты "цуд". Творы паэта да 1939 года перакладаліся на польскую, літоўскую, яўрэйскую мовы, а на ўкраінскую — дык, можна сказаць, масава. Аб папулярнасці Танка гаворыць такі факт: пасля вечара-сустрэчы з маладым паэтам у зале Снядэцкіх у Вільні студэнты насілі яго на руках! Такі гонар меў яшчэ толькі Забэйда-Суміцкі...

Сярод шматлікіх пасад, узнагарод, званняў Максіма Танка адзначым ключавыя.

Дэпутат ВС СССР (1969—1989). Старшыня ВС БССР (1963—1971), дэпутат ВС БССР (1947—1971). Галоўны рэдактар часопіса "Полымя" (1948—1967), народны паэт Беларусі (1968), акадэмік АН Беларусі (1972), старшыня праўлення Саюза пісьменнікаў БССР (1967—1990), сакратар праўлення Саюза пісьменнікаў СССР (1966—1986). лаўрэат Ленінскай прэміі (1978) за зборнік "Нарочанские сосны" (Масква, 1977). Герой Сацыялістычнай Працы (1974); узнагароджаны чатырма ордэнамі Леніна, іншымі ўзнагародамі.

Але вернемся да пачатку:

Стары, я знаю, верыць мне
І сам гаворыць аб вясне,
Здаецца, падужэў, падрос,
Хоць вочы мокрыя ад слёз...

P.S. Дык што, такія адносіны ў Беларусі да аднаго з самых слынных яе сыноў? Сабраліся купкай, сказалі словы — і ўсё. Ці назва педуніверсітэта ў Мінску здымае ўсе пытанні. УСЁ?

Сяргей ЦІМОШКА,
выкладчык Маладзечанскага політэхнічнага каледжа

Аркадзь Марціновіч

Апошнім часам мы часцей засмучаемся, чым радуемся. Беларуская літаратура паступова страчвае старэйшых творцаў, адметных сваім неардынарным талентам, душэўнай яснасцю і цеплынёй чалавечых адносін.

Якраз 9 мая, у дзень Перамогі, на 90-м годзе пайшоў з жыцця яшчэ адзін яе салдат, узнагароджаны ордэнамі Айчыннай вайны I ступені і Чырвонай Зоркі, вядомы пісьменнік Аркадзь Марціновіч.

Нарадзіўся Аркадзь Нічыпаравіч 10 сакавіка 1920 года ў вёсцы Барбарова Глускага раёна Магілёўскай вобласці ў сялянскай сям'і. У 1939 годзе ён скончыў Мінскае педагагічнае вучылішча. Працаваў настаўнікам у школах на Міншчыне. З 1939 да 1946 года служыў у Савецкай арміі. Удзельнічаў у савецка-фінляндскай і ў Вялікай Айчыннай войнах. Быў тройчы паранены. Пасля вайны працаваў літсупрацоўнікам у газеце "Савецкі селянін". У 1950 годзе скончыў Рэспубліканскую партыйную школу пры ЦК КПБ, а ў 1955 — філалагічны факультэт Беларускага дзяржаўнага універсітэта. Працаваў у рэдакцыях газет "Калгасная праўда", "Літаратура і мастацтва", у выдавецтве "Беларусь". На пачатку сямідзесятых быў адказным сакратаром Камітэта па Дзяржаўных прэміях БССР у галіне літаратуры і мастацтва. Кансультаваў маладых аўтараў пры СП БССР, а ў 1974—1981 гадах быў галоўным рэдактарам выдавецтва "Мастацкая літаратура".

Як бачым, паслужны спіс уражвае. Нездарма ў 1980 годзе яму надалі званне заслужанага работніка культуры БССР.

Што тычыцца літаратурнай творчасці, то пісаць Аркадзь Нічыпаравіч пачаў рана і ўжо з васемнаццаці гадоў выступаў у рэспубліканскім друку. Ім напісаны і выдадзены кнігі мастацкай прозы, сярод якіх "Надзея" (1960), "Водгулле" (1963), "Прасека" (1967), "Панарама" (1970), "Няхай ідзе дождж" (1973), "Сцюжа" (1976), "Не шукай слядоў сваіх" (1979), "Груша на голым полі" (1986). Апроч таго выдаў зборнік вершаў "Чырвоныя ветразі" (1965) і аповесць для дзяцей "Неадкрыты востраў" (1966). Выйшла "Выбранае" пісьменніка ў 1974 годзе, а ў 1980 — Збор твораў у 2-х тамах.

Актыўна займаўся Аркадзь Нічыпаравіч і перакладамі.

Адным словам, чалавекам пражыта вялікае і, калі хочаце, дастаткова доўгае, насычанае творчай і грамадскай працай, жыццё. Яго ведалі і паважалі сябры і калегі па літаратурным цэху, цягнуліся за вопытам маладыя...

На вялікі жаль, чалавечае жыццё не вечнае. Усяму і кожнаму адмераны свой час. І важна тое, што пакідаецца нашчадкам пасля нашага фізічнага сыходу, — не прах, а дух... Гэта і абнадзейвае.

Сябры, калегі, беларускія літаратары

Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова "Літаратура і Мастацтва" выказвае глыбокае спачуванне старшыні Цэнтральнага камітэта Беларускага прафсаюза работнікаў культуры Шаўцову Мікалаю Міхайлавічу з прычыны напаткаўшага яго вялікага гора — смерці СЯСТРЫ.

Андрэй ФЕДАРЭНКА. *Нарадзіўся ў 1964 годзе ў вёсцы Бярозаўка Мазырскага раёна на Гомельшчыне. Пасля васьмігодкі скончыў Мазырскі палітэхнікум (1983), пэўны час працаваў мулярам і бетоншчыкам у Мікашэвічах. Пасля службы ў СА (1984-85) працаваў бібліятэкарам. Скончыў бібліятэчны факультэт Мінскага інстытута культуры (1990). Працаваў карэктарам у тыднёвіку "7 дней", рэдактарам аддзела навукі і мастацтва ў часопісе "Полымя", пасля загадчыкам аддзела прозы часопіса "Маладосць", у сцэнарным аддзеле на кінастудыі "Беларусьфільм". Цяпер — зноў рэдактар аддзела прозы часопіса "Маладосць".*

Пісаць пачаў рана. Першыя публікацыі ў рэспубліканскім друку з'явіліся ў 1987 годзе. Друкаваўся ў часопісах "Беларусь", "Крыніца", "Маладосць", "Бярозка", "Вожык", у калектыўных зборніках "Жнівеньскі праспект" і "Перад маімі вачыма". Выдаў кнігі: "Гісторыя хваробы" (1990), "Смута" (1994), "Шчарбаты талер" (1999). "Афганская шкатулка" (2002), "Нічые" (выбранае ў серыі "Беларуская проза XXI стагоддзя", (2009).

Сёлета часопіс "Полымя" (№ 4) надрукаваў першую частку рамана-эсэ А. Федарэнкі **"МЯЖА"**.

"Хто сказаў, што прозу трэба выдумваць? Я раскажу ўсё як ёсць і раскажу проста: як думаю."

Пераказ з Чэзарэ ДЗАВАЦІНІ

Шчыра кажучы, сёння ў нашай літаратуры вельмі рэдка з'яўляюцца творы, якія абавязкова хацелася б пачытаць, прапусціць якія было б вялікай памылкай для крытыка. Гэта творы, якія схіляюць чытача да сумеснага разважання над сутнасцю жыцця разам з аўтарам. Тыя, у якіх аўтар як бы ўжо не давярае свайму не тое што таленту, а, скажам, прафесійнаму майстэрству. Увогуле ён пачынае сумнявацца ў гэтым сваім таленце і хоча дайсці да разумення яго (а гэта і ёсць пазнака ТАЛЕНТУ). Таму ад пачатку ставіць сябе на адну дошку з чытачом, каб дазнацца, чаму ён — пісьменнік, а не трактарыст ці інжынер? Чаму ён такі, а не гэтакі? Што гэта — лёс ці валявы мэтаскіраваны шлях? У сусветнай літаратуры нямала прыкладаў такога самааналізу. Ды і ў нашай сустракаюцца. Скажам, у М. Стральцова і А. Асташонка (дарэчы, гэта ў ягонай кніжцы я знайшоў эпіграф да "Кулураў").

Мажліва і памыляюся, а ўсё ж наважуся сказаць, што раман-эсэ А. Федарэнкі "Мяжа" сваім прыхаваным унутраным псіхалагізмам ускосна нагадвае мне "Смаленне вепрука" ўпомненага М. Стральцова. Вядома, апавяданне знанага майстра больш кампактнае, сціснутае ў часе і пасылах, канкрэтнае ў вызначэнні сутнасці зямнога жыцця ў цэлым... Але аснова — тое, што змусіла пісьменнікаў схіліцца над аркушам паперы, — безумоўна, адна і тая ж — найперш паспрабаваць вызначыцца ў разуменні саміх сябе, выйсці за край магчымага... Памятаеце яго канцоўку: *"Такою парою пішу я эпітафію апавяданню, якое магло б называцца "Смаленне вепрука". О, вядома, не шмат логікі ў ім, але ж не шмат логікі і ў стратах, што прыносяць нам лета ці вясна, зіма ці восень. Ёсць, на жаль, рэчы непадуладныя нам, але ж ёсць і суцяшэнне, ёсць і надзея. У таго, хто бярэ ў рукі пяро, надзея ёсць таксама. О, паэт да таго ж бывае яшчэ крыху забабонным. Наіўны, ён хоча перамагчы сапраўднасць, ён хоча верыць: я засцярогся ад бяды — бо сказаў. Дабро і надзея накрэслілі тут свой круг".*

Прайшло трыццаць пяць гадоў пасля напісання гэтага апавядання і сучасны аўтар "накрэслівае свой круг", спрабуючы прабіцца да ісціны іншым шляхам, але ў тым жа кірунку: *"Тады — далей. Прыблізна гэтак, як ёсць, форма збольшага акрэсліваецца. Уступ, падрыхтоўка, кавалачак мастацкага, абагульненне, вынік... І ўсё гэта перасыпана разважаннямі сябе цяперашняга, адступленнямі, тлумачэннямі... Галоўнае — шырэй, глыбей, свабодней! Вольнаму воля, ураваным рай."*

Чытаючы першую частку рамана-эсэ А. Федарэнкі, не мог пазбавіцца адчування, што і сам пастаянна жыву *"рэвізіянісцкімі"* планамі ў дачыненні да ўласнай творчасці. Як, што, навошта і для каго? Трэба прызнаць, што і сама гэтая тэма — пісьменнік і творчасць, іх месца і запатрабаванасць у сучасным грамадстве — заўсёды была актуальная, а сёння, бадай, больш, чым калі... Але чамусьці рэдка хто з беларускіх літаратараў спрабуе падымаць яе ў сваіх творах, а калі і падымае, то ў даволі "вузка-спецыфічных" ракурсах.

А. Федарэнка метадам глыбокага аналізу ўласнай натуры спрабуе разабрацца ў тым, хто і што ён ёсць у літаратуры... Ці варты ён свайго наканавання?.. І ці не ўпершыню, тут ён адкрыта самакрытычны, тым больш, што менавіта яго найчасцей папракалі ў творчым эгаізме і славалюбстве, і я ў тым ліку... Безумоўна, мае месца і літаратурны падрахунак, бо кожны сапраўдны творца беспамылкова ўлаўлівае свой час "ікс"... Унутранае адчуваненне падказвае мне, што мажліва і з прычыны кволай крытычнай зацікаўленасці яго творчасцю ў апошні час і незадаволенасцю вынікамі той зацікаўленасці, аўтар сам спрабуе падвесці падрахункі напрацаванаму мастацкаму плёну, без пасрэднікаў... Але — якім чынам? Што ж, і гэтага пісьменнік не хавае ад свайго патэнцыяльнага чытача, галоўнае, як ён іранічна зазначае на пачатку, каб была *"хвабула"* (па выразе А. Сыса). А ён то ўжо ведаў у гэтым толк, можа, таму ў апошнія гады і пісаў рэдка — "не было хвабулы". І ўласна кажучы, ніхто яе пісьменніку даць не можа, трэба каб кожны яе нажыў сам...

Тым больш, што для таго, каб напісаць раман у аўтара рамана *"матэрыялу мора, нават "эпілёг" праглядваецца... (...) аповесці, раманы, абрыўкі апавяданняў, п'есы, сцэнарыі, проста думкі..."*, і ўсё гэта можна *"...падаваць кароткімі кавалкамі — галоўнае, каб чытач ухапіў гэты кавалак вокам, затрымаўся на ім..."*, а яшчэ шмат таго, што *"пісалася гадоў 15 назад, прадвесніцай "Сечкі""*, таму *"увесь час, з настойлівасцю, нават настырнасцю будзем звяртацца да:*

— Якая мэта нашага рамана?

Яна пакуль такая: чалавек можа хоць крышку ўплываць на свой лёс, карэкціраваць, рэдагаваць яго? Ён можа, нават не маючы моцнага здароўя, пры пэўным раскладзе, пры пэўных адносінах да сябе хоць трохі падоўжыць свой век?", але ж вось закавыка, *"як гэтыя фрагменты скласці ў адно цэлае, каб атрымалася карціна, як знайсці кожнай фрэсцы, кожнаму фрагменту сваё месца?Як удыхнуць у гэты кавалак гліны жыццё?"*

Насамрэч боскае пытанне, удыхнутае разам з талентам.

А. Федарэнка, мабыць, першы з сучасных беларускіх пісьменнікаў, хто не пабаяўся ў сваім *"дзіўнаватым рамане-выбраным, рамане-біяграфіі, рамане-эсэ"* вынесці на публіку сваю літаратурную кухню...

Сам тэкст рамана-эсэ, скроены з "абрэзкаў", не мае заўважных швоў за выняткам некаторых месцаў, што вытыркаюцца з "фасону" (да іх я ў першую чаргу аднёс бы такія абразкі, як "Тупы" і "Камандзір морга")... Хоць аўтар абачліва паўстае на іх абарону: *"Ну што? Даволі міленькія, сімпатычныя фрэскі. Мазаіка, асколкі... Нават нібыта не схаластычныя, а сістэмныя — адлежаныя ў часе, працэджаныя памяццю... Маючыя права на існаванне. (...) Не можа быць, каб рана ці позна колькасць не пачала перарастаць у якасць."*

Гэты раман-эсэ ёсць своеасаблівай рэцэнзіяй аўтара на ўласнае жыццё, прынамсі, спробай пераўсведамлення яго як бы з воддалі часу пры апасродкаваным стаўленні да яго... Сустракаюцца, на першы погляд, як бы наіўныя тэксты, шараговыя ўспаміны 70 — 80-х гадоў мінулага стагоддзя і некалі выдрукаваныя ў перыёдыцы аповеды... Аднак за імі, пры роздуме, выкрасаецца парадаксальны філасофскі погляд на людскі свет і аўтарскае жыццё ў прыватнасці... Нельга сказаць, што гэта новы погляд, але гэта погляд цнатлівы, несапсаваны грамадскімі дачыненнямі. З якога "хлуду і смецця" вырастае літаратура і сам яе стваральнік, аўтар паказвае на паўсядзённых непрыкметных на першы погляд дэталях уласнай біяграфіі. Асабліва ўражваюць сваёй вобразнасцю і метафорыкай успаміны з маленства. Як вось гэты штрых: *"Увечары, калі не было чаго рабіць, я залазіў на калідор, на цёплы шыфер, і пачынаў сумаваць, святлей за той падлеткавы сум у мяне пасля ў жыцці нічога не было..."* Альбо: *"Каля карчоў можна было напарвацца на ўмерзлых у лёд уюноў. Я лягаў тады на гэты лёд і ўглядаўся, якія ва ўюна вусікі, плаўнікі, сагнуты кручком хвост і калючая палачка каля рота. Я бег дадому па сякеру, асцярожна цюкаючы, высякаў іх усіх да аднаго, і ў цёплых далонях яны адыходзілі і пачыналі слаба варушыцца..."*

Як піша цяпер ужо вядомы пісьменнік А. Федарэнка, падобнае праламленне ўчарашняга праз сённяшняе і *"ёсць вышняя ўзнагарода літаратару-аўтару — калі тое, што так часта праклінаў: ну чаму, чаму не так, як усе?! — пачынае адкрывацца ў іншым святле."*

Ад малога дзіцяці, захопленага ранішнім срэбраным дзівам роснай павуты, да прыкладнага школьніка і вечна галоднага і пакрыўджанага студэнта тэхнікума, які ўпэўнены ў "няспісанасці" і ўласным аўтарстве свайго сачынення, — вядзе пісьменнік чытача "да сябе". Паказваючы пры гэтым, як людзі і грамадскі лад змушаюць канкрэтнага "маленькага чалавека" страчваць сваю душэўную чысціню і годнасць (губляць іх і здраджваць ім), і як чалавек здольны іншым разам усё-ткі адстойваць іх (падаючы, падымацца)...

Як на мой погляд, у пакуль нясканчаным рамане-эсэ зашмат русізмаў, наўмыснай трасянкі і лаянкі... Асабліва рэжа вуха, калі аўтар зазначае, што доктар сказала не *"лёс*, як ён піша, а *"судьба"*, тым самым акцэнтуючы ўвагу на зрусіфікаванасці беларусаў. Але ж поруч і сам піша "павестка" замест "позва" і цытуе рознае рускамоўе з "закропленымі" мацюкамі... Месцамі філалагічная стылістыка твора ўвогуле зводзіцца да нязмушанага *вуснамоўнага* стылю, што "каробіць" падкорку *беларускамоўнай* свядомасці. Магчыма, аўтар хацеў паказаць, як у натуральных умовах на антынацыянальнай глебе (да таго ж і першы лёсавызначальны настаўнік роднай мовы і літаратуры ў яго быў чалавек няшчасны і трасяначны) усё-ткі *завязваецца* і вырастае беларускамоўны пісьменнік. Творца. Насуперак усяму і ўсім.

У некаторых раздзелах ("Сачыненне", "Рэцэнзія-водгук") аўтар спрабуе ўвесці ўнутраную канцэпцыю кропкавай крытыкі, своеасаблівы аналіз уласных твораў ад адваротнага, даючы магчымасць параўнання з тым, што калісьці пісалася пра гэты твор, як у фрагменце з цытацыяй колішняга агляду прозы А. Сідарэвічам альбо, прыкладам, вуснага выказвання Я. Лецкі ў "Іслачы": *"Я думаў, гэта дарослы мужчына, за 50... Вось такія і губяць нашу літаратуру. Яму 23, а піша так, нібыта 83"*... У А. Федарэнкі атрымаўся сам па сабе цікавы ход, але згасаючы без развіцця, хоць ён і спрабаваў намацваць нейкія падводкі да пэўных высноў, маўляў, *"на сваім "рэдактарскім пасту" часта даводзіцца задаваць аўтарам пытанне: дзеля чаго, нашто гэта пішацца? І часта чуць у адказ: не ведаю і ведаць не хачу, на тое ёсць крытыка; пачытаю сам і сам даведаюся, што я хацеў сказаць."*

А. Федарэнка — аўтар масціты, жывы класік, без нацяжак кажучы, на яго літаратурным рахунку шмат выдатнай малой прозы і выбітных знакавых для нашай сучаснай літаратуры аб'ёмных твораў, як "Нічые" і "Рэвізія". Ён мае права на гэты *комплекс* — "пераўлік і пераацэнку" ўласных мастацкіх набыткаў. Бо ён пісьменнік чытэльны і запатрабаваны тым грамадскім атачэннем нацыянальных інтэлігентаў, якое яшчэ пакуль не зжыло сябе дарэшты ў гэтай дзяржаве. І ўсё ж, як піша аўтар, у чалавека, упэўненага ва ўласнай творчай значнасці і асабовасці *"настае момант (...) калі літаратура пачынае не толькі браць, а і аддаваць. Па чым гэта пазнаецца? Па рэакцыі людзей. Настае момант, калі спыняецца бег, які заключаўся ў пашырэнні, накапленні і павелічэнні матэрыяльнага: кватэра на большую, дача на бліжнюю, машына на даражэйшую... І вось раптам заўважаецца жоўты кляновы ліст пад нагамі..."*

Што я магу сказаць на гэта? Мне хочацца дачакацца другой часткі рамана і пабачыць героя-аўтара ў нашым цяперашнім часе — наколькі ён спраўдзіўся ва ўласных вачах як чалавек і пісьменнік?

Каб больш не задавацца адным і тым жа пытаннем: *"Што атрымалася ў нашым паўмастацкім творы?"*. А галоўнае, каб пасля гэтых маіх няпэўных адказаў, у аўтара не з'явілася яшчэ адна прычына *"абмацваць"* мяне *"з галавы да ног насмешлівым, нячыстым позіркам"*...

Зрэшты, а што зробіш? Крытык таксама чалавек маленькі.

ЛеГАЛ

Выходзіць з 1932 года
У 1982 годзе газета ўзнагароджана ордэнам Дружбы народаў

ЗАСНАВАЛЬНІКІ:
Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь

ГА "Саюз пісьменнікаў Беларусі"

РВУ "Літаратура і Мастацтва"

ГАЛОЎНЫ РЭДАКТАР
Анатоль КАЗЛОЎ

Рэдакцыйная калегія:

Анатоль Акушэвіч
Лілія Ананіч
Алесь Бадак
Дзяніс Барсукоў
Святлана Берасцень
Віктар Гардзей
Уладзімір Гніламёдаў
Вольга Дадзіёмава
Уладзімір Дуктаў
Анатоль Жук
Вольга Казлова
Анатоль Казлоў
Алесь Карлюкевіч
Анатоль Крэйдзіч
Віктар Кураш
Алесь Марціновіч
Мікола Станкевіч
Юрый Цвяткоў
Мікалай Чаргінец
Іван Чарота
Іван Штэйнер

Адрас рэдакцыі:
220034, Мінск,
вул. Захарава, 19

Тэлефоны:
галоўны рэдактар,
намеснік — 284-66-73

Аддзелы:
публіцыстыкі — 284-66-71
пісьмаў і грамадскай думкі — 284-95-62
крытыкі і бібліяграфіі — 284-44-04
прозы і паэзіі — 284-44-04
мастацтва — 284-82-04
бухгалтэрыя — 284-66-72
Тэл./факс — 284-66-73

E-mail: lim_new@mail.ru

Адрас у Інтэрнэце:
www.lim.by

Пры перадруку просьба спасылацца на "ЛіМ".
Рукапісы рэдакцыя не вяртае і не рэцэнзуе.
Аўтары допісаў у рэдакцыю паведамляюць сваё прозвішча, поўнасцю імя і імя па бацьку, пашпартныя звесткі, асноўнае месца працы, зваротны адрас.
Пазіцыя рэдакцыі можа не супадаць з меркаваннямі і думкамі аўтараў публікацый.
Набор і вёрстка камп'ютэрнага цэнтра РВУ "Літаратура і Мастацтва".

Выходзіць раз на тыдзень па пятніцах.

Выдавец:
Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова "Літаратура і Мастацтва".

Друкарня Рэспубліканскага унітарнага прадпрыемства "Выдавецтва "Беларускі Дом друку"
г. Мінск,
пр. Незалежнасці, 79.

Індэкс 63856
Наклад 3351
Умоўна друк. арк. 3,72
Нумар падпісаны ў друк 20.05.2009 у 11.00

Рэгістрацыйнае пасведчанне № 715
Заказ — 2612

Д 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

ISSN 0024-4686